WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

9 ЛІСТАПАДА 2011 г.
СЕРАДА
№ 213
(27077)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА РАЗГЛЕДЗЕЎ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь 8 лістапада разгледзеў кадравыя пытанні.

КІРАЎНІК ДЗЯРЖАВЫ НАЗНАЧЫЎ:

КАБЯКОВА Андрэя Уладзіміравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі, пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Еўразійскім эканамічным супольніцтве па сумяшчальніцтве;

ЛАПАТА-ЗАГОРСКАГА Уладзіміра Мікалаевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Інданезія;

МОЛЧАНА Андрэя Леанідавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы;

РАХМАНАВА Сяргея Кімавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Японіі;

СЯМЕШКУ Аляксандра Віктаравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Каралеўстве Бахрэйн па сумяшчальніцтве.

ПРЭЗІДЭНТ ТАКСАМА ДАЎ ЗГОДУ НА НАЗНАЧЭННЕ:

НЯВЫГЛАСА Генадзя Мікалаевіча — намеснікам генеральнага сакратара Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы;

ШАГУНА Анатоля Васільевіча — намеснікам міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі;

УЦЮПІНА Паўла Уладзіміравіча — намеснікам міністра прамысловасці;

ЕРМАЛОВІЧА Максіма Леанідавіча — намеснікам міністра фінансаў;

КУРАННОГА Уладзіміра Пятровіча — старшынёй Шумілінскага райвыканкама;

ПАНФІЛАВА Юрыя Анатольевіча — кіраўніком адміністрацыі Чыгуначнага раёна г. Віцебска;

ДЫМШЫ Юрыя Аляксеевіча — старшынёй Глускага райвыканкама;

БУРСКАГА Вячаслава Аляксандравіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскі механічны завод імя С.І. Вавілава» — кіруючая кампанія холдынга «БелОМА»;

КАПСКАГА Анатоля Анатольевіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Барысаўскі завод аўтатрактарнага электраабсталявання» — кіруючая кампанія холдынга «Аўтакампаненты».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

АЛЯКСАНДР КАРЛЮКЕВІЧ НАЗНАЧАНЫ ГАЛОЎНЫМ РЭДАКТАРАМ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

Фота БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка даў згоду на назначэнне Аляксандра Карлюкевіча галоўным рэдактарам установы «Рэдакцыя газеты «Звязда».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ПРЫ ФАРМІРАВАННІ СЛЕДЧАГА КАМІТЭТА БЕЛАРУСІ ТРЭБА БУДЗЕ ЎНЕСЦІ ЗМЯНЕННІ ПРЫКЛАДНА Ў 30 ЗАКОНАЎ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 8 лістапада правёў рабочую сустрэчу з Дзяржаўным сакратаром Савета Бяспекі Леанідам Мальцавым і Старшынёй Следчага камітэта Беларусі Валерыем Вакульчыкам, якія далажылі аб ходзе стварэння Следчага камітэта.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, пытанні фарміравання Следчага камітэта знаходзяцца на асаблівым кантролі. «Мы вызначыліся з напрамкамі фарміравання Следчага камітэта, дамовіліся аб самым галоўным, што ісці трэба ад жыцця, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Галоўнае, каб гэта была кампактная структура і прыярытэт у ёй быў аддадзены, перш за ўсё, галоўнаму звяну — следчым. Усе, хто бегае там вакол, дапамагае, яны патрэбны, але ў вельмі невялікай колькасці. Адсюль і грашовае забеспячэнне, і заработная плата, і гэтак далей. Мы аб гэтым з вамі дамовіліся. Вы гэта як ніхто разумееце».

Прэзідэнт таксама адзначыў, што ні ў якім разе нельга зацягваць прыняцце рашэнняў ні па адным з напрамкаў фарміравання Следчага камітэта, пачынаючы ад месца яго размяшчэння, завяршаючы пытаннямі структуры.

«Следчы камітэт — гэта дзіця МУС, КДБ, пракуратуры і Камітэта дзяржаўнага кантролю. Гэта яны павінны, перш за ўсё, кроўна быць зацікаўленымі ў стварэнні працаздольнага эфектыўнага Следчага камітэта. Не процідзейнічаць, не расстройвацца аб тым, што забралі ў іх, ці бачыце, следства», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы, што Леанід Мальцаў і Валерый Вакульчык павінны ў сваю чаргу скаардынаваць гэту работу для рэалізацыі намечанай мэты.

«Як ідзе работа па стварэнні Следчага камітэта, якія ў вас прынцыповыя рашэнні ўзнікаюць у сувязі з гэтым, якія, можа быць, з'яўляюцца насцярожанасці?» — з такімі пытаннямі звярнуўся кіраўнік дзяржавы да ўдзельнікаў сустрэчы.

Леанід Мальцаў далажыў Аляксандру Лукашэнку аб асноўных падыходах па фарміраванні новай структуры. У прыватнасці, увазе Прэзідэнта былі прадстаўлены праекты ўказаў, якімі плануецца зацвердзіць Палажэнне аб Следчым камітэце, дысцыплінарны статут, штатную колькасць. Таксама даложана аб неабходных змяненнях у заканадаўства Беларусі ў сувязі са стварэннем Следчага камітэта. Адпаведныя законапраекты паступяць на разгляд парламентарыяў. Усяго трэба будзе ўнесці змяненні прыкладна ў 30 законаў.

У цэлым кіраўнік дзяржавы адобрыў даложаныя яму падыходы па фарміраванні Следчага камітэта. У бліжэйшы час адпаведныя праекты ўказаў будуць прадстаўлены Прэзідэнту для падпісання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

НАСТАССЯ НОВІКАВА — ЧЭМПІЁНКА СВЕТУ!

Трохразовая чэмпіёнка Еўропы і бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў у Пекіне штангістка Настасся Новікава заваявала першы ў сваёй кар'еры тытул чэмпіёнкі свету. Планетарнае першынство праходзіць у Парыжы.

Настасся спаборнічала ў катэгорыі да 58 кг. У рыўку яна падняла 101 кг і саступіла кітаянцы Лі Сеінь (103 кг). А вось у штуршку беларусцы не было роўных, абышла яна і кітаянку — 136 супраць 133. У выніку ў суме двухбор'я Новікава набрала 237 кг, а Лі Сеінь — 236.

У жаночых спаборніцтвах на памост таксама выйдуць Ганна Бацюшка (да 63 кг), Ірына Кулеша (да 75 кг), Дзіна Сазановец (да 69 кг) і Марына Шкерманкова (да 69 кг). У мужчын Беларусь на планетарным першынстве прадстаўляюць Андрэй Рыбакоў (да 85 кг), Вадзім Стральцоў (да 94 кг), Аляксандр Макаранка (да 94 кг), Міхаіл Аўдзееў (да 105 кг), Яўген Жарнасек (звыш 105 кг) і Дзмітрый Ворнік (звыш 105 кг).

Алена КРАВЕЦ.



Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў члена нацыянальнай каманды Беларусі па цяжкай атлетыцы Настассю Новікаву з перамогай на чэмпіянаце свету па цяжкай атлетыцы ў Парыжы. Кіраўнік дзяржавы пажадаў спартсменцы новых яркіх перамог.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЎЗНАЧАЛІЦЬ СТВОРАНЫ САВЕТ ПА РАЗВІЦЦІ ІНФАРМАЦЫЙНАГА ГРАМАДСТВА

Савет па развіцці інфармацыйнага грамадства створаны пры Прэзідэнце Беларусі, яго старшынёй будзе кіраўнік дзяржавы. Адпаведны ўказ № 515 «Аб некаторых пытаннях развіцця інфармацыйнага грамадства ў Рэспубліцы Беларусь» Аляксандр Лукашэнка падпісаў 8 лістапада.

У склад савета ўвайшлі прадстаўнікі дзяржаўных органаў, навуковых і адукацыйных устаноў, арганізацый, якія аб'ядноўваюць кампаніі ў сферы ІКТ. Такія органы на чале з вышэйшымі службовымі асобамі ўжо сфарміраваны ў многіх краінах, у тым ліку ў Расійскай Федэрацыі, Германіі, Францыі, Рэспубліцы Карэя.

Як растлумачылі ў прэс-службе, рашэнне аб стварэнні савета прынята з улікам росту ўплыву інфармацыйнай сферы на ўсе бакі жыццядзейнасці грамадства і неабходнасці ўзмацнення ўзаемадзеяння розных зацікаўленых бакоў пры фарміраванні ў краіне інфармацыйнага грамадства.

Прыняцце ўказа накіравана на павышэнне эфектыўнасці дзейнасці дзяржаўных органаў і арганізацый пры ажыццяўленні дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, хутчэйшае стварэнне адзінай сістэмы аказання дзяржаўных паслуг у электроннай форме, удасканаленне рэгулявання ў сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій /ІКТ/.

Указам прадугледжваецца аб'яднанне міжведамасных інфармацыйных сістэм розных дзяржаўных органаў. Эксплуатацыя гэтых сістэм і аказанне на іх базе паслуг арганізацыям і грамадзянам будзе ажыццяўляцца адзіным аператарам — рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам «Нацыянальны цэнтр электронных паслуг». Гэта значна спросціць працэс атрымання паслуг, якія аказваюцца з выкарыстаннем міжведамасных інфармацыйных сістэм, стане адной з практычных мер, накіраваных на дэбюракратызацыю жыцця краіны.

Указам таксама зацверджана Палажэнне аб незалежным рэгулятары ў сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. У ім удакладняюцца функцыі незалежнага рэгулятара, прадугледжаныя ўказам ад 30 верасня 2010 года № 515 «Аб некаторых мерах па развіцці сеткі перадачы даных у Рэспубліцы Беларусь».

У мэтах сумеснага разгляду і вырашэння найбольш важных пытанняў дзейнасці незалежнага рэгулятара з удзелам прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, вядомых вучоных і спецыялістаў у галіне электрасувязі і інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій указам створаны Савет незалежнага рэгулятара і зацверджаны яго склад.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ БЕЛАРУСІ Ў 2012 ГОДЗЕ ПАВІННЫ ПРЫРАСЦІ МІНІМУМ НА $5 МЛРД

ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ рэзервы Беларусі ў 2012 годзе павінны прырасці мінімум на $5 млрд, у асноўным за кошт даходаў ад прыватызацыі. Аб гэтым заявіў учора на пасяджэнні Саўміна прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч, перадае БЕЛТА.

«Мы павінны стварыць аб'ём золатавалютных рэзерваў, эквівалентны трохмесячнаму імпарту», — сказаў кіраўнік урада. Паводле яго слоў, для гэтага ЗВР у 2012 годзе павінны прырасці як мінімум на $5 млрд, у асноўным за кошт даходаў ад прыватызацыі.

СЯРЭДНЯМЕСЯЧНАЯ ІНФЛЯЦЫЯ Ў 2012 ГОДЗЕ — НЕ БОЛЬШ 1,5 ПРАЦЭНТА

Сярэднямесячная інфляцыя ў Беларусі ў 2012 годзе не павінна перавышаць 1,5 працэнта, заявіў Міхаіл Мясніковіч на пасяджэнні Саўміна. Кіраўнік урада падкрэсліў, што галоўнай задачай, пастаўленай на наступны год, з'яўляецца рэзкае зніжэнне тэмпаў інфляцыі ў параўнанні з 2011 годам. «Не пераадолеем інфляцыю — ніякай стабільнасці не будзе, таму ўсе складальнікі інфляцыі абмяжоўваюцца і бяруцца пад строгі кантроль», — сказаў ён. У наступным годзе прырост спажывецкіх цэн не павінен перасягнуць 19 працэнтаў за год, або 1,5 працэнта ў месяц, падкрэсліў прэм'ер-міністр. «Гэта, вядома, высокі ўзровень інфляцыі, але яшчэ большае сцісканне грашовай масы можа прывесці да небяспечных з'яў у эканоміцы».

Паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, у наступным годзе ў Беларусі плануецца рэалізоўваць канцэпцыю збалансаванага развіцця. Размова ідзе аб тым, каб збалансаваць вытворчасць і спажыванне, забяспечыць структурную мадэрнізацыю, стварыць і задзейнічаць неэмісійныя крыніцы фінансавання, каб 2012 і наступныя гады былі перыядам устойлівага эканамічнага развіцця для Беларусі.

СТАР. 2

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

Увага: прамая лінія

«ПРАЦА І САЦЫЯЛЬНАЯ АБАРОНА»

У чацвер, 10 лістапада, з 11.00 да 12.00 міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна правядзе прамую тэлефонную лінію на азначаную тэму.

Свае пытанні і прапановы па ўдасканаленні працоўнага заканадаўства і паляпшэнні эфектыўнасці сацыяльнай абароны любы грамадзянін зможа агучыць Марыяне Акіндзінаўне непасрэдна **па тэлефоне (017) 306 37 95** ці з дапамогай інтэрнэту (падчас правядзення прамой тэлефоннай лініі на сайце міністэрства **www.mintrud.gov.by** у раздзеле «Інтэрактыўныя прэс-канферэнцыі» будзе арганізаваны **online-прыём**).

Інга МІНДАЛЁВА.

СІМВАЛІЧНЫ ШЛЮБ І БЯСКОНЦАЕ КАХАННЕ

Маладыя людзі лічаць, што вяселле 11.11.11 умацуе іх шлюб. У гэты дзень у Магілёве пажэняцца 60 пар.

Шчаслівыя камбінацыі лічбаў у датах — забабоны новага часу . Дата 11 лістапада 2011 года, паводле некаторых меркаванняў, з'яўляецца сімвалічнай і будзе ўдалай для важных падзей і, у прыватнасці, для заключэння шлюбаў. Падобны на цяперашні вясельны ажыятаж назіраўся ў абласным цэнтры і раней: таксама каля 60 шлюбаў заключалі ў абласным цэнтры 07.07.07 і 08.08.08.

Супрацоўнікі Магілёўскага ЗАГСа не стамляюцца даводзіць да ведама жаніхоў і нявест, што дата ўзяцця шлюбу — гэта іх асабістая справа, але шчаслівае сумеснае жыццё залежыць не ад магічных лічбаў, а ад кахання, узаемнай павагі і жадання жыць сям'ёй. Гэтыя высновы пацвярджае і статыстыка разводаў: з 59 пар, якія ўзялі шлюб 7 ліпеня 2007 года, распаліся ўжо 7, а з тых 57-мі, хто аддаў перавагу 8 жніўня 2008 года, — пайшлі кожны сваёй дарогай 4 мужы і жонкі.

Ілона ІВАНОВА.

НАЧАЛЬНІК АДДЗЕЛА МІЛІЦЫІ ВЫРАТАВАЎ САМАГУБЦУ

Увечары прахожыя і жыхары дома № 81 па вуліцы Адоеўскага ў Мінску назіралі наступную карціну: на даху 9-павярховіка сядзеў, звесіўшы ногі, хлопец і крычаў, што зараз скончыць жыццё самагубствам. Прыбыўшыя міліцыянеры, сярод якіх быў і начальнік гарадскога аддзела міліцыі № 3 Фрунзенскага РУУС сталіцы Сяргей Арцёменка, спрабавалі трапіць да самагубцы на дах, аднак хлопец пагражаў адразу скокнуць уніз.

— Малады чалавек працягваў сядзець на даху і піць піва, скінуўшы свой мабільны тэлефон уніз, — расказвае прэс-афіцэр Фрунзенскага РУУС Ала Галубовіч. — Праз нейкі час ён пагадзіўся, што міліцыянер паднімецца да яго на дах. Сяргей Арцёменка пайшоў наверх і размаўляў з хлопцам паўтары гадзіны. Высветлілася, што малады чалавек нядаўна пасварыўся з дзяўчынай, з-за чаго і вырашыў пайсці з жыцця. Міліцыянер патэлефанаваў ёй і расказаў пра тое, што адбываецца на даху. Дзяўчына не паверыла і адключыла тэлефон. Аднак падпалкоўніку міліцыі ўдалося адцягнуць увагу хлопца: за размовай ён крок за крокам набліжаўся да маладога чалавека, пакуль не схапіў яго за руку і не выцягнуў з краю даха. Разам яны спусціліся ўніз, дзе маладога чалавека чакалі маці і дзядуля.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

СМЕРЦЬ ПАД КОЛАМІ

У памежным Хоцімскім раёне аўто, якім кіраваў расіянін, смяротна траўміравала трох веласіпедыстаў.

6 лістапада а 20-й гадзіне ўвечары на аўтадарозе «Хоцімск—Родня» адбылося трагічнае здарэнне. Аўтамабіль «Рэно Колеас», якім кіраваў 35-гадовы жыхар Масквы, наехаў на трох веласіпедыстаў, якія рухаліся ў спадарожным напрамку. Ад атрыманых траўмаў тры чалавекі загінулі — 25-гадовы жыхар Хоцімска, 18-гадовы жыхар райцэнтра Круглае і 17-гадовы магіляўчанін.

Як паведамілі ў ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама, паводле папярэдняй інфармацыі — вадзіцель быў нецвярозы. У яго ўзяты аналізы, якія дадуць дакладныя вынікі. Сам мужчына затрыманы, распачата крымінальная справа.

Алена КАЗЛОВА.

І БЕЗ РЫБЫ, І БЕЗ ХЛОПЦА

засталіся сваякі 21-гадовага жыхара вёскі Навасёлкі Кармянскага раёна. Лодка аматара рыбнай лоўлі перакулілася ў мясцовым возеры, ён зваліўся ў ваду і патануў. Выратаваць мужчыну не змаглі, паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЕЎРА І ДОЛАР ПАТАННЕЛІ

Учора на адзінай сесіі Беларускай валютна-фондавай біржы долар патаннеў на 50 рублёў, еўра — на 150. Расійскі рубель падаражэў — на 1.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

КУРСЫ НЕКАТОРЫХ БАНКАЎ НА 8 ЛІСТАПАДА

«Белінвестбанк»: долар ЗША — 8600 і 8800; еўра — 11700 і 12150; расійскі рубель — 265 і 285.

«Хоум Крэдыт Банк»: долар ЗША — 8580 і 9350; еўра — 11750 і 12160; расійскі рубель — 278 і 305.

«Тэхнабанк»: долар ЗША — 8650 і 8800; еўра — 11850 і 12160; расійскі рубель — 280 і 288.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Надвор'е

УНАЧЫ ПАДМАРОЗІЦЬ, А РАНІЦАЙ ТУМАН І ГАЛАЛЁД

Другі тыдзень лістапада пройдзе ў нашай краіне пад знакам антыцыклонаў, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга ФЯДОТАВА.

Толькі ў сераду праз тэрыторыю Беларусі будзе рухацца малаактыўны атмасферны фронт. Таму месцамі чакаюцца невялікія дажджы, а на паўночным усходзе краіны магчымы мокры снег. Тэмпература ўдзень 1—6 цяпла, толькі на паўднёвым захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей да плюс 8 градусаў.

А вось з чацвярга і па пятніцу ўключна да нас завітае чарговы скандынаўскі антыцыклон. Будзе малавоблачнае без ападкаў надвор'е, уначы і раніцай туман, магчымы слабы галалёд. Пахаладае. Уначы стане ад 0 да 6 марозу, у асобных раёнах — да мінус 8 градусаў. Удзень тэмпература паветра 0—плюс 6 градусаў.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, у суботу і нядзелю ўплыў антыцыклону захаваецца. Ападкаў амаль не будзе. Раніцай туман і слабы галалёд. Тэмпература ўначы 0—мінус 5 градусаў, пры праясненнях — да 6—8 марозу, удзень 1—6 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЕЎРОПУ ЛІХАМАНІЦЬ: СТРАЙКІ І СТУДЭНЦКІЯ ПАГРОМЫ

У некалькіх краінах Еўрапейскай супольнасці супрацоўнікі сістэмы грамадскага транспарту, незадаволеныя эканамічнай палітыкай улад, праводзяць страйкі. У сталіцы Вялікабрытаніі Лондане рыхтуюцца да масавых беспарадкаў — на мітынгі павінны выйсці студэнты, якія пратэстуюць супраць антыкрызісных мер урада ў сістэме адукацыі. Каб узяць сітуацыю пад кантроль, кіраўніцтва горада дазволіла паліцэйскім страляць гумовымі кулямі па дэманстрантах.

Учора ў Партугаліі прайшоў усеагульны страйк транспартнікаў. Прадстаўнікі прафсаюзаў звязваюць гатоўнасць насельніцтва страйкаваць з незадаволенасцю скарачэннем субсідый і масавымі звальненнямі.

У Італіі страйк абвясцілі кіроўцы аўтобусаў і таксі. У выніку, па водгуках відавочцаў, на вакзалах утварыліся велізарныя чэргі з ахвотнікаў скарыстацца грамадскім транспартам. У ліку патрабаванняў маніфестантаў — адстаўка кабінета міністраў на чале з прэм'ерам Сільвіа Берлусконі.

У Францыі з панядзелка страйкуюць чыгуначнікі, якія пратэстуюць супраць планаў Еўрасаюза прыцягнуць новых гульцоў на рынак пасажырскіх перавозак. Людзі асцерагаюцца будучых скарачэнняў у сувязі з гэтай мерай.

У ПОЛЬСКІ ПАРЛАМЕНТ УВАЙШЛІ ТРАНССЭКСУАЛ І ГЕЙ

У Польшчы, якая традыцыйна лічыцца кансерватыўнай краінай, у аўторак прыведзены да прысягі першы ў гісторыі краіны дэпутат-транссэксуал, які ўвайшоў у парламент па выніках кастрычніцкіх выбараў. 57-гадовая Ганна Гродска раней насіла імя Кшыштаф: да аперацыі, зробленай у Тайландзе, яна была мужчынам, перадае ВВС.

Разам з ёй дэпутацкі мандат уручаны першаму адкрытаму гею Роберту Бедрану. Паводле слоў аналітыкаў, з'яўленне ў польскім сойме такіх дэпутатаў з'яўляецца прыкметай паслаблення ўплыву рымска-каталіцкай царквы.

Гродска і Бедран балатаваліся ў Сойм ад партыі «Рух Палікота». Яна вядомая цвёрдай антыклерыкальнай пазіцыяй, крытыкай святароў за ўцягнутасць у палітыку, а таксама барацьбой за легалізацыю абортаў, аднаполых шлюбаў і марыхуаны. На выбарах у кастрычніку партыя нечакана набрала 10% галасоў выбаршчыкаў, стаўшы трэцяй па велічыні палітычнай групай у польскім парламенце.

АМЕРЫКАНСКАЯ МОЛАДЗЬ БЯДНЕЙШАЯ ЗА СТАРЫХ У 47 РАЗОЎ

Розніца ў памеры багацця паміж маладымі і пажылымі амерыканцамі дасягнула рэкордных значэнняў з-за эканамічнага спаду апошніх гадоў. Грамадзяне ва ўзросце старэй за 65 гадоў валодаюць у 47 разоў большым аб'ёмам актываў, чым амерыканцы, маладзейшыя за 35 гадоў.

Як правіла, пажылыя людзі назапашваюць багацце на працягу жыцця і таму валодаюць большымі сродкамі, чым моладзь. Аднак чвэрць стагоддзя назад гэтыя суадносіны складалі ад 5:1 да 10:1. Сярэдні памер багацця хатняй гаспадаркі, якая ўзначальваецца чалавекам, старэйшым за 65 гадоў, складае 170,5 тысячы даляраў. У той жа час маладыя людзі маюць у сярэднім толькі 3,9 тысячы даляраў. Пры гэтым 37 адсоткаў хатніх гаспадарак, якія ўзначальваюцца маладымі людзьмі, наогул маюць нулявы ці адмоўны аб'ём багацця.

Пасля крызісу сітуацыя значна абвастрылася, бо пажылыя не спяшаюцца выходзіць на пенсію, а моладзі адпаведна не застаецца дастатковай колькасці працоўных месцаў.

АСПІРЫН І ТАМАКСІФЕН АКАЗАЛІСЯ ЭФЕКТЫЎНЫЯ ДЛЯ ПРАФІЛАКТЫКІ РАКУ

Брытанцы прапанавалі праводзіць профілактыку развіцця злаякасных пухлін з дапамогай папулярных і недарагіх лекаў, паведамляе New Scientist. Дзве незалежныя даследчыя групы пацвердзілі эфектыўнасць аспірыну і тамаксіфену для прадухілення развіцця раку тоўстай кішкі і грудзей адпаведна.

Міжнародная група навукоўцаў з Ньюкаслскага ўніверсітэта на працягу чатырох з паловай гадоў назірала больш за 860 носьбітаў генаў, якія адказваюць за развіццё спадчыннай формы раку тоўстага кішэчніка. Палова з іх штодня прымала па 600 міліграмаў аспірыну, астатнія атрымлівалі плацэба. Па вынікаў даследавання, спадчыннае захворванне развілося ў 19 добраахвотнікаў з першай групы, а таксама ў 34 — з кантрольнай.

У сваю чаргу навукоўцы з лонданскага Інстытута прафілактычнай медыцыны імя Уолфсона вывучалі жанчын, у якіх падчас маммаграфіі было зафіксавана павышэнне шчыльнасці тканак малочнай залозы. Навукоўцы высвятлілі, што на працягу 10 гадоў пасля абследавання ў жанчын з ушчыльненнем больш 75 адсоткаў тканак залозы рак грудзей развіваўся ў чатыры разы часцей, чым у астатніх брытанак. Спецыялісты адзначылі, што ўжыванне антыэстрагеннага прэпарата тамаксіфену змяншае шчыльнасць тканак малочны залозы. Выкарыстанне гэтага сродку змяншала рызыку развіцця раку грудзей у жанчын на 63 адсоткі.

Працавалі «за дзякуй»?

У Віцебскай вобласці сёлета супрацоўнікамі падатковых органаў было ўстаноўлена каля сарака фактаў выплаты работнікам зарплаты «ў канвертах».

Цікава, што два наймальнікі афіцыйна зусім не выплачвалі заработную плату. Выяўлена сем юрыдычных асоб, якімі выплачвалася заработная плата ў памеры ніжэй за мінімальны гарантаваны пражытковы мінімум. Акрамя таго, устаноўлена каля сарака суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці, якія, як высветлілася, выплачвалі наёмным асобам заработную плату без заключэння ў пісьмовай форме працоўных дагавораў. З іх амаль што ўсе не адлюстроўвалі яе ў адпаведных рэгістрах бухгалтарскага і падатковага ўліку. Па ўстаноўленых фактах падатковымі інспекцыямі вобласці дадаткова налічана да выплаты ў бюджэт 23,1 мільёна рублёў, у тым ліку 3,4 мільёна рублёў штрафаў і пені.

Паводле інфармацыі Віцебскай абласной інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах, па выніках дзевяці месяцаў было выяўлена звыш трыццаці індывідуальных прадпрымальнікаў, якімі незаконна прыцягваліся на работу грамадзяне — не іх блізкія сваякі, што забаронена. Агульная сума накладзеных штрафаў склала 24,2 мільёна рублёў з канфіскацыяй прыбыткаў, атрыманых у выніку незаконнай дзейнасці. Сума незаконных прыбыткаў вялікая — у памеры больш за 35 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Выстава

СМАЧНА ЕСЦІ!

З 8 па 11 лістапада ў Мінску ў выставачным цэнтры «Белэкспа» па вуліцы Янкі Купала, 27 праходзіць буйнейшая аптовая харчовая выстава-кірмаш Беларусі — «Харчэкспа-2011». Гэта ўжо 17-ы па ліку такі прадстаўнічы форум: за гады сваёй працы выстава набыла высокі статус і лічыцца адным з самых значных мерапрыемстваў у сферы харчавання з усіх існуючых у краіне. Галоўная мэта мерапрыемства — фарміраванне харчовых рэсурсаў на наступны год. Сёлета ўдзел у мерапрыемстве пацвердзіла каля 200 прадпрыемстваў розных формаў уласнасці з Беларусі, Расіі, Літвы, Польшчы.

...Шчыра кажучы, былі невялікія асцярогі, што экспанентаў сёлета будзе менш, ды і пытанне пра навінкі вытворчасці па першым часе задаваць было неяк не вельмі звыкла. Аднак стасункі з усімі ўдзельнікамі выставы-кірмашу, да каго атрымалася падысці, хутка развеялі ўсе сумненні. Не кажучы ўжо пра кідкае вонкавае аздабленне (а мерапрыемства так і хочацца назваць форумам смаку і водару), размовы з вытворцамі, узоры навінак пацвердзілі адну простую аксіёму: есці хочацца заўсёды. Вядома, нехта можа дазволіць сабе і далікатэс, а хтосьці будзе рады і больш простым стравам. Але ўдзельнікі харчовай выставы гатовыя былі задаволіць любыя густы і фінансавыя магчымасці канчатковага рознічнага пакупніка, прапанаваць нешта новае, здзівіць арыгінальным.

СТАР. 6

Журналіст «Звязды» жартуе: «Мне б такую...»

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.11.2011 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▼1 долар ЗША	8 700,00	1 чэшская крона	475,73	USD	30,5014
▼1 еўра	11 196,00	1 польскі злоты	2 746,91	10 UAH	38,1482
1 латвійскі лат	17 043,78	▲1 расійскі рубель	285,00	10000 BYR	34,8587
1 літоўскі літ	3 468,35	1 украінская грыўня	1 088,11	EUR	41,9394

ЗБІЎ ДЗІЦЯ І З'ЕХАЎ З МЕСЦА ЗДАРЭННЯ

7 лістапада ў Бабруйску а 17-й гадзіне ў дварах дома на вуліцы Ванцэці пад колы аўтамабіля «KIA» трапіў 10-гадовы хлопчык. Ён быў шпіталізаваны з ударамі. Вадзіцеля, які з'ехаў і пакінуў дзіця без дапамогі, хутка знайшоў нарад ДАІ: ім аказаўся 43-гадовы мясцовы жыхар.

Алена КАЗЛОВА.

Меры па падтрымцы спорту і павышэнні аплаты працы спартсменаў прымаюцца ў Беларусі

Меры па падтрымцы спорту і павышэнні аплаты працы спартсменаў прымаюцца ў Беларусі. Яны змешчаны ва ўказе № 497 «Аб аказанні падтрымкі арганізацыям фізічнай культуры і спорту», які Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 3 лістапада 2011 года.

Дакумент накіраваны на стварэнне неабходных умоў для далейшага развіцця фізічнай культуры і спорту ў краіне, ён дасць магчымасць аптымізаваць меры падтрымкі гульнявых відаў спорту, забяспечыць гарантаваны ўзровень аплаты працы спартсменаў і работнікаў клубаў, а таксама стымуляваць самастойнае атрыманне сродкаў спартыўнымі арганізацыямі і дасягненне імі больш высокіх спартыўных дасягненняў.

Указ будзе дзейнічаць толькі ў 2012 годзе. Урад да 1 снежня 2012 года па выніках прымянення гэтага нарматыўнага прававога акта павінен унесці на разгляд Прэзідэнта прапановы аб далейшым рэгуляванні ўмоў падтрымкі спартыўных арганізацый.

Крыніцамі паступленняў у арганізацый фізічнай культуры і спорту будуць сродкі, атрыманыя ад:

мясцовых бюджэтаў (падтрымка аказваецца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ў выглядзе субсідый са сродкаў мясцовых бюджэтаў на частковае фінансаванне не больш як 40 працэнтаў сумы сродкаў, вылічанай зыходзячы з нормаў і нарматываў для бюджэтных арганізацый у адпаведнасці з пералікам відаў расходаў на забеспячэнне работы клубаў па гульнявых відах спорту);

арганізацый у выглядзе льготуемай спонсарскай дапамогі (такая падтрымка аказваецца спартыўным арганізацыям у выглядзе бязвыплатнай перадачы спартыўным арганізацыям грашовых сродкаў, бязвыплатнага аказання паслуг (выканання работ) і (або) бязвыплатнай перадачы маёмасці, у тым ліку маёмасных правоў, з уключэннем сум расходаў па аказанні такой бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі ў склад пазарэалізацыйных расходаў для мэт падаткаабкладання). Гэта льгота з'яўляецца катэгарыяльнай. Спартклубы павінны самастойна дамаўляцца з прадпрыемствамі, аб'ём атрыманых імі спонсарскіх сродкаў будзе цалкам залежаць ад работы саміх спартыўных арганізацый;

арганізацый у выглядзе нельгатуемай спонсарскай дапамогі;

гаспадарчай дзейнасці (указам прадугледжваецца, што спартыўныя арганізацыі, створаныя ў форме грамадскіх аб'яднанняў, могуць ажыццяўляць асобныя віды прадпрымальніцкай дзейнасці без утварэння камерцыйных арганізацый (напрыклад, дзейнасць у галіне спорту, турыстычную дзейнасць, аптовы і рознічны гандаль), а таксама перадаваць, у тым ліку на аплатнай аснове, правы на тэле-, радыё- і іншыя спосабы трансляцыі спартыўных спаборніцтваў, прадаваць білеты на праводзімыя імі або з іх удзелам спартыўныя спаборніцтвы);

міжнародных арганізацый.

Каштарысы расходаў клубаў па гульнявых відах спорту будуць фарміравацца з удзелам мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Каштарысы расходаў з прыкладаннем разлікаў па кожным відзе расходаў будуць зацвярджацца кіраўнікамі гэтых клубаў па ўзгадненні з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, якія аказваюць ім падтрымку.

Прымяненне гэтых нормаў дасць магчымасць мясцовым выканаўчым і распарадчым органам нараўне з узгадненнем планаў развіцця клубаў па гульнявых відах спорту кантраляваць мэтавае выкарыстанне дзяржаўнай падтрымкі; прымаць меры па павелічэнні аб'ёмаў даходаў ад уласнай фінансава-гаспадарчай дзейнасці спартыўных арганізацый шляхам давядзення адпаведных заданняў.

Адноўлена раней дзеючая норма аб тым, што клубы па гульнявых відах спорту маюць права прымяняць падатковыя льготы пры ўмове накіравання на развіццё дзіцяча-юнацкага спорту не менш як 25 працэнтаў сродкаў, атрыманых у выглядзе падтрымкі, а таксама прадстаўлення штоквартальна не пазней за 15-е чысло месяца, наступнага за справаздачным кварталам, справаздачы аб выкананні каштарыса расходаў клубаў па гульнявых відах спорту мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, якія аказваюць ім падтрымку.

Расходы на заработную плату работнікаў клубаў па гульнявых відах спорту абмяжоўваюцца ў памеры і ўвязваюцца з іх спартыўнымі рэзультатамі.

Пастановай урада, распрацаванай у мэтах развіцця палажэнняў указа, прадугледжваецца, што пры налічэнні заработнай платы з ільгатуемай спонсарскай дапамогі прымяняюцца ўмовы аплаты працы, устаноўленыя для работнікаў бюджэтных арганізацый і іншых арганізацый, якія атрымліваюць субсідыі, работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый.

Пры гэтым тарыфныя стаўкі разлічваюцца на аснове тарыфнай стаўкі першага разраду, што ўстанаўліваецца Саветам Міністраў, а таксама тарыфных разрадаў і каэфіцыентаў пасад кіраўнікоў спартыўных клубаў па гульнявых відах спорту, пасад трэнераў і спартсменаў-інструктараў каманд па гульнявых відах спорту. Павышэнне тарыфных ставак (акладаў) пры накіраванні на гэтыя мэты спонсарскіх сродкаў прапануецца ажыццяўляць кіраўнікам, трэнерам, спартсменам-інструктарам, стажорам спартсменаў-інструктараў клубаў па гульнявых відах спорту ў залежнасці ад месца, занятага камандай клуба на чэмпіянаце Беларусі і (або) чэмпіянатах, у розыгрышах кубкаў іншых дзяржаў па выніках гульняў папярэдняга сезона.

Клубам, якія выступаюць на міжнароднай арэне і дасягнулі высокіх спартыўных вынікаў, прапануецца не абмяжоўваць памер заработнай платы, што выплачваецца са сродкаў ільгатуемай спонсарскай дапамогі.

Таксама прадугледжваецца захаванне ранейшых ільгот спартыўным клубам па падатку на прыбытак (вызваляюцца сумы прыбытку, атрыманага ад рэкламы), па падаходным падатку з фізічных асоб, па падатку на дабаўленую вартасць пры ўвозе рознага рыштунку і абсталявання. Валавы прыбытак спартыўных арганізацый змяншаецца на суму прыбытку, выкарыстанага імі на рэалізацыю сваіх статутных мэт (задач).

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ БЕЛАРУСІ Ў 2012 ГОДЗЕ ПАВІННЫ ПРЫРАСЦІ МІНІМУМ НА $5 МЛРД

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Рост эканомікі павінен стаць якасным, інавацыйным, а значыць, новыя праекты павінны быць акупныя, дзейнасць суб'ектаў гаспадарання рэнтабельнай, а рэальныя даходы насельніцтва павінны расці з ростам прадукцыйнасці працы», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Кіраўнік урада падкрэсліў важнасць мер па выхаду Беларусі на дадатнае знешнегандлёвае сальда. Гэта разглядаецца як аснова стабілізацыі валютнага курсу. «Гэта без перабольшання фундаментальная задача знешнеэканамічнай балансіроўкі, альтэрнатывы проста няма», — сказаў ён. Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што наступны год будзе складаным для сусветнай эканомікі і сусветныя працэсы не могуць не закрануць Беларусі. «Таму ўнутранае спажыванне павінна быць рацыянальным, а прыярытэтам павінен стаць экспарт і яго апярэджанне над імпартам», — рэзюмаваў кіраўнік урада.

ВЫПЛАТЫ ПА ЗНЕШНІМ ДОЎГУ БЕЛАРУСІ Ў 2012 ГОДЗЕ СКЛАДУЦЬ $1,6 МЛРД

Пра гэта заявіў учора на пасяджэнні Саўміна прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч. «Сумарна па ўсіх артыкулах знешняга дзярждоўгу мы павінны выплаціць у 2012 годзе $1,6 млрд», — канстатаваў прэм'ер-міністр. Паводле яго слоў, крыніцы вызначаны. Жорсткі кантроль і кіраванне знешнім доўгам будуць забяспечаны», — падкрэсліў ён.

Міхаіл Мясніковіч нагадаў, што Беларусь плануе прыцягнуць у эканоміку новыя крэдытныя рэсурсы — Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС і МВФ.

Аналізуючы асаблівасці эканамічнага развіцця Беларусі ў наступным годзе, кіраўнік урада падкрэсліў, што галоўнымі павінны стаць паказчыкі якасці і эфектыўнасці. Пры гэтым рэальныя даходы насельніцтва ў наступным годзе павінны быць не ніжэйшыя за ўзровень 2011 года. «Ёсць усе падставы, што зарплата, пенсіі і сацыяльныя дапамогі будуць расці вялікімі тэмпамі, прапанаванне рабочых месцаў будзе большае, чым попыт на іх з боку насельніцтва», — расказаў ён.

БУДУЦЬ СТВОРАНЫ ДАДАТКОВЫЯ СТЫМУЛЫ ДЛЯ ІНАВАЦЫЙНАГА РАЗВІЦЦЯ

Дадатковыя стымулы для інавацыйнага развіцця краіны будуць створаны ў Беларусі ў 2012 годзе, заявіў Міхаіл Мясніковіч.

«У 2012 годзе прапануецца пакет мер па стымуляванні інвестыцый і інавацый, якія дадуць магчымасць прадпрыемствам атрымаць дадаткова амаль Br2 трлн на ўласнае развіццё», — праінфармаваў кіраўнік урада.

Прэм'ер-міністр нагадаў аб запланаваным зніжэнні падатку на прыбытак з 24 працэнтаў да 18 працэнтаў. Плануецца таксама паскораная амартызацыя асноўных фондаў і перанос страт прадпрыемстваў на будучыя перыяды. «У планах урада таксама зніжэнне ставак падаткаў для малога і сярэдняга бізнэсу і магутныя стымулы аж да нулявых ставак па шэрагу падаткаў для інавацыйнага развіцця», — расказаў ён.

Паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, на дзяржпрадпрыемствах пад кантролем будзе кожная будоўля, кожны праект, уключаючы тэхпераўзбраенне. «Жыць па сродках — гаворым часта, а рэальна — залазім у даўгі, таму прапануецца жорсткая бюджэтная дысцыпліна», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. Ён адзначыў, што аблвыканкамы, Мінгарвыканкам, міністэрствы і канцэрны запытаюць у дзяржавы сродкі на развіццё. У такіх выпадках крыніцы тры — уласныя сродкі, даходы ад прыватызацыі і прамыя замежныя інвестыцыі, нагадаў Міхаіл Мясніковіч.

Актуальна

Як стрымаць цэны на лекі?

З настойлівай рэкамендацыяй не прымяняць максімальныя гандлёвыя надбаўкі пры фарміраванні рознічных цэн на лекавыя сродкі кіраўніцтва Міністэрства аховы здароўя звярнулася да ўсіх уладальнікаў ліцэнзій на фармацэўтычную дзейнасць, работы і паслугі, звязаныя з рознічнай рэалізацыяй лекавых сродкаў.

Не сакрэт, што беларусы рыхтаваліся да новых цэн на лекі на працягу некалькіх апошніх месяцаў, бо яшчэ ў чэрвені міністр аховы здароўя Васіль Жарко паабяцаў, што сама меней да восені медыкаменты ў аптэчнай сетцы будуць рэалізоўвацца па звыклых цэнах. Таму многія і кінуліся скупляць лекі, так бы мовіць, у запас. І сёння гэтыя людзі, напэўна, радуюцца сваёй прадбачлівасці, бо новыя цэннікі на лекі і сапраўды ўражваюць. Увогуле ў апошнія тыдні ў сталічных аптэках назіраецца сапраўднае «цэнавае бязмежжа», калі цана на адзін і той жа прэпарат у суседніх аптэках можа адрозніваць ца ў 2-3 разы. Прычым беларускія лекі па сваім кошце даволі часта не саступаюць замежным аналагам. Тлумачэнне гэтаму, вядома, можна знайсці — новая партыя лекаў паступае ўжо па новай цане. Таму калі вы ўчора купілі ўпакоўку лекаў, скажам, па цане 10 тысяч рублёў, то сёння той жа прэпарат у той жа аптэцы можа каштаваць ужо і 20 тысяч рублёў, і нават даражэй.

Вынікі маніторынгу фармацэўтычнага рынку Рэспублікі Беларусі, які ажыццяўляе Міністэрства аховы здароўя, таксама сведчаць пра рост рознічных цэн на лекавыя сродкі як айчыннай, так і замежнай вытворчасці. Як паведамляецца ў інфармацыйным лісце Міністэрства аховы здароўя, у сувязі з адменай прыярытэтных напрамкаў закупкі замежнай валюты, у тым ліку для аплаты лекавых сродкаў і фармацэўтычных субстанцый, і выхадам на адзіны раўнаважны курс беларускага рубля, на ўсіх сегментах рынку адзначаецца істотны рост разлікова-адпускных цэн на лекавыя сродкі». Аднак лекі па-ранейшаму застаюцца сацыяльна важным таварам, таму ў галоўным медыцынскім ведамстве краіны пастаянна думаюць пра забеспячэнне цэнавай даступнасці лекавых сродкаў для розных слаёў насельніцтва.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Абзац

У Беларусі, па звестках на 1 кастрычніка г.г., стагадовую мяжу пераадолела 560 жыхароў краіны. Лідар па колькасці доўгажыхароў — Гродзенская вобласць: тут жыве 134 чалавекі ва ўзросце старэйшым, за 100 гадоў. На другой пазіцыі Мінская вобласць (87), на трэцяй — Брэсцкая (82). У Гомельскай вобласці пражывае 76 доўгажыхароў, у Віцебскай — 66, у Магілёўскай — 60. У Мінску менш за ўсё жыхароў ва ўзросце 100 гадоў і старэйшых (55).

Каля 230 адзінак зброі выведзена з нелегальнага абарачэння супрацоўнікамі міліцыі Віцебскай вобласці падчас асноўнага этапу комплексных спецмерапрыемстваў «Арсенал» з 31 кастрычніка па 4 лістапада. У асноўным гаворка ідзе пра гладкаствольную зброю, якая засталася ад памерлых сваякоў, і зброю часоў Вялікай Айчыннай вайны, выкапаную ў месцах вядзення баявых дзеянняў на тэрыторыі вобласці.

Днём 7 лістапада, на аўтадарозе Мінск—Віцебск каля вёскі Плешчаніцы 31-гадовая жыхарка Полацкага раёна (стаж — 1,5 года) за рулём аўтамабіля «Фальксваген Гольф» перавысіла хуткасць, не справілася з кіраваннем і выехала на сустрэчную паласу, дзе яе аўто ў лоб сутыкнулася з мікрааўтобусам «Фальксваген». У выніку аварыі кіроўца легкавіка і пасажыр мікрааўтобуса (жанчына 1961 года нараджэння) ад атрыманых траўмаў памерлі ў рэанімацыі. Пасажыр «Гольфа» (1978 года нараджэння) і кіроўца мікрааўтобуса (1961) з рознымі траўмамі знаходзяцца ў бальніцы.

Праезд у наземным грамадскім транспарце Мінска ў снежні можа быць павышаны да Br1,6 тыс., а ў метро — да Br1,8 тыс. Пра гэта паведаміў журналістам дырэктар ДУ «Сталічны транспарт і сувязь» Валер Шкуратаў. Пры гэтым нават такі памер тарыфаў не забяспечыць планы канцэпцыі тарыфнай палітыкі, па якой пасажыры павінны аплочваць 70% сабекошту праезду ў камунальным грамадскім транспарце, або Br2,9 тыс. за адну паездку. Сёння сабекошт адной паездкі ў метро дасягнуў Br8,5 тыс., на наземным транспарце — Br6,3 тыс.

Лядовая арэна адкрылася ў Івацэвічах. Новы спартыўны аб'ект размясціўся ў мікрараёне Заходні. У будынку ўладкаваныя раздзявальні і душавыя, кабінеты для персаналу, тэхнічныя памяшканні, буфет. У глядзельнай зале 790 пасадачных месцаў. Разам з новай спортпляцоўкай горад атрымаў памяшканне для правядзення канцэртна-відовішчных мерапрыемстваў.

Міністэрства аховы здароўя паінфармавала зацікаўленыя міністэрствы, ведамствы і гандлёвыя арганізацыі аб недапушчэнні рэалізацыі на тэрыторыі Беларусі алівак з мінданём гандлёвай маркі «Бія Гаўдзіяна» (Італія), якія сталі прычынай двух выпадкаў захворвання на батулізм у Фінляндыі.

На беларуска-латвійскай мяжы ў аўтадарожным пункце пропуску Грыгораўшчына памежнікамі сумесна з супрацоўнікамі мытні ў паўпрычэпе аўтамабіля, які, мяркуючы па прад'яўленых дакументах, павінен быў перавозіць драўняны вугаль, выяўлена 504,5 тыс. пачкаў цыгарэт «Прэм'ер», «Фэст», «Фэст-7» з акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь. Усе цыгарэты былі адабраныя, іх агульны кошт ацэнены ў Br1,2 млрд.

Поўны абзац

Падчас інспекцый мужчынскай турмы на поўдні Мексікі правяральнікі выявілі ў папраўчай установе 19 прастытутак. Акрамя таго, у турме выявілася 100 плазменных тэлевізараў, дзве скрыні з марыхуанай, 100 байцоўскіх пеўняў і два паўліны. У камерах разам з мужчынамі ўтрымліваліся таксама шэсць зняволеных — жанчын.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

АБРАБАВАЎ ДОМ 82-ГАДОВАГА

У Віцебску супрацоўнікі Дэпартамента аховы сумесна з супрацоўнікамі крымінальнага вышуку Чыгуначнага раённага аддзела міліцыі затрымалі раней судзімага непрацуючага мясцовага жыхара 1986 года нараджэння, які абрабаваў дом 82-гадовага пенсіянера.

Устанавілі, што гэты злодзей праз адчыненыя дзверы ўвайшоў у прыватны дом, які належыць пенсіянеру 1929 года нараджэння, і скраў рэчы, грошы. Агульная матэрыяльная шкода, нанесеная гаспадару, «пацягнула» на суму звыш 1,5 мільёна рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Школа. Шахта. Літаратура

Члены Саюза пісьменнікаў Беларусі на чале з Мікалаем Чаргінцом у першы дзень падарожжа па Мінскай вобласці наведалі Мінскую абласную кадэцкую вучэльню ў Слуцку, цалкам беларускамоўную Казловіцкую сельскую школу ў аграгарадку Казловічы, сустрэліся з членамі раённага літаратурнага аб'яднання «Случ» і нават спусціліся ў саляную шахту ААТ «Беларуськалій» у Салігорску.

Галоўная мэта паездкі — абмяняцца думкамі пра побыт Беларусі і высветліць, ці запатрабаваная беларуская літаратура сучасным грамадствам. Асабліва ў глыбінцы.

— Мы вельмі рады, што наша падарожжа пачалося са Случчыны, — распавядае Мікалай Чаргінец, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі. — Случчына — багаты край, які нас корміць. Але каштоўны гэты край і тым, што даў Беларусі шмат таленавітых людзей.

Паўсюль, дзе пабывалі пісьменнікі, сярод якіх Генадзь Пашкоў, Алесь Савіцкі, Ягор Конеў, Віктар Праўдзін, Алесь Бадак, Рагнед Малахоўскі, Мікола Мятліцкі і іншыя, у падарунак яны пакінулі свае кнігі. Асабліва гэта каштоўна для бібліятэкі кадэцкай вучэльні і бібліятэкі Казловіцкай сельскай школы. Цяпер кнігі членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі будуць стаяць побач з творамі класікаў айчыннай літаратуры Васіля Быкава і Уладзіміра Караткевіча. Магчыма, гэта стане для дзяцей дадатковым стымулам звярнуцца да роднай літаратуры. Як сведчаць супрацоўнікі гэтых бібліятэк, толькі каля чвэрці ўсіх дзяцей чытаюць па-беларуску. І тое пераважна творы школьнай праграмы... На пытанне «Якіх беларускіх пісьменнікаў вы ведаеце?» навучэнцы 8 класа Мінскай абласной кадэцкай вучэльні сціпла назвалі Максіма Багдановіча і Янку Купалу. Відавочны недахоп кантакту дзяцей з сучаснай літаратурай, сучаснымі аўтарамі, як і відавочны недахоп грамадства ў жывой камунікацыі з паэтамі і празаікамі.

У першым класе Казловіцкай сельскай школы вучыцца сёння ўсяго восем чалавек. Але вельмі радасна, што ў школе навучанне вядзецца на беларускай мове. Як ні парадаксальна, такіх школ у нашай краіне становіцца ўсё менш і менш. Як распавядае Мая Сяргеева, дырэктар Казловіцкай сельскай школы, дзеці з задавальненнем вучацца на роднай мове, але з-за гэта ў іх ёсць потым пэўныя праблемы. Зноў-такі, як ні парадаксальна, пасля школы дзеці даволі рэдка сустракаюцца з беларускай мовай: і ў ВНУ, і ў гарадскім асяродку. Гэтую сітуацыю, зразумела, трэба змяняць. Але не выкараняючы родную мову са школ, а наадварот — спрыяючы яе развіццю ў іншых сферах. Гэтаму імкнуцца спрыяць і пісьменнікі. Нездарма яны адправіліся ў двухдзённае падарожжа па Мінскай вобласці па распараджэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Адным з самых яскравых уражанняў для ўсіх стала наведванне самага буйнога і паспяховага беларускага прадпрыемства, у пэўным сэнсе сімвала айчыннай вытворчасці — ААТ «Беларуськалій». Па прыблізных падліках, кожная другая сям'я ў Салігорску, сталіцы беларускіх шахцёраў, звязана з «Беларуськаліем». Пісьменнікі разам з журналістамі пазнаёміліся са штодзённай працай салігорскіх рабочых, наведаўшы адну з шахтаў. Магчыма, гэтае цікавае падарожжа стане падставай для рамана пра жыццё беларускіх шахцёраў.

Зоя СВЕТЛАЯ.

ВЕРА — ЛЕПШАЯ АХВЯРА

АДНО з галоўных свят — Курбан-байрам — адзначылі мусульмане Іўя. Сёння ў райцэнтры, які лічыцца сталіцай беларускіх татар, жыве каля трохсот татарскіх сем'яў, яшчэ некалькі тысяч татар — у вёсках. Свята доўжыцца на працягу трох дзён. У гэты час вернікі чытаюць малітвы, праводзяць рытуалы ахвярапрынашэння, наведваюць могілкі. Курбан-байрам, як распавядаюць самі мусульмане, — гэта сямейнае свята. У гэтыя дні старающца сабрацца ўсе пакаленні, ходзяць у госці, дораць падарункі сваякам. І сёння гэтае свята захавала свае традыцыі ў спрадвечным выглядзе. Галоўнае правіла ў гэты дзень — шчодрасць і ахвяраванне. Строгія ўстоі Ісламу абавязваюць вернікаў накарміць галодных і бедных, бо Курбан-байрам сімвалізуе міласэрнасць, магутнасць Бога і тое, што вера — лепшая ахвяра.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

Гродзенская вобл.

Да сусветнага Дня якасці

МІЖНАРОДНЫЯ СТАНДАРТЫ БУЙНЕЙШАГА ПАДАТКАПЛАЦЕЛЬШЧЫКА

— Укараненне міжнародных стандартаў адкрыла прадпрыемству не толькі магчымасць выхаду на замежныя рынкі, але і прыдало ўпэўненасці, што наша прадукцыя можа быць прадстаўлена на сусветным узроўні, — лічыць генеральны дырэктар Гродзенскай тытунёвай фабрыкі «Нёман» Юрый ЧАРНЫШОЎ.

Калі ў 2009 годзе экспарт тытунёвых вырабаў склаў 300 тысяч доларaў ЗША, летась — 1 мільён доларaў, то па выніках гэтага года плануецца экспартаваць прадукцыі на суму каля 2,5 мільёна доларaў.

Дзякуючы міжнародным стандартам серыі ICO на прадпрыемстве ўпарадкавалі працэсы распрацоўкі і вырабу прадукцыі, яе выпрабаванняў. На фабрыцы паспяхова дзейнічае сістэма менеджменту якасці. Дакладныя алгарытмы вырашэння вытворчых пытанняў дапамаглі рацыянальна размеркаваць абавязкі ўнутры калектыву, умела дэлегаваць паўнамоцтвы, павышаць матывацыю да высокапрадукцыйнай і творчай працы.

Для забеспячэння аховы здароўя сваіх работнікаў летась на прадпрыемстве сертыфікавалі адпаведную сістэму. Створана і падтрымліваецца вытворчае асяроддзе, якое не аказвае шкоднага ўплыву на здароўе чалавека. А за якасцю прадукцыі, яе адпаведнасцю патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў пільна сочыць лабараторыя па кантролі вытворчасці, якая акрэдытавана ў нацыянальнай сістэме пацвярджэння адпаведнасці Рэспублікі Беларусь. Выпрабаванні гатовай прадукцыі таксама праводзяцца згодна з патрабаваннямі міжнародных стандартаў серыі ICO.

Мадэрнізацыя вытворчасці на аснове найноўшых тэхналогій, супрацоўніцтва з сусветнымі кампаніямі, шматступеньчаты кантроль якасці на ўсіх этапах вытворчасці на адпаведнасць патрабаванням міжнародных стандартаў — усё гэта забяспечыла фабрыцы выпуск канкурэнтаздольных тытунёвых вырабаў з рэкордным за ўсю яе гісторыю аб'ёмам вытворчасці больш за 20 мільярдаў штук. ГТФ «Нёман» уваходзіць у лік дзесяці буйнейшых падаткаплацельшчыкаў Беларусі. Калі ў 2005 годзе было выраблена 6 млрд штук цыгарэт і ўплачана ў бюджэт 52 млрд рублёў, то сёлета плануецца выпусціць не менш за 23 млрд штук з пералічэннем у бюджэт больш за 500 млрд рублёў. Прычым нарошчваюцца і аб'ёмы продажу на экспарт.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПАЖАР З-ЗА ПАДПАЛЕНАЙ ЦАЦКІ

У доме ў вёсцы Таўзгіняны Воранаўскага раёна пражывалі маці і двое дзяцей. Жанчына бліжэй да апоўдня па справах завіхалася ў хляве, калі адчула пах дыму...

Маці кінулася ў дом і выратавала дачку 2010 года нараджэння. Сын 2006 года пакінуў жыллё самастойна. Дачку шпіталізавалі ў Воранаўскую цэнтральную раённую бальніцу з папярэднім дыягназам «атручэнне прадуктамі гарэння». На шчасце, ён не пацвердзіўся. У выніку пажару пашкоджаны дах дома, перакрыцці, сцены і маёмасць у двух пакоях. Прычына здарэння — дзіцячае свавольства з агнём. Калі прапальвалася печ, сын адчыніў дзверцу топкі, падпаліў дзіцячую цацку і пачаў гуляцца з ёй у пакоі...

Сяргей РАСОЛЬКА.

Даследаванне

СЯРЭДНЕСТАТЫСТЫЧНЫ ЖЫХАР БЕЛАРУСІ — ЗАМУЖНЯЯ МІНЧАНКА З ДЗІЦЕМ

Сярэднестатыстычны жыхар Беларусі — гэта 40-гадовая замужняя мінчанка з адным дзіцем, якая мае сярэднюю спецыяльную адукацыю і занятая ў апрацоўчай прамысловасці. Пра гэта паведамілі ў інфармацыйным цэнтры Фонду ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) «Свет сямі мільярдаў».

Вынікі перапісу насельніцтва 2009 года паказалі, што сярэднестатыстычнаму беларусу каля 40 гадоў. А дакладней, беларусы, паколькі жанчыны складаюць 53% насельніцтва рэспублікі. Гэта жыхарка сталіцы (амаль кожны пяты беларус пражывае ў Мінску).

Тыповая беларуска замужам, паколькі 52% беларусак знаходзяцца ў шлюбе. У яе, як правіла, адно дзіця. Тым не менш, сям'я сярэднестатыстычнага жыхара краіны складаецца з двух чалавек.

Сярэднестатыстычная беларуска атрымала сярэднюю спецыяльную адукацыю, як і 26% насельніцтва краіны ва ўзросце 10 гадоў і старэй. Працуе ў Мінску. Сфера дзейнасці — апрацоўчая прамысловасць, у якой працуе 22% занятага насельніцтва рэспублікі ва ўзросце 15 гадоў і старэй.

Тыповая жыхарка нашай краіны — беларуска па нацыянальнасці, як і 84% насельніцтва рэспублікі. Яна лічыць беларускую мову сваёй роднай, аднак дома размаўляе па-руску. Па звестках перапісу, на трох чалавек, якія ўжываюць у штодзённым жыцці рускую мову, прыпадае адзін, які размаўляе па-беларуску. Іншымі мовамі, акрамя гэтых дзвюх, большасць жыхароў нашай краіны не валодае.

Тыповы жыхар Беларусі пражывае ў кватэрным доме, які пабудаваны ў перыяд з 1981 па 1990 год.

Што да сярэднестатыстычнага жыхара планеты, то гэта мужчына 28 гадоў, які належыць да найбуйнейшай этнічнай групы Кітая — хань. Ён адзін з 13% сусветнага насельніцтва, чыя родная мова — мандарын (афіцыйны ў Кітаі). Працуе ў сферы паслуг, як і 40% жыхароў планеты. Ён хрысціянін, паколькі траціна жыхароў планеты вызнае хрысціянства. Тыповы жыхар планеты жыве ў горадзе, як і 51% з 7 млрд зямлян (31 кастрычніка нарадзіўся сямімільярдны жыхар планеты).

Парадокс: сярэднестатыстычнага чалавека цяжка назваць тыповым. Магчыма, яму трэба будзе стаць такім.

Дарэчы, праз некалькі гадоў сярэднестатыстычны чалавек мог бы апынуцца ў Індыі. У гэтай краіне пражывае больш як 1,2 млрд чалавек, або прыкладна 17% жыхароў планеты. Паводле прагнозаў, Індыя выйдзе на першае месца па колькасці насельніцтва праз 10 гадоў.

На працягу апошніх дзесяцігоддзяў сярэднестатыстычны чалавек жыве ў свеце, які развіваецца. Калі ж скласці партрэт тыповага жыхара развітых краін, то ён аказаўся б амерыканцам, як 4% насельніцтва планеты, гаварыў бы па-англійску або па-іспанску (на долю англа- і іспанамоўных прыпадае па 5% жыхароў планеты) і працаваў у адным з гарадоў ЗША. Яго даход у некалькі разоў перавышаў бы заробак 28-гадовага кітайца.

БЕЛТА.

ПЛЯМЫ НА СВІСЛАЧЫ

Апоўдні ў нядзелю сталічным пажарным-выратавальнікам паведамілі пра не зусім звыклае для іх здарэнне: на Свіслачы, насупраць будынка 19 па праспекце Пераможцаў, бачныя масляністыя плямы невядомага паходжання.

Работнікі МНС з дапамогай бонавай загароды прадухілілі распаўсюджванне гэтых плям далей, уніз па цячэнні ракі. А неўзабаве выявілі і крыніцу забруджвання. Для прыбірання плям з паверхні Свіслачы давялося задзейнічаць два іласосы УП «Мінскводаканал» і тры гаспадарчыя цыстэрны ДВА «Гаррэмаўтадар Мінгарвыканкама». На выхадзе вады быў пастаўлены бон-загароджа УП «Мінскводаканал». Прычынай здарэння стала пранікненне плям праз загароджу ў канале-адстойніку УП «Гаррэмліўнесцёк» па вуліцы Даўмана. Са Свіслачы ўзялі пробы вады для аналізу.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Кватэрнае пытанне

Эксплуатацыйныя арганізацыі абавязаны...

Час ад часу мы звяртаемся ў камунальныя службы з просьбай устараніць тыя ці іншыя няспраўнасці. Хацелася б ведаць, ці «прапісаны» недзе канкрэтныя тэрміны выканання заявак жыльцоў?

К. Зыранаў, *г. Гродна.*

У адпаведнасці з Тэхнічным кодэксам усталяванай практыкі ТКП 45-1.04-14-2005 (02250) «Тэхнічная эксплуатацыя жылых і грамадскіх будынкаў і збудаванняў. Парадак правядзення», заяўкі павінны разглядацца ў дзень паступлення і ўстаранятца, як правіла, не пазней, чым на наступны дзень. У выпадках немагчымасці аператыўнага ўстаранення няспраўнасцяў, звязаных з пагрозай бяспецы, пашкоджання маёмасці, эксплуатацыйныя арганізацыі абавязаны:

прыняць неадкладныя меры па прадухіленні пагрозы абрушэння канструктыўных элементаў (наладжваннем часовых мацаванняў), затаплення нізжэйшых паверхаў (перакрыццем сістэм ацяплення, водазабеспячэння з адначасовым забеспячэннем спажыўцоў вадой у пераносных ёмкасцях па вызначаным графіку, усталяваннем заглушак і інш.);

праінфармаваць зацікаўленых асоб аб прынятых рашэннях і плануемых тэрмінах устаранення няспраўнасцяў.

Вызначаны і наступныя гранічныя тэрміны ўстаранення няспраўнасцяў (у сутках):

працяканне даху — 1;

няспраўнасці ў сістэме арганізаванага водаадводу (унутранага вадасцёку — 2, вонкавага вадасцёку — 5);

пашкоджанне балконаў і балконных агароджаў — 1 (з неадкладным агароджваннем небяспечнай зоны);

прамярзанне сцен — у тэхнічна магчымыя тэрміны;

працяканне вокнаў, стыкаў сценавых панэляў — 7;

адслаенне тынкоўкі столі або верхняй часткі сцен, якое пагражае яе абрушэнню — 5 (з неадкладным прыняццем мер бяспекі);

працяканне водаразборных кранаў і змыўных бачкоў — 1;

няспраўнасці аварыйнага характару (трэшчыны і свішчы ў трубаправодах і іх злучэннях, няспраўнасць вентыляў, засавак, засмечванне) сістэм ацяплення, водазабеспячэння, каналізацыі, водапавышальных установак — неадкладна;

няспраўнасці смецціправода — 1;

няспраўнасці агульных электрасетак і абсталявання аварыйнага характару (кароткае замыканне, пагроза пашкоджання токам і г.д.) — неадкладна;

няспраўнасці замочна-перагаворнага ўстройства, кодавых замкоў уваходных дзвярэй у пад'езды — 1;

няспраўнасці ліфта — 1 (з неадкладным спыненнем эксплуатацыі);

парушэнне паветраабмену ў памяшканнях — неадкладна;

працечка газу — неадкладна;

няспраўнасць абсталявання сістэмы газазабеспячэння — 1 (з неадкладным спыненнем эксплуатацыі).

Віктар САВІЦКІ.

«МАГІЛЁЎ, ЦЕРАЗ РЭЧКУ, ЦЕРАЗ МОСТ, АТРЫМАЦЬ МАНІ»

Марыя Паўлаўна Бондарава, лідар пенсіянераў вёскі Забор'е Магілёўскага раёна, называе сябе «землярыйкай» і святкуе разам з кампаніяй сельскіх пенсіянераў заморскі Хэлоўін.

Стараста вёскі Забор'е Марыя Бондарава: «Трэба бачыць у жыцці пазітыўнае».

Там, дзе котка працуе савой

Забор'е знаходзіцца непадалёк ад абласнога цэнтра: толькі крыху больш за дзясятак кіламетраў, але петлі дарог — то асфальтавых, то грунтовых — заблытваюць вандроўніка. І ўрэшце падаецца, што невялікая вёска нібыта вынырвае з часу і прасторы, з заслоны дробнага восеньскага дажджу, на фоне яшчэ зялёных палёў і цёмнага лесу.

А ў вёсцы — адна вуліца з невялікімі хатамі, дзе жывуць 15 чалавек. Усе яны — пенсіянеры, і некаторыя з жыхароў прыязджаюць з горада толькі на цёплы сезон. Пасярод вуліцы пасвіцца адзіны на ўсё Забор'е конь Цэзар, а на страсе аднаго з дамоў хаваецца ад дажджу і блішчыць вачамі белая котка: «працуе савой» — глядзіць удалечыню, нібыта вартаўнік.

Аказваецца, котку завуць Алісачка, і яна — любіміца старасты Забор'я Бондаравай. Сама Марыя Паўлаўна, якая па прафесіі выхавальніца і працуе загадчыцай дзіцячага садка, выглядае не як жыхарка вёскі, а, хутчэй, як настаўніца з горада. Сіні касцюм, белая кашуля, туфлі, строгая прычоска. З традыцыйнага стылю савецкага педагога выбіваецца толькі праваслаўны крыжык на шыі.

Яна сёння жыве адна, хоць сваякі, якіх шмат, часта прыязджаюць да яе ў госці. Дзве сястры, чацвёра дзяцей, 6 унукаў, 7 праўнукаў. Нядаўна з імі гаспадыня адсвяткавала свой 80-гадовы юбілей.

— У мяне, лічы, не было вяселля, потым за працай не было часу на святы, — прызнаецца Марыя Паўлаўна. — А потым вырашыла: калі дажыла да 80 гадоў, трэба гэта адзначыць належным чынам! Было ўрачыста і весела. А галоўны тост: «За жыццё, здароўе і каханне!»

Пасляваеннае манпансье

Над хлявом, дзе кватаруе сабака Джэк, віселі красамоўная шыльда: «Зона абмежаванага доступу, несанкцыянаваны доступ забаронены». Непадалёк — стары партрэт Сталіна, які застаўся гаспадыні ў спадчыну ад мужа, шчырага прыхільніка ўсяго старасавецкага.

У астатнім у старасты Бондаравай звычайны сялянскі двор: склад яркіх гарбузоў, капуста і морква для квашання. Кот Тайсан робіць «наццатую» спробу прарвацца ў цёплую хату, куры клююць кукурузу. Пад гоман радыёпрыёмніка Марыя Паўлаўна хваліцца сёлетнім ураджаем цыбулі — каля паловы тоны! Вялізныя залацістыя вязанкі — упрыгажэнне кухні. Добрай цыбуляй яна забяспечыла ўсіх сваякоў, хоць сама цыбулю не любіць. Ад пасляваеннай маладосці засталася любоў да салодкага: за тым часам адзінымі ласункамі былі кісель і манпансье, цяпер яна любіць карамелькі з чаем.

Жанчына ўзгадвае нялёгкае жыццё: «Мы галадалі і халадалі». З фронту не вярнуўся бацька, памерла ад тыфу маці, а ёй разам з сёстрамі-двайнятамі давялося пайсці ў дзіцячы дом.

— У нас быў цікавы сямейны выпадак, калі двайняты напісалі мне ліст з адрасам: «Магілёў, цераз рэчку, цераз мост, атрымаць Мані». І самы неверагодны цуд, што гэты ліст да мяне дайшоў!

Яна паступіла ў педагагічнае вучылішча і атрымала прафесію, якая ёй спадабалася. Закахалася ў вельмі сімпатычнага хлопца — стрэйшага брата свайго прыяцеля, які вярнуўся з войска. Стары фотаздымак маладой жанчыны з падпісам: «Віценьку ад Машанькі. Успомні парою, калі я гэтага стою. 1952 год». Яна пайшла замуж, пражыла з мужам амаль 30 гадоў, і яе любіла свякроў — за ўмелыя рукі і любоў да працы.

— Я — сапраўдная землярыйка, і таму пасля атрымання пенсіі вярнулася жыць у вёску.

Праца не для «галачкі»

Аднойчы Марыя Паўлаўна стала старастай Забор'я. Яе выбралі людзі, як свайго прадстаўніка, калі рыхтаваўся прыезд цягніка «Клопат». Бондарава тады вельмі ветліва, але даволі цвёрда настаяла на карыснай справе для вёскі, а не на мерапрыемстве «для галачкі». У выніку — ссеклі адно аварыйнае дрэва. Яе новай перамогай стала дарога да вёскі.

— Ваяваць давялося. Выбівалі дарогу і потам, і кроўю, і слязамі, і чым хочаце. Перапіскі шмат, хадзіла па начальніках. Але ж дамаглася!

Потым замест калодзежаў у Забор'і зрабілі калонкі. Цяпер вяскоўцы хочуць станцыю абезжалезвання, каб вада стала лепшай па якасці. Хоць гавораць, што гэта, маўляў, утопія: для некалькіх пенсіянераў нікто не стане выдаткоўваць грошы.

— А я лічу, што і мы заслугоўваем, каб пра нас клапаціліся, — цвёрда гаворыць Марыя Паўлаўна. — Мы — людзі, і ўсё свае жыццё мы аддалі працы на карысць дзяржаве. Трэба, каб і нам было добра.

Цяпер Бондарава пры падтрымцы аднавяскоўцаў вядзе барацьбу за замену слупоў асвятлення і ліквідаванне аварыйных дрэў.

— Мае людзі добрыя і спагадлівыя, — гаворыць пра сяброў-вяскоўцаў Марыя Паўлаўна. — Стараста — гэта не фармальная пасада. Яна сапраўды патрэбна, каб сачыць за парадкам, кантраляваць сітуацыю, каб было да каго звярнуцца па дапамогу і параду ў складанай сітуацыі. Вось я і праявіла актыўнасць. Безумоўна, стараста павінна мець прабіўную сілу, каб дапамагчы людзям.

Беларускі вясковы Хэлоўін

У гэты дзень грамадскасць Забор'я вырашыла адзначыць Хэлоўін. Гасцей сустракае энергічная пляменніца старасты Таццяна Дарошчанка, якая весела называе ўсіх прысутных «дзевачкамі», незалежна ад узросту і, часам, таксама... полу.

— Што мы ведаем пра Хэлоўін, дык што гэта свята, прабачце, для прыдуркаў, — смяюцца вясковыя жанчыны. — Але супраць заморскіх свят не маем нічога супраць. Для нас любое свята — нагода сабрацца. Хоць найлепшыя — гэта нашы, беларускія святы. Але і гэтае добра адзначым.

У куце — холэўінскі нацюрморт у стылі беларускай вёскі. Традыцыйны гарбуз з тварам робіцца за секунды. Абавязковы элемент — усмешка, у суправаджэнні песні пра ўсмешку, якая, без сумненняў, кранецца вашых вачэй. Праўда, забава павінна быць эканомнай: з гарбуза не вымаюць мякаць, таму што трэба яшчэ заўтра кашу зрабіць, а не проста выкінуць цацку.

Гарбуз выдатна глядзіцца на фоне горкага перцу «Агеньчык», які расце ў хаце замест хатніх кветак: маўляў, больш карысны, бо здольны, калі ў разумнай колькасці, любы боршч зрабіць смачнай стравай. І для таго, каб не пакінуў добры настрой (паводле той жа песні), — бутэлька сялянскай настойкі.

Машанька і Віценька: «Успомні парою, калі я гэтага стою».

хірургіяй, у беларускім варыянце — сапраўдная прыгажосць жанчыны ў элегантным узросце.

— Я захавала сваю стройнасць працай, — гаворыць Марыя Паўлаўна. — Усё, у доме і на палетках, люблю сама рабіць, акрамя нейкіх цяжкіх работ — напрыклад, колкі дроў. І яшчэ: для трэніроўкі мазгоў я разгадваю крыжаванкі і сканворды. Вельмі дапамагае!

Яна сапраўды можа даць параду ў любой сферы. Пра выхаванне дзяцей: «Іх трэба сардэчна любіць і шкадаваць, а не муштраваць!» Пра стаўленне да людзей: «Менавіта такім чынам, як ты хочаш, каб ставіліся да цябе, — гэтая старая ісціна актуальная заўсёды». Пра лепшае ў чалавеку: «Я цаню найперш дабрыню, люблю людзей без злосці і зайздрасці». Пра выжыванне ў крызіс: «Трэба планаваць свае жыццё і дабрабыт, карпатліва размяркоўваць сілы і грошы».

І нарэшце, пра стыль жыцця Бондаравай: «Трэба, каб менш было ў жыцці стрэсаў: проста многія рэчы (у тым ліку драбязу і мітусню), не раю прымаць блізка да сэрца. Нават калі навокал усё дрэнна, вучыцеся бачыць пазітыўнае».

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.
Магілёўскі раён.

Хэлоўінскі нацюрморт.

Котка Алісачка вартуе вёску.

«ЗВЯЗДА» — ГЭТА ЛЁС

Калектыў дзякуе за шматгадовую працу рэдактару Уладзіміру Браніслававічу Наркевічу!

Праца журналістаў поўная сюрпрызаў, да іх павінен быць гатовы кожны з нас. І мы гатовыя — ці то нечакана з'ехаць у камандзіроўку, ці хуценька пабегчы на нейкае здарэнне, ці па дарозе прыкмеціць цікавую сітуацыю і ў шараговай падзеі заўважыць тыповыя рысы і падзяліцца сваімі спантаннымі развагамі з іншымі — гатовыя пісаць пра сваю краіну ў любых умовах і пры любых абставінах. Навука, засвоеная кожным з нас ад рэдактара, Уладзіміра Браніслававіча Наркевіча.

Ён навучыў усіх журналістаў «Звязды» штодня працаваць дзеля свайго чытача, які палюбіў і выбраў нашу газету, што выходзіць на роднай беларускай мове. Спадзяёмся, што нашы падпісчыкі, якіх на сённяшні дзень больш за 33 тысячы (а чытачоў і таго больш), выбіралі «Звязду» яшчэ і таму, што бачанне Беларусі, адчуванне значнасці сябе і сваёй працы ў ёй супадала з поглядам нашых аўтараў. Адчуванне агульнай справы — вось што яднае журналістаў «Звязды» сёння. Пачуццё локця, разумненне інтарэсаў калектыву, якому ў спадчыну засталася гераічная гісторыя выдання і багатыя традыцыі. Адным з іх захавальнікаў з'яўляўся Уладзімір Наркевіч, які прыйшоў у газету яшчэ ў 1974 годзе, пасля заканчэння ўніверсітэта, — карэспандэнтам аддзела навукі, ВНУ і школ. Ён аддаў журналістыцы 40 гадоў жыцця, і амаль усе з іх — «Звяздзе». Гэта лёс, які часам вырашае за чалавека, нібыта сапраўды ёсць накананаванасць пэўнай асобе адслужыць пэўны час на пэўным месцы. Больш за 22 гады Уладзімір Наркевіч служыў на пасадзе галоўнага рэдактара «Звязды».

Уладзімір Браніслававіч стаў рэдактарам у няпросты час — у 1989 годзе. Час, калі разбураліся аўтарытэты і губляліся арыенціры. А людзям вельмі былі патрэбны шчырыя словы. Шмат хто з жыхароў краіны тады знайшоў іх у «Звяздзе». З набыццём незалежнасці Беларусі газета на беларускай мове стала нацыянальным уплывовым выданнем. І ў вялікай ступені дзякуючы рэдактару, які выдатна ведаў беларускую мову, адчуваў асаблівасць беларускага менталітэту, разумеў значнасць і адказнасць журналісцкай працы і здолеў стварыць моцны калектыў, які ведае, што значыць «дух «Звязды» і даражыць тым, што закладвалася да нас. Неаднаразова мы віталі на сваіх святах супрацоўнікаў рэдакцыі, якія сышлі на пенсію, у тым ліку з цікавасцю слухалі ўспаміны былых рэдактараў пра тое, як працавалася журналістам раней — і падчас вайны, і пры мірнай адбудове. Повязь «звяздоўскіх» пакаленняў захоўвалася. Уплыў «Звязды» шырыўся, калі нашы супрацоўнікі папаўнялі шэрагі іншых выданняў, ці нават узначальвалі іх — перад вачамі быў прыклад уважлівага і адказнага кіраўніка, сумленнага ў адносінах да справы, інтэлігентнага і шчырага чалавека, які паважліва ставіўся да людзей і спадзяваўся на павагу да сябе.

Хочацца верыць, што традыцыя развіваць, але падтрымліваць сувязі з калегамі будзе захоўвацца: Наркевіч — гэта частка газеты, дзе б яму ні давялося працаваць далей. Таму што лёс выдання перакрыжаваўся з лёсам чалавека амаль на жыццё. І гэта больш, чым праца, якая мае канкрэтную працягласць у часе...

Фота Анатоля КЛЕЩУКА

Любая звяздоўская адметная дата заўсёды пачыналася з наведвання помнікаў, якія людзі паставілі «Звяздзе» і яе супрацоўнікам. На здымку: 9 жніўня 2007 г., калі мы святкавалі свой 90-ы юбілей. Дарэчы, публікацыя здымка рэдактара ў газеце — унікальная з'ява: выключна сціплы чалавек, ён пазбягаў такіх сітуацый. А ўчора газету падпісаў не ён...

— Я зайшоў, каб падзякаваць вам за працу, — усім, хто быў на працоўных месцах, сказаў учора галоўны рэдактар. Пасля паўзы дадаў: — Развітваюся...

І развітаўся. Не пачуўшы, як усе мы дзякуем яму, шаноўнаму галоўнаму!

За ўсё, што ён зрабіў... Для сваёй краіны, для газеты, для шматлікіх яе чытачоў. І для кожнага з нас. Дзякуй, Уладзімір Браніслававіч! Вы для нас — заўсёдны камертон прафесіяналізму і людскасці.

«Звяздоўцы».

Повязь часоў

Шэсць ствалоў як шэсць душ

На месцы расстрэлу дзвюх сем'яў, па тры чалавекі ў кожнай, расце граб з шасцю ствалами

У лесе, які называюць Шчэбрынскім, у раёне вёсак Радванічы і Франапаль Брэсцкага раёна давялося наткнуцца на сціплы абеліск. Цэнтральная шыльда помніка змяшчае наогул вельмі абстрактны тэкст, нешта накшталт: «Бясстрашным і мужным воінам і партызанам». На адваротным баку помніка прымацавана дошка, на якой напісана, што ў лістападзе 1942 года тут быў расстраляны адважны партызанскі разведчык Гаўрылюк Іван Аляксандравіч са сваёй сям'ёй. А літаральна ў 15 метрах ад старога, пафарбаванага ў сіні колер помніка, расце незвычайнае дрэва — граб з шасцю стваламі. Хутчэй за ўсё, у адно сышліся некалькі дрэў, якія потым шчыльна зрасліся камлямі. Сказаць дакладна, як такое адбылося, можа, відаць толькі спецыяліст. Але кожны ствол, нібы нага, абапіраецца на зямлю. А далей, угары, дрэвы трохі разыходзяцца адно ад аднаго і завяршаюцца вялізнай раскошнай шапкай жоўта-зялёнай лістоты. Ёсць нешта спакойна-велічнае ў гэтым грабавым спарышы. Калі я абышла і палічыла ствалы, чамусьці першае, што прыйшло ў галаву: а ці не шэсць душ тут бязвінна загублена?

Сакратар Радваніцкага сельсавета Таццяна Кавалевіч адразу пацвердзіла здагадку: так, у 1942 годзе фашысты расстралялі Гаўрылюка Івана Аляксандравіча, яго жонку і сына, а таксама Белавежу Пятра Фёдаравіча з жонкай і сынам. Таццяна Якаўлеўна перабрала ў памяці ўсіх сталых людзей тутэйшых мясцін і пераліла звярнуцца да Дзмітрыя Пархаца з Малых Радваніч. І не памылілася.

Аказалася, Пархацы былі суседзямі Гаўрылюкоў. Як расказаў Дзмітрый Іванавіч, раней яго бацькі, дзяды жылі ў вёсцы Камяніца, пазней яна называлася Падлессе Камяніцкае. Але пры Польшчы іх родныя мясціны адышлі пад ваенны палігон Войска Польскага. А ўзамен улады выдзелілі выселеным людзям месца пад хутары. Вось Пархацы і пабудаваліся фактычна на ўскрайку лесу. Побач была сядзіба мясцовага ляснічага, якая адначасова з'яўлялася ляснічтвам. Там жыў з сям'ёй Іван Гаўрылюк. З яго сынам Лёнькам ды з Лёшам Белавежам Дзмітрый разам гуляў. Пры гэтым Дзмітрый Іванавіч добра памятае, што ён быў старэйшы з хлопцаў. Лёню і Аляксею на пачатак вайны не споўнілася і дзесяці. Ляснічы Іван Аляксандравіч, несумненна, быў чалавекам адукаваным, у іх доме захоўвалася шмат кніг. І яшчэ, што ўрэзалася ў памяць Дзмітрыя Пархаца, сядзіба-ляснічоўка выглядала надзвычай прыгожа. Драўляная пабудова была выраблена нейкім майстрам з вялікім густам. Нават агароджа з арэшніку ўяўляла сабой маляўнічае відовішча. Недалёка жыў і ляснік Пётр Белавежа.

Навакольныя лясы абумовілі партызанскі рух з самага пачатку вайны. У недалёкіх ад Брэста лясных масівах хаваліся ўсе, хто мог схавацца ад ворага. Спачатку партызаншчына была стыхійнай. Дзмітрый Пархац са сваім бацькам пабач з уласным хлявом сустрэлі старшыню Тэльмінскага сельсавета Івана Салейку з таварышам. Гэтыя людзі адразу падаліся ў лес, бо ведалі, што вораг іх не пашкадуе. Потым уцекачы сталі арганізоўвацца, да іх далучаліся чырвонаармейцы, якія адступалі, цярпелі паражэнне. І паступова навакольныя лясы станавіліся партызанскай базай. Зразумела, што партызаны стараліся кругом займець сваіх людзей. Але ж ніхто не хваліўся падобнымі сувязямі. Вядома, людзі не ведалі, што да ляснічага прыходзяць з атрада па інфармацыю. Не ведалі аж да таго часу, пакуль не адбылася трагедыя...

Калі Дзмітрый Іванавіч пачынае ўспамінаць тыя дні, голас чалавека 1928 года нараджэння робіцца дрыготкім. Бо ўсё гэта ўляпілася ў яго дзіцячую памяць нейкай балючай чорнай плямай. Страх запаў у душу з першага дня вайны. Тады, у першы дзень, ён з хлопцамі-аднагодкамі пагнаў коней на начлег. І на світанні раптам паляцелі самалёты ў бок Брэста. А потым сталі гарэць памежныя заставы з аднаго і другога боку. Хлопчык прыбег дадому, а там — перапалоханыя бацькі. Бацька працаваў дзяжурным на чыгуначнай станцыі, ён прыйшоў і сказаў, што няма ніякай сувязі. І адчай у вачах маці. «Усю вайну, — гаворыць Дзмітрый Іванавіч, — да апошняга яе дня давялося жыць у страху, кожны крок, кожнае слова трэба было вывяраць. Бо жылі пры лесе. Навакольныя вёскі палілі, людзей стралялі. Ніхто не мог дакладна ведаць, што заўтра ён будзе хаця б жывы».

Вельмі шмат розных эпізодаў жыве да гэтай пары ў памяці сталага чалавека. Ну вось, напрыклад: «Маці з бацькам жнуць авёс каля хаты, а я ганю кароў з поля. І на ўскрайку лесу раптам адна карова становіцца ледзь не на дыбкі і як зараве дзікім голасам! Падыходжу бліжэй, а там чалавек ляжыць, мёртвы. Бацька з іншымі мужчынамі пайшлі потым пахаваць невядомага. Дасталі з кішэні яго шэрага пінжака дакументы, там ляжаў польскі пашпарт. Бацька павольна прачытаў: Ставінскі Вітальд, сын Юзэфа, Брэст-над Бугам». Што за чалавек, хто і навошта яго забіў, невядома. Яшчэ адна ахвяра той страшнай вайны... Пакуль жыву, магу паказаць месца, дзе яго тады прыкапалі».

Пра тое, што сталася з Гаўрылюкамі і Белавежамі, Дзмітрый даведаўся ад Аляксандры Данілюк, дзяўчыны, якая прыбірала ў леснічоўцы. Яна прыбегла, як заўсёды, ранкам на працу, а там поўна немцаў са зброяй, з сабакамі. Спачатку схапілі і яе, але распытаўшы, хто такая, дзяўчыну адпусцілі. А іх, Гаўрылюка і Белавежу, іх жонак, сыноў — хлопчыкаў 10-11 гадоў — расстралялі.

Як згадаў былы дырэктар Радваніцкай школы Уладзімір Пятровіч Ласковіч, Івана Гаўрылюка расстралялі асобна ад сям'і, спачатку яго па-зверску катавалі ў камендатуры, а потым, ужо мёртвага, прыцягнулі, прывязаўшы да каня, за шэсць кіламетраў з Падлесся Радваніцкага. І тут ён далучыўся да сям'і, каб пайсці ў вечнасць.

Ці самі карнікі вылічылі Івана Гаўрылюка, ці хто выдаў яго сувязь з партызанамі — ніхто дакладна не ведае. Вядома, што ў адзін міг загубілі дзве сям'і, у тым ліку нявінных жанчын і дзяцей. Недзе ў 70-гады паставілі на месцы іх сядзібаў, спаленых немцамі, сціплы знак памяці. Раней сюды вяла даволі шырокая дарога. Нават раённая мерапрыемствы праводзіліся, прымеркаваныя да памятных дат. Але мяняюцца пакаленні, і памяць паступова зарастае — у прамым сэнсе. Дарога становіцца непрыкметнай. Праўда, помнік даглядае сельсавет, і працаўнікі ляснічтва не забываюць. Але мала хто з маладых жыхароў навакольных сёл ведае, каго тут расстралялі халодным лістападаўскім днём 1942 года. І толькі прырода ўвекавечыла памяць па-свойму. Ствалы стройнага граба цягнуцца высока ў неба, нібы нясуць на сабе душы загінулых.

Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.
Брэсцкі раён.



КАБЫЛУ З ФЕРМЫ ЎВЯЛІ

У Талачынскі раённы аддзел унутраных спраў з адміністрацыі акцыянернага таварыства паведамілі пра тое, што ноччу з фермы, размешчанай у вёсцы Варанцэвічы, увялі кабылу. Шкоду ацанілі ў 3,6 мільёна рублёў.

У міліцыі было ўстаноўлена, што злачынства здзейснілі рабочы гэтай жа гаспадаркі, жыхар вышэйназванай вёскі, і беспрацоўная жанчына, якая жыве ў Шклоўскім раёне Магілёўскай вобласці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

З ГАЗАМ НЕ СПРАВІЎСЯ

У адным з цагляных дамоў у Ветцы 83-гадовы гаспадар на працягу некалькіх хвілін спрабаваў распаліць газавы кацёл на кухні.

Урэшце адбылася імгненная ўспышка газапаветранай сумесі (адначасова расчыніліся і дзверцы топкі), але без наступнага гарэння. Пенсіянера адкінула ўбок, і ён атрымаў траўму галавы. Пацярпелы дастаўлены ў Веткаўскую бальніцу.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

А ЗОЛАТА НЕ ЗНАЙШЛІ

У Пінску пенсіянер зайшоў у пад'езд дома, дзе на яго напаў рабаўнік.

Пацярпелы застаўся без заручальнага пярсцёнка і залатой пяточкі. 30-гадовага рабаўніка затрымалі, але золата падчас вобыску не знайшлі. Апісалі маёмасць рабаўніка, якая пацягнула на 1 400 000 рублёў, а ўкрадзенае золата каштуе 3 мільёны.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Ну і ну!

ПАСТКАЙ СТАЛА... ТАХТА

Жыхарка Слоніма патэлефанавала ў службу выратавання, паведаміўшы, што яе сямігадовы сын пры раскладванні тахты аказаўся заціснуты яе канструктыўнымі элементамі. Ды так, што самастойна вызваліць нагу не ўдалося.

Выратавальнікі ў лічаныя хвіліны прыехалі і вызвалілі хлопчыка з гэтай пасткі, пасля чаго накіравалі на абследаванне ў бальніцу, паведамляе прэс-служба Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

БОЕПРЫПАСЫ ГРУКАТАЛІ...

Гэта было падчас вайны. А сёння ля вёскі Нестановічы ў Акцябрскім раёне, непасрэдна на полі былі знойдзены 11 артылерыйскіх снарадаў, 4 мінамётныя міны, 10 гранат розных мадыфікацый і 24 артылерыйскія запальнікі. Іх знішчылі спецыялісты сапёрна-піратэхнічнай групы Бабруйска.

У Полацкі аддзел унутраных спраў на транспарце 52-гадовая жыхарка вёскі Труды Полацкага раёна, настаўніца мясцовай школы, паведаміла, што ў лесе паблізу вёскі, дзе яна жыве, знайшла снарад. Небяспечная знаходка часоў Вялікай Айчыннай вайны была абясшкоджана групай размініравання.

Ірына АСТАШКЕВІЧ, Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДАПАМАГЧЫ РОДНАЙ ШКОЛЕ — СВЯТОЕ!

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Звычайны восеньскі сюжэт — уборка абляцелай лістоты. Добры гаспадар ніколі не пакіне зямлю непрыбранай перад надыходам зімы. А прыбраўшы сваю, можна дапамагчы і суседу, роднай вуліцы, свайму гораду. Калі любіш, зразумела, тое атачэнне, дзе жывеш, калі цэніш. Але ці часта мы сустракаем гэткія праявы клопату не толькі пра сваё і сябе? Усё-ткі сустракаем. І вось адзін з іх. Максім Шуляк жыве ў Беларучах на Лагойшчыне. Школу скончыў сем гадоў таму. Дарэчы тую самую школу, у якой колісь вучыўся беларускі пясняр Янка Купала. Цяпер працуе ў Калядзічах на аўтасэрвісе. Калі наступае гэткая восеньская пара і настаўнікі школы звяртаюцца па дапамогу, Максім заводзіць свой уласны трактар і едзе да школы. На школьным двары дзеці ўжо скончылі працаваць і яму застаецца толькі запоўніць смеццем трактарны кузаў. Праца не цяжкая і не такая ўжо доўгая. А памяць за зробленае — і доўгая, і ўдзячная.

Крымінал, здарэнні

МАЛАДАЯ СЯМ'Я З ДЗІЦЕМ ЗАГІНУЛА НА ПАЖАРЫ

Пра загаранне жылога дома ў вёсцы Яковічы маладзечанскім выратавальнікам паведамілі раніцай.

Шыферны дах ужо абрынуўся, дом знутры гарыць адкрытым полымем, побач агонь ахапіў аўтамабіль «Форд Гэлаксі» — такі малюнак убачылі на месцы падраздзяленні МНС. Са слоў суседзяў, да з'яўлення апошніх адбыўся выбух газавага балона. У доме магла знаходзіцца маладая сям'я з дзіцем ва ўзросце паўтара года. Яна пражывала тут каля двух тыдняў, а гаспадыня дома памерла дзесяць гадоў таму.

Пры тушэнні пажару ў яго ачагу знайшлі ўсіх траіх: спадчынніка гаспадыні жылля — грамадзяніна 1974 года нараджэння, яго сужыцельку 1990 года нараджэння, якая была ў водпуску па доглядзе дзіцяці, і сына загінулай 2010 года нараджэння... Мяркуецца, што прычынай трагедыі стала няправільная канструкцыя пячнога ацяплення: да прыезду маладой сям'і ў доме ніхто не пражываў, а печ, як высветлілася, патрабавала рамонту.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВОЛЮ ЗА МЕТАЛ АДДАДУЦЬ

З тэрыторыі прыватнага прадпрыемства ў Гомелі за ноч невядомы выкраў 18 слупоў і 53 пліты. 29-гадовага беспрацоўнага жыхара абласнога цэнтра, які абвінавачваецца ў крадзяжы, міліцыя знайшла праз тыдзень пасля здарэння, але каштоўную «здабычу» ён паспеў рэалізаваць. Грамадзяніна, які выцягнуў з чужога двара ў вёсцы Карма Добрушскага раёна 12 металічных рашотак (прычым кожная з іх важыць 50 кг) і 6 металічных пліт, пакуль праваахоўнікі шукаюць. А вось выкрадальнікаў 19 алюмініевых лістоў з тэрыторыі прыватнага прадпрыемства «Алкапак» у Гомелі ўжо затрымалі. Імі аказаліся два рабочыя гэтага прадпрыемства.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПРЫГОДЫ ІТАЛЬЯНЦА Ў ПАСТАВАХ

У Паставах у зале гульнявых аўтаматаў у грамадзяніна Італіі ўкралі валюту і дзве банкаўскія карткі.

Па дапамогу гэты інваземец звярнуўся ў Пастаўскі РАУС. Ён расказаў, што прыкладна а палове трэцяй гадзіны ночы ў зале гульнявых аўтаматаў нехта з кішэні пакінутай ім без нагляду курткі скраў кашалёк. Унутры кашалька былі 550 еўра, 20 долараў ЗША і дзве банкаўскія карткі. Агульную шкоду ў міліцыі ацанілі ў 6,7 мільёна беларускіх рублёў.

Злачынства ўчыніў беспрацоўны, раней судзімы за крадзяжы мясцовы жыхар.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НІЧОГА СВЯТОГА

На гарадскіх могілках у Бялынічах пагаспадарылі вандалы. Людзі жахнуліся, калі ўбачылі паваленыя помнікі, паламаныя крыжы, патаптаныя магілы. Такое адбылося ўпершыню на памяці жыхароў раённага цэнтра. Міліцыя падлічыла: пашкоджана 28 помнікаў, 7 з якіх немагчыма аднавіць. Адно з разгромленых пахаванняў, дарэчы, належыць 12-гадоваму хлопчыку. Распачата крымінальная справа, вядзецца расследаванне.

Алена КАЗЛОВА.

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в деревнях Мглё, Избицкое, Прудище и аг. Юрьево Усяжского сельского исполнительного комитета Смолевичского района Минской области

1	**Форма проведения аукциона**	Открытый
2	**Дата, время и место проведения аукциона**	12 декабря 2011 года, в 15.00, пос. Усяж, ул. Комсомольская, 10 Усяжский сельисполком, кабинет председателя
3	**Продавец и его адрес**	Усяжский сельский исполнительный комитет, пос. Усяж, ул. Комсомольская, 10
4	**Земельный участок, его кадастровый номер и адрес**	Лот № 1 – земельный участок площадью 0,1502 га, № 624885602801000100 в д. Избицкое. Лот № 2 – земельный участок площадью 0,1899 га, № 624885605201000058 в д. Прудище. Лот № 3 – земельный участок площадью 0,1843 га, № 624885610501000274 в аг. Юрьево. Лот № 4 – земельный участок площадью 0,1507 га, № 624886001101000142 в д. Мглё, ул. Жодинская.
5	**Условия продажи**	Без изменения целевого назначения
6	**Целевое назначение земельного участка**	Для строительства и обслуживания жилого дома
7	**Начальная (стартовая) цена**	Лот № 1 – 23 874 290 рублей Лот № 2 – 14 204 520 рублей Лот № 3 – 18 145 290 рублей Лот № 4 – 30 949 350 рублей
8	**Условия аукциона**	- продажа по цене не ниже начальной; - участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь
9	**Наличие инженерной инфраструктуры**	д. Прудище, Избицкое – электроснабжение; аг. Юрьево – водоснабжение, электроснабжение; д. Мглё – газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение
10	**Условия оплаты**	Безналичный расчет в течение 5-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона
11	**Сумма задатка и реквизиты продавца**	10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3604627110007 ЦБУ 621 г. Смолевичи филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок»)
12	**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками**	Каждая среда в 10.00
13	**Окончательный срок приема документов**	06 декабря 2011 года в 17.00
14	**Контактный телефон**	8 (01776) 67 131, 67 288; 55 342

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

Кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск № 43 (705)
аддзел рэкламы
287 17 79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ЗВЯЗДА — КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЫЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Рухавік ад а/м «Пежо-4», 2002 г.в., 2,2, бензін.
Тэл. 8 029 5853700.

❒ А/м «Форд Эскорт» 1994 г.в., хэтчбэк, танна, за бел. рублі.
Тэл. МТС 7644291, Вел. 3634095.

❒ Т-40 АМ з дакументамі; а/м «Фольксваген Венга», 1995 г.в., бензін, бензін, 1,8 см³.
Тэл. 8 029 9651517.

❒ Кватэра 2-пакаёвая, 3/5, 35 км ад Мінска, 47х27х9, Станькава Дзяржынскага раёна. Усе выгоды.
Тэл. 8 029 8540099.

ПАСАЖЫРСКІ ПЕРАПАЛОХ

У Магілёве маршрутная «ГАЗель» дагнала МАЗ.

ДТЗ адбылося на вуліцы Астроўскага ўдзень 4 лістапада. Аўтамабілі рухаліся ў спадарожным напрамку. У выніку сутыкнення пацярпеў 52-гадовы пасажыр маршрутнага таксі, які ехаў на пярэднім сядзенні: ён быў шпіталізаваны з закрытай чэрапна-мазгавой траўмай і ўдарам грудзіны. У астатніх — сінякі і спалох. Прычынай сутыкнення магла стаць, паводле папярэдняй інфармацыі, няўважлівасць вадзіцеля маршруткі.

Фота Магілёўскай ДАІ.

Алена КАЗЛОВА.

ПРИГЛАШАЕМ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В АУКЦИОНЕ

Научно-производственное республиканское унитарное предприятие «КБТЭМ-ОМО»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже электроэрозионного прошивочного станка «OPTIMAT-515» (инв. № 4039).

Начальная цена с НДС — **168 866 400 руб.** (в том числе НДС 28 144 400 руб.). Шаг аукциона **5%**. Задаток **10%** от начальной цены объекта перечисляется на р/с 3012104844016 Региональная Дирекция № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 100104965, Научно-производственное республиканское унитарное предприятие «КБТЭМ-ОМО».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10 дней** после проведения аукциона. Оплата за станок производится в течение **10 (десяти)** банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **09.12.2011 в 14.00** по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 2. Заявление на участие и необходимые документы принимаются **по 09.12.2011 до 10.00** по указанному адресу.

Тел./факс: (8017) 223 36 64, e-mail: kbtem.tools@gmail.com.

Более подробную информацию можно узнать на сайте **www.kb-omo.by.**

УНП 100104965

КОЛЬКІ МОЎ ТЫ ВЕДАЕШ, СТОЛЬКІ РАЗОЎ ТЫ І ЧАЛАВЕК?

НЕ сакрэт, што з выпускнікоў савецкай школы больш-менш прымальным валоданнем замежнай мовы маглі пахваліцца толькі адзінкі. Таму для многіх беларусаў авалоданне нават адной замежнай мовай па-ранейшаму расцэньваецца як своеасаблівая перамога над сабой і сваім школьным мінулым. Аднак у бліжэйшыя гады сітуацыя павінна карэнным чынам змяніцца. Перад беларускай сістэмай адукацыі пастаўлена канкрэтная задача, ад якой, без перабольшання, залежыць развіццё нашай краіны: кожны выпускнік на выхадзе са школы павінен свабодна размаўляць на адной з замежных моў. У 2012/2013 навучальным годзе ўсім выпускнікам агульнаадукацыйных устаноў упершыню давядзецца здаваць абавязковы экзамен па замежнай мове ў вуснай форме. Ці вядомы ўжо фармат будучага экзамену? Як рыхтуецца школа да вуснага экзамену па праверцы моўнай кампетэнцыі навучэнцаў? Ці прынесла плён з'яўленне ў школьным раскладзе дадатковай гадзіны на вывучэнне замежнай мовы і дзяленне школьнікаў на тры падгрупы? Ці дастаткова ў школе кваліфікаваных кадраў? Якія мовы трэба выкладаць у школах, каб захаваць інтарэсы не толькі вучняў і іх бацькоў, але і дзяржаўныя інтарэсы? Гэтыя і многія іншыя пытанні аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў калегіі Міністэрства адукацыі, прысвечанай якасці арганізацыі адукацыйнага працэсу па замежных мовах у агульнаадукацыйных установах.

На думку **рэктара Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Наталлі БАРАНАВАЙ,** рашэнне аб увядзенні ў школе абавязковага вуснага экзамену па замежнай мове стала магутным знешнім стымулам для школьнікаў і змяніла прыярытэты і акцэнты ў рабоце настаўніка на ўроку. Сёння аб'ёмы вучэбнага часу, які адводзіцца на авалоданне замежнай мовай у беларускіх школах, і ўмовы арганізацыі ўрока супастаўныя з еўрапейскімі. З дабаўленнем яшчэ адной гадзіны і дзяленнем класаў на малаколькасныя падгрупы былі створаны ўмовы для больш глыбокага засваення вучэбнага матэрыялу. Таму цяпер толькі ад настаўнікаў залежыць, як яны гэтым часам будуць распараджацца. Калі ўрок будзе праходзіць у выглядзе маналогу настаўніка, то пастаўленай мэты — развіцця ў школьнікаў гутарковых навыкаў — немагчыма будзе дабіцца. Для чаго было прынята рашэнне аб дзяленні класаў на тры групы — ад 6 да 10 чалавек? Каб павялічыць час для непасрэдных стасункаў настаўніка з кожным вучнем у групе.

— Аднак далёка не ўсе кіраўнікі ўстаноў адукацыі выконваюць нарматыўныя патрабаванні, — падкрэсліў у сваім выступленні **намеснік міністра адукацыі Казімір ФАРЫНО.**

— Калі раней галоўны акцэнт на ўроках замежнай мовы рабіўся на работу з тэкстамі (школьнікаў вучылі чытаць, перакладаць тэкст са слоўнікамі), шмат часу адводзілася таксама на ўроках вывучэнню замежнай граматыкі, то цяпер настаўнікаў прымусілі павярнуцца да камунікатыўных тэхналогій навучання, — падзялілася сваімі думкамі Наталля Баранава. — І хоць не ва ўсіх школах назіраюцца зрушэнні ў гэтым плане, не ўсе настаўнікі разумеюць да канца, што азначае камунікатыўнасць у навучанні замежным мовам, і яшчэ хапае педагогаў, якія амаль нічога не змянілі у сваёй рабоце, але пачатак руху наперад пакладзены. У краіне пачаў фарміравацца банк камунікатыўных тэхналогій навучання. Толькі нашымі выкладчыкамі было распрацавана 80 дыдактычных сцэнарыяў урокаў для 5-6 класаў. У гэтым годзе яны супрацоўнічаюць з 10 школьнымі настаўнікамі і падрыхтавалі зараз яшчэ 32 ўзоры урокаў, а да канца года змогуць прапанаваць яшчэ 56 урокаў для вучняў 7-х і 8-х класаў. Акрамя таго, нашы спецыялісты (13 чалавек) упершыню падключыліся да распрацоўкі электронных дыдактычных матэрыялаў для школы і стварылі лексіка-граматычныя практыкумы па англійскай, французскай, нямецкай і іспанскай мовах.

Наталля Баранава паведаміла членам калегіі, што на базе Лінгвапарка, які ствараецца зараз у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце, плануецца адкрыць Цэнтр распрацоўкі інавацыйных дыдактычных матэрыялаў. Там будуць вывучацца такія важныя пытанні, напрыклад, як меры па мінімізацыі наступстваў вывучэння замежнай мовы ў штучным моўным асяроддзі, будзе весціся работа над тэхналогіямі навучання, якія дазваляюць адразу думаць на замежнай мове, а не перакладаць свае думкі з роднай на замежную мову. Агульнавядома, што для таго, каб пачаць размаўляць на замежнай мове, ёй трэба пастаянна карыстацца, неабходна пастаянна падтрымліваць моўныя навыкі, але ў Беларусі адсутнічаюць дадатковыя магчымасці пры вывучэнні замежнай мовы. У сям'і замежная мова не гучыць, жыццёвыя сітуацыі, у якіх бы шліфаваліся моўныя навыкі, для большасці з нас таксама вялікая рэдкасць. Менавіта па гэтай прычыне падчас работы над новай канцэпцыяй вывучэння замежных моў у школе вялася размова аб стварэнні адпаведнага моўнага асяроддзя: адкрыцця спецыяльнага вучэбнага тэлеканала, выпуску дзіцячых фільмаў на замежных мовах, выдання арыгінальных, але адаптаваных да магчымасцяў школьнікаў дзіцячых кніжак.

У Лінгвапарку будуць таксама функцыянаваць лексікаграфічны цэнтр, лабараторыя сінтэзу маўлення, дзе будуць стварацца вучэбныя матэрыялы для асоб з парушэннямі зроку, даведачна-кансультацыйная служба і шэраг іншых адукацыйных цэнтраў і лабараторый.

«І ўсё ж такі, які з фактараў мае вырашальнае значэнне пры засваенні школьнікамі гутарковай замежнай мовы: кадры, вучэбна-метадычнае забеспячэнне, тэхнічнае забеспячэнне працэсу навучання ці ўнутраная матывацыя школьнікаў?», — пацікавіўся ў выступоўцаў міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ.

— Адназначна патрэбныя кваліфікаваныя педагагічныя кадры, — упэўнена адказаў Казімір Фарыно. — Ні лінгафонныя кабінеты, ні інтэрактыўныя дошкі, ні аўдыясродкі на электронных носьбітах, ні камп'ютарная тэхніка не дапамогуць, калі настаўнік не будзе размаўляць з дзецьмі на ўроку. Менавіта настаўнік з'яўляецца ключом да павышэння якасці лінгвістычнага навучання. Аднак, на жаль, сёння далёка не кожны настаўнік з'яўляецца ўзорам правільнага маўлення.

Трэба мець таксама на ўвазе, што, калі нейкі час таму ў школах быў востры дэфіцыт кадраў, настаўнікаў замежнай мовы пачалі рыхтаваць на курсах перападрыхтоўкі — змянялі іх профіль. Гэта была вымушаная неабходнасць, аднак, на жаль, і сёння шырока распаўсюджана меркаванне, што для работы ў пачатковай школе ці з кантынгентам дашкольных устаноў настаўніку зусім не абавязкова добра валодаць замежнай мовай. Маўляў, не той узровень выкладання дысцыпліны. Аднак для таго, каб распачынаць навучанне, патрэбна вялікае педагагічнае майстэрства. Калі ўдасца зацікавіць дзіця, захапіць яго замежнай мовай, гэта будзе ўжо палова справы...

На думку Наталлі Баранавай, школам патрабуецца настаўнік новага пакалення. Настаўнік, які павінен навучыць дзяцей гутарковым нормам замежнай мовы, перш за ўсё сам павінен валодаць гэтымі нормамі, павінен добра засвоіць методыку навучання пад кіраўніцтвам вопытных педагогаў яшчэ ў студэнцкія гады, пакуль у яго не сфарміраваліся непажаданыя стэрэатыпы дзейнасці. Настаўніку новага пакалення патрабуецца разнапланавая падтрымка. Аднак усе гэтыя задачы рашыць будзе няпроста:

Настаўнік, які павінен навучыць дзяцей гутарковым нормам замежнай мовы, перш за ўсё сам павінен валодаць гэтымі нормамі. Аднак сёння далёка не кожны настаўнік з'яўляецца ўзорам правільнага маўлення...

— **Наперадзе ВНУ чакае аптымізацыя тэрмінаў і структуры падрыхтоўкі будучых педагагічных кадраў. Неабходна будзе вырашыць найскладанейшы комплекс задач: мы да іх рашэння яшчэ толькі дакрануліся, але ўжо ўбачылі і адчулі, што дзейнічаць чыста механічна (дзесьці штосьці скараціць, ліквідаваць дубліраванне) не атрымаецца. Трэба будзе сур'ёзна думаць, каб быць упэўненымі, што мы і сапраўды аптымізуем адукацыйны працэс.** Многае будзе залежаць і ад таго, ці атрымаецца вырашыць праблему падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі для ВНУ. Сутнасць гэтай праблемы ў абмежаванай колькасці патэнцыяльных навуковых кіраўнікоў і практычнай адсутнасці неабходных навуковых школ у рэгіёнах.

Сёння падрыхтоўка педагагічных кадраў па замежных мовах ажыццяўляецца ў 5 установах сярэдняй спецыяльнай адукацыі і ў 11 ВНУ. Казімір Фарыно паведаміў, што на 58 кафедрах ВНУ працуюць 1186 чалавек. Аднак працэнт выкладчыкаў з вучонымі ступенямі і (ці) званнямі ў дзесяці ВНУ вагаецца ад 4-х да 24-х. У Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце гэты паказчык складае 38 працэнтаў. А ў некаторых ВНУ ёсць кафедры, на якіх увогуле няма выкладчыкаў з вучонымі ступенямі і званнямі.

Наталля Баранава ўпэўнена, што для таго, каб падтрымліваць уласны ўзровень прафесійнай кампетэнтнасці, кожны педагог павінен мець магчымасць перыядычна павышаць сваю кваліфікацыю, паколькі мова школьнага настаўніка «псуецца», калі ён размаўляе на ёй толькі ў сценах школы са сваімі вучнямі. Моўная практыка мае для педагогаў выключнае значэнне:

— Сёння для нас вельмі важна мець вялікую колькасць курсаў, прызначаных для розных катэгорый педагогаў у залежнасці ад іх досведу, месца працы, патрэб і, калі жадаеце, магчымасцяў. А для таго, каб распрацаваць такія курсы, трэба мець дакладную карціну якаснага складу настаўніцкіх кадраў у школе, выкладчыцкіх кадраў — у ВНУ і ў іншых звёнах сістэмы адукацыі. За 2010—2011 гады ў інстытуце павышэння кваліфікацыі Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта павысілі сваю кваліфікацыю 725 настаўнікаў, 532 выкладчыкі ВНУ, 63 выкладчыкі ССНУ, а таксама 3 супрацоўнікі метадычных службаў. Самымі запатрабаванымі адукацыйнымі праграмамі аказаліся тыя, што былі распрацаваны пад канкрэтны заказ асобных устаноў адукацыі. Найбольш шчыльна на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі мы працуем са школамі Мінска, на вузаўскім — з БДУ і Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэтам. А рэгіянальныя ВНУ ў найменшай ступені праяўляюць зацікаўленасць у павышэнні кваліфікацыі на нашай базе. Тут ёсць над чым задумацца. Можна меркаваць, што і іншыя інстытуты павышэння кваліфікацыі і развіцця адукацыі ўкаранялі новыя формы і, магчыма, змест навучання. І ўсе ж такі, **калі паглядзець у цэлым на цяперашні стан сістэмы павышэння кваліфікацыі, то трэба прызнаць, што, па водгуках настаўнікаў, яна пакуль задавальняе іх не ў поўнай ступені. Для ўсіх нас вельмі важна мець вычарпальны адказ на пытанне «чаму?».**

Яшчэ адна праблема, на якой спыніўся Казімір Фарыно, — гэта дыверсіфікацыя моўнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь. Сёння ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі абсалютная большасць навучэнцаў вывучае англійскую мову — 76,3 працэнта ад агульнага кантынгенту, нямецкую — 19 працэнтаў, французскую — толькі 3,9 працэнта, іспанскую — 0,7 працэнта і кітайскую мову — усяго 201 чалавек або 0,03 працэнта.

Казімір Фарыно прызнаўся, што прадстаўнікі пасольстваў Германіі і Францыі вельмі занепакоены такім становішчам спраў. Яны ўжо былі на прыёме ў Міністэрстве адукацыі, дзе паведамілі, што гатовы ўкладваць сродкі ў замацаванне пазіцый нямецкай і французскай моў у нашай краіне, у арганізацыю стажыровак для нашых выкладчыкаў.

Між іншым, еўрапейская моўная палітыка сёння зыходзіць з таго, што кожны дарослы адукаваны чалавек павінен валодаць як мінімум дзвюма, а лепш — трыма замежнымі мовамі. Адной з іх абавязкова павінна быць англійская мова, другой — мова, запатрабаваная чалавекам з-за прафесійных і жыццёвых абставін, і трэцяя — нейкая рэгіянальная мова. Для беларуса гэта могуць быць англійская, нямецкая і польская ці англійская, нямецкая і літоўская мовы. Веданнем англійскай мовы ў Еўропе ўжо нікога не здзівіш — гэта, хутчэй, норма, чым эксклюзіў. Але для беларусаў свабоднае валоданне нават адной замежнай мовай — пакуль што раскоша...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Валерий Владимирович СЕЛЯВКО (25.04.1958 — 07.11.2011)

7 ноября ушел из жизни Валерий Владимирович СЕЛЯВКО: советник правления ОАО «Белгазпромбанк» и один из основателей банка.

При активном участии Валерия Владимировича Белгазпромбанк стал одним из крупнейших банков страны, заслужившим признание наиболее престижных международных финансовых организаций. Валерий Владимирович обладал стратегическим мышлением, ясным и четким видением развития банка. В.В. Селявко принадлежит соавторство названия ОАО и нынешнего логотипа банка.

В одном из последних интервью для корпоративного журнала «Банк.NOTE» Валерий Владимирович сказал:

— В Библии сказано: «Тому дому не устоять, который разделился внутри себя». Это и было моей целью – не допустить внутреннего разделения. Сейчас, мне кажется, мы этого добились в полной мере, и коллектив, который сложился, обладает огромным потенциалом саморазвития. Мы учимся сами и учим других. Но самое главное – мы поддерживаем друг друга.

Коллектив Белгазпромбанка приносит искренние соболезнования родным и близким Валерия Владимировича Селявко и скорбит вместе с ними.

Прощание с Валерием Селявко состоится 9 ноября 2011 года с 9.00 до 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 12.

Коллектив ОАО «Белгазпромбанк».

ЛЮДЗІ НАСТОЙВАЮЦЬ НА ДАБРАЎПАРАДКАВАННІ

Жыхары Магілёва сёлета накіравалі ў гарвыканкам каля 1,5 тысячы зваротаў. У мэрыі адзначаюць, што патрабавальнасць заяўнікаў павялічваецца: цяпер скаржнікі часта даходзяць да судоў, што раней было рэдкасцю.

Шмат зваротаў паступіла наконт нездавальняючага стану дамоў і дваравых тэрыторый, павольных тэмпаў рамонту. Людзі сталі заўважаць, што ў абласным цэнтры трэба больш займацца добраўпарадкаваннем. Кіраўніцтва Магілёва заўважае, што да грошай, якія выдаткоўваюцца на навядзенне парадку, рамонты двароў і дамоў, дарог і тратуараў, трэба ставіцца пагаспадарску і даваць справаздачу за кожны рубель.

Алена КАЗЛОВА.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Многоквартирный жилой дом в районе пересечения ул. Слободской – ул. Космонавтов

Информация о застройщике

Застройщик – Общество с дополнительной ответственностью «МакроИнжиниринг», зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 31 марта 2009 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191239047.

Адрес застройщика:

220018, г. Минск, ул. Одоевского, 129, 1этаж, а/я 247 (юридический адрес).

220037, г. Минск, пер. Козлова, 7Б, телефон 299 57 53, факс 210 58 22 (фактический адрес).

Режим работы: понедельник – пятница с 9.00 до 18.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение предыдущих трех лет предприятием строительство не осуществлялось.

Информация о проекте

Цель строительства – реализация инвестиционного проекта по строительству многоквартирного жилого дома в районе пересечения ул. Слободской – ул. Космонавтов в г. Минске.

Строящийся жилой дом расположен в районе примыкания ул. Космонавтов к ул. Слободской в м-не Малиновка-7 Московского р-на г. Минска в зоне многоквартирной жилой застройки. С восточной стороны расположены пожарное депо, Юго-Западная подстанция и банно-оздоровительный комплекс. С северной, северо-западной и западной сторон расположена многоэтажная жилая застройка. С южной и юго-западной сторон расположен ГСК и Минская кольцевая автодорога.

Площадь участка застройки – 0,44 га.

Характеристика объекта долевого строительства

Генеральный план предусматривает размещение на территории строительства, помимо жилого дома: отдельностоящей повысительной водопроводной насосной станции, парковки, парковки для инвалидов, площадки для сбора мусора, площадки для чистки и сушки домашних вещей, благоустроенной детской площадки, зоны для отдыха со скамейками и парковым оборудованием. Озеленение участка предусматривает декоративное оформление входных групп зданий, прилегающих территорий, озеленение дворовых территорий и площадок, а также восстановление растительного слоя после строительных работ.

Архитектурно-планировочные и конструктивные решения

Жилой дом – 19-этажный, односекционный, каркасного типа с заполнением стен каменной кладкой из блоков и дополнительным наружным утеплением минераловатными плитами толщиной 120 мм с последующей штукатуркой «под шубу». Перегородки – из ячеистого бетона толщиной 100 мм и кирпича толщиной 120 мм (в санузлах и ванных комнатах).

Окна и балконные двери из ПВХ профиля с теплыми двухкамерными стеклопакетами, лоджии – остекленные.

На каждом этаже предусмотрено размещение 7-ми квартир (1-1-2-2-2-3). Общая площадь квартир составляет 7 539,62 кв.м. Всего 133 (сто тридцать три) квартиры, в том числе:

1-комнатных 57 (площади квартир 40,7 м²; 46,19 м²; 46,22 м²; 46,31 м²; 46,35 м²);

2-комнатных 58 (площади квартир 59,4 м²; 59,8 м²; 60,5 м²; 60,7 м²; 60,8 м²; 61,0 м²);

3-комнатных 18 (площади квартир 78,41 м²; 78,59 м²).

В подвале размещается группа помещений для товарищества собственников с отдельным входом.

Помещения торгового или административно-торгового назначения (встроенные или пристроенные) в жилом доме отсутствуют.

Инженерные системы

Лифты скоростные, грузоподъемностью 400 кг и 630 кг. Один из лифтов предусмотрен с пожарным режимом – ППП.

Вход в жилую часть оборудован металлическими дверями с охранно-переговорным устройством и системой ***домофонной связи*** с каждой квартирой.

Электроснабжение выполняется с учетом современных норм с 3-м (заземляющим) проводником и установкой приборов защитного отключения. В соответствии с нормами также предусматривается АСКУЭ (автоматизированная система коллективного учета электроэнергии), предназначенная для организации централизованного сбора информации о потреблении электроэнергии бытовыми и общедомовыми потребителями, отслеживания баланса потребления электроэнергии в рамках дома.

Система телевидения предусматривает подачу ТВ-сигнала к объекту посредством современных систем передачи по оптико-волоконному кабелю и позволит в дальнейшем перейти на цифровое телевидение.

Система телефонной связи выполнена с использованием современных технологий, посредством полностью цифрового принципа передачи информации по оптико-волоконному кабелю непосредственно от коммуникационной компании до абонента, что даст возможность обеспечить абонентов дополнительными услугами (высокоскоростной интернет, цифровая телефонная связь, цифровое телевидение) по той же кабельной линии.

Система водоснабжения монтируется из стальных водогазопроводных оцинкованных труб, а стояки и подводки к приборам – из полипропиленовых. Предусматривается установка унитазов со смывными бачками и мест для подключения умывальников, моек, ванн и стиральных машин.

Стояки и поквартирная разводка ***системы бытовой канализации*** выполняются из полипропиленовых канализационных труб.

Противопожарными мероприятиями предусмотрена установка 3-х пожарных кранов Ф50 в общих коридорах жилого дома, устройство автоматической системы пожарной сигнализации и оповещения о пожаре, системы дымоудаления и подпора воздуха.

Теплоснабжение жилого дома осуществляется централизованно – от наружных тепловых сетей через автоматизированный ИТП. В здании предусматривается двухтрубная система отопления с нижней разводкой. В качестве нагревательных приборов в жилых помещениях используются стальные панельные радиаторы. Предусматривается поквартирный учет с применением счетчиков тепла, устанавливаемых в лифтовом холле для каждой квартиры отдельно. Регулирование теплоотдачи радиаторов осуществляется посредством термостатических вентилей с предварительной настройкой, устанавливаемых на отопительных приборах.

Строительная готовность жилых помещений при передаче дольщику:

- улучшенная штукатурка стен, бетонная подготовка под полы, гидроизоляция полов в санузлах, без окраски стен и потолков, устройства чистых полов и внутренних дверей;
- электроснабжение – поквартирная черновая разводка электропроводки с установкой электросчетчиков и выводом на кухне для подключения электроплиты;
- горячее и холодное водоснабжение - стояки с приборами учета, установка и подключение одного унитаза на квартиру;
- канализация – стояки с поквартирной разводкой трубопроводов к приборам;
- отопление – водяное поквартирное, готовность стопроцентная;
- вентиляция – вытяжная естественная;
- телефонизация, телевидение – ввод в каждую квартиру до розетки или разветвителя;
- радиофикация – готовность стопроцентная.

Строительная готовность помещений общего пользования (тамбур, вестибюль, колясочная, лифтовые холлы, лестничные клетки, коридоры и др.) – стопроцентная чистовая отделка.

У застройщика имеются в наличии:

- Разрешение Инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску на строительство объекта № 2-203Ж-042/11 от 25.10.2011 г.
- Положительное заключение по проектной документации ДРУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» № 758-60/11 от 31.08.2011 г.
- Решение Минского городского исполнительного комитета № 1765 от 30.06.2011 г.
- Решение Минского городского исполнительного комитета № 2828 от 28.09.2011 г.
- Свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации земельного участка № 500/1239-1390 от 02.08.2011 г.
- Контракт на строительство № 2 от 1 октября 2011 г. с Иностранным частным унитарным строительным предприятием «Атлант-М Строй» Компании «Интеркар Холдинг ЛЛС».
- Заключение Комитета архитектуры и градостроительства Мингорисполкома от 03.08.2011 г. № 08-03/140М.
- Акт выбора земельного участка, утвержденный председателем Минского городского исполнительного комитета 6.09.2010 г.
- Заключение Минского городского центра гигиены и эпидемиологии от 12.10.2010 г. № 35-16/6409.
- Согласование Комитета природных ресурсов и охраны окружающей среды Республики Беларусь от 24.08.2010 г. № 5-5-1/358.

Цена объекта долевого строительства

В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 396 от 15.06.2006 г. (с изменениями) «О долевом строительстве многоквартирных жилых домов» предлагаются жилые помещения:

- для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, стоимостью 1003 (тысяча три) доллара США за 1 кв.м;
- для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, стоимостью 1224 (тысяча двести двадцать четыре) доллара США за 1 кв.м.

Оплата производится по курсу НБ РБ. Стоимость неизменна до окончания строительства.

Сроки строительства

Нормативный срок завершения работ – 1 квартал 2013 г.

Общее имущество, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков

Межквартирные коридоры, лестничные клетки, лифты, лифтовые и иные шахты, крыша, технический этаж и подвал, другие места общего пользования, несущие, ограждающие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Ознакомление дольщиков

Ознакомление дольщиков с объектом долевого строительства, предлагаемым к заключению договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется в офисе застройщика – ОДО «МакроИнжиниринг» по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Козлова, 7Б, правое крыло, 2 этаж; режим работы по вопросам долевого строительства: пн-пт 9.00 – 18.00, иное время по предварительной договоренности по телефонам: 8 (017) 299 57 53; 8 (029) 165 66 67; 8 (029) 553 66 67.

Интернет-сайт ОДО «МакроИнжиниринг»: www.makroinginiring.by.

С ходом строительства объекта можно ознакомиться по согласованию с застройщиком.

ШТО ПАТРЭБНА СТАРЫМ?

СВАІМІ «дзіўнымі» паводзінамі «цяжкі стары» дае зразумець нам, яго сваякам і проста навакольным, што яму дрэнна, што не ўсе яго патрэбы задаволены. Таму старых не варта асуджаць, а неабходна дапамагчы ім набыць душэўную раўнавагу. А для гэтага трэба ведаць, напрыклад, якія псіхічныя расстройствы і захворванні ўласцівыя сталаму веку.

СТРАХ. У жанчын ва ўзросце пасля 60 гадоў мацней за ўсё праяўляецца страх перад адзінотай, хваробамі, дрэннымі людзьмі і смерцю. Мужчыны ва ўзросце 60-70 гадоў часцей перажываюць страх смерці, страх перад чужой ці ўласнай агрэсіяй, уласнай бездапаможнасцю, лёсам, учыненымі памылкамі, ім уласцівы і неспакой перад будучыняй.

ТРЫВОЖНАСЦЬ. У жанчын вышэй узровень адкрытай, знешняй трывожнасці. Мужчыны больш стрыманыя ў выражэнні трывожных пачуццяў. Пажылыя мужчыны з высокім узроўнем трывожнасці — часцей удаўцы. Іх вельмі непакоіць узровень жыцця (у матэрыяльным сэнсе), яго зніжэнне ў параўнанні з перыядам прафесійнай актыўнасці. Пагаршэнне стану здароўя (перанесены інфаркт міякарда, туберкулёз, астма) таксама негатыўна ўплывае на ступень эмацыйнай ураўнаважанасці. Важным негатыўным фактарам з'яўляюцца канфлікты або рэдкія і фармальныя кантакты з сям'ёй. Для мужчын характэрнае ўзмацненне трывожнасці па меры павелічэння часу знаходжання на пенсіі. Гэта звязана з тым, што паступова частка сяброў памірае, а зніжэнне фізічных магчымасцяў не дазваляе знайсці новыя кантакты і формы актыўнасці.

У жанчын на ўзмацненне трывожнасці ў першую чаргу ўплывае факт наяўнасці або адсутнасці сям'і. Калі для мужчыны большае значэнне мае якасць кантактаў з сям'ёй, то ў жанчын пераважае прынцып: «Любая сям'я лепш, чым ніякая». Старым жанчынам лягчэй апраўдаць несправядлівыя паводзіны і ўчынкі сваіх дзяцей, членаў сям'і, чым справіцца з адсутнасцю людзей, якім можна аддаць сваю любоў. З адзінотай вельмі цяжка справіцца жанчынам, якія раптам сталі адзінокімі ў старасці. Асабліва калі кантакты з навакольным светам ажыццяўляліся пры «пасрэдніцтве» мужа.

БОЯЗЬ СМЕРЦІ. Існуе ўзаемасувязь паміж адаптацыяй да старасці і стаўленнем да смерці. Рэлігійныя людзі перажываюць больш моцны страх, чым тыя, хто не веруе. У першых, акрамя апасенняў, звязаных з адыходам ад зямных спраў, выступае таксама страх, які тычыцца тагасветнага жыцця. Вельмі важна навучыцца распазнаваць свой псіхічны стан, адрозніваць напружанне страху і трывожнасці ад фізічных парушэнняў. Гэтае ўменне з'яўляецца першым крокам на шляху свядомага кіравання сваімі эмоцыямі, пераадолення тых з іх, якія з'яўляюцца сігналам парушэння сувязяў з іншымі людзьмі і самім сабой.

ПАРУШЭННЕ СНУ. Сон для пажылога чалавека яшчэ больш важны, чым для маладога. Рэзервовыя магчымасці нервовай сістэмы старых людзей значна зніжаныя, што прыводзіць да хуткага знясілення арганізма. Адна ноч, праведзеная без сну, моцна адбіваецца на настроі і стане псіхікі. Старыя з выражанай стомленасцю маюць патрэбу яшчэ і ў дадатковым сне днём.

ЗАТАРМОЖАНАСЦЬ У ПСІХІЦЫ І ПАВОДЗІНАХ...

...як вынік аднастайнага харчавання і дэфіцыту вітамінаў. Пажылы малазабяспечаны чалавек не можа набываць разнастайныя прадукты, гатаваць сабе паўнавартасную ежу. Як толькі харчаванне становіцца больш паўнацэнным, з'явы, якія нагадваюць дэменцыю, знікаюць.

...як вынік нізкай тэмпературы паветра ў доме. Павышэнне тэмпературы ў жыллі, паляпшэнне цеплаізаляцыі і рэгулярная гарачая ежа хутка вядуць да паляпшэння разумовых здольнасцяў і змены паводзін.

...як вынік празмернага прыёму лекаў. Бессістэмны і залішні прыём лекаў, асабліва снатворных, а таксама гіпатэнзіўных і супрацьалергічных вядзе да пагаршэння разумовай функцыі, кволасці і затарможанасці. Пасля спынення іх прыёму з'явы, падобныя на дэменцыю, могуць праходзіць.

ХВАРОБА АЛЬЦГЕЙМЕРА. Гэта захворванне галаўнога мозга праяўляецца дэменцыяй, якая паступова прагрэсуе. Дэменцыя — гэта зніжэнне такіх інтэлектуальных функцый, як абстрактнае мысленне, памяць, узровень суджэнняў, здольнасць да навучання, пісьма, маўлення і г.д. Прычыны ўзнікнення гэтай хваробы пакуль дакладна не ўстаноўлены. Тыповы ўзрост пачатку — пасля 65 гадоў. Вядучую ролю ў дапамозе гэтай катэгорыі хворых сёння адыгрывае не біялагічная тэрапія, а сацыяльна-асяродкавыя і псіхалагічныя ўздзеянні, правільны догляд, дапамога членаў сям'і, якія даглядаюць старога.

САСУДЗІСТАЯ ДЭМЕНЦЫЯ. Зніжэнне інтэлекту ў выніку парушэнняў мазгавога кровазвароту пачынаецца ў 50-60 гадоў. У мужчын сустракаецца крыху часцей. Прычына гэтай дэменцыі — назапашванне ачагоў некрозу ў рэчыве мозга, якое ўзнікае ў выніку некалькіх інсультаў, часцей за ўсё ішэмічных. Пачатак захворвання, у адрозненне ад дэменцыі, пры хваробе Альцгеймера адносна востры і выразны. Кантроль за артэрыяльным ціскам і яго пастаянная карэкцыя, лячэнне спадарожных паталогій — атлусцення, цукровага дыябету — поўная адмова ад курэння дае магчымасць папярэдзіць узнікненне сасудзістай дэменцыі ў здаровых людзей, якія маюць вельмі высокую рызыку развіцця гэтай хваробы.

ДЭПРЭСІЯ. Часам выпадкі дэпрэсіі ў пажылых людзей нагадваюць дэменцыю. Многія пажылыя людзі з дэпрэсіўным сіндромам кажуць аб тым, што яны віталі б смерць, калі б яна надышла хутка і без болю. Пры моцнай дэпрэсіі чалавек часта не адказвае на пытанні, не можа правільна арыентавацца ў часе і прасторы. Калі на зніжэнне памяці і інтэлекту скардзіцца сам пажылы, але не яго блізкія, то гэта дэпрэсія; калі скардзяцца блізкія, але пацыент гэтага не заўважае, то гэта дэменцыя.

— Старым людзям неабходна пастаянна трэніраваць свае інтэлектуальныя магчымасці з дапамогай розных відаў нагрузкі — такіх, як чытанне, лік, завучванне вершаў, вывучэнне замежных моў і г.д. — кажа **дацэнт кафедры рэабіліталогіі Дзяржаўнага інстытута ўпраўлення і сацыяльных тэхналогій БДУ, кандыдат медыцынскіх навук Уладзіміра МІЛЬКАМАНОВІЧ**. — Асваенне новай інфармацыі, веданне праблем, плыняў палітычнага і эканамічнага жыцця сваёй краіны і свету спрыяюць захаванню здаровай псіхікі састарэлага чалавека... Комплекснае лячэбнае ўздзеянне на псіхіку аказвае падтрымаанне стасункаў са старымі. Любы стары мае патрэбу ў суразмоўцы, спачуванні, пяшчотных словах. А ўвогуле здароўе пажылога чалавека, перш за ўсё псіхалагічнае, можа быць захавана яго ўласнымі намаганнямі, разуменнем працэсаў, якія адбываюцца ў арганізме, і фактараў, якія процідзейнічаюць хваробам і немачы. Агульная культура чалавека як у маладыя гады, так і ў сталым веку мае вырашальнае значэнне. Дапамагчы падтрымаць гэтую культуру закліканы медыцынскія і сацыяльныя работнікі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Віншуем!

Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі — 80 гадоў

9-10 лістапада ў Мінску праходзіць Міжнародны кангрэс «Новыя падыходы ў сістэме паслядыпломнай адукацыі і падрыхтоўкі спецыялістаў», прымеркаваны да юбілею БелМАПА — унікальнага вучэбна-педагагічнага і навуковага цэнтра, які павышае кваліфікацыю, ажыццяўляе перападрыхтоўку ўрачоў, выкладчыкаў медыцынскіх ВНУ і вучоных Беларусі. Штогод супрацоўнікі акадэміі атрымліваюць звыш 30 патэнтаў і станоўчых рашэнняў на вынаходніцтвы. БелМАПА супрацоўнічае з медустановамі, ВНУ, навукова-даследчымі і навукова-практычнымі цэнтрамі краін СНД, Швецыі, Італіі, Польшчы, Аўстрыі, Японіі, Турцыі.

Паводле слоў праэктара па навуковай рабоце акадэміі Таццяны КАЛІНІНАЙ, штогод павышаюць кваліфікацыю і праходзяць перападрыхтоўку звыш 15 тысяч урачоў. Вучэбнымі базамі кафедраў БелМАПА з'яўляюцца 55 лячэбна-прафілактычных арганізацый рэспублікі, у тым ліку 8 РНПЦ, 6 устаноў аховы здароўя рэспубліканскага падпарадкавання, 8 устаноў аховы здароўя Мінскай вобласці, 32 установы аховы здароўя Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама. У акадэміі працуюць чатыры факультэты — тэрапеўтычны, хірургічны, педыятрычны і грамадскага здароўя. Яны дазваляюць забяспечыць высокі ўзровень паслядыпломнай падрыхтоўкі спецыялістаў медыцынскага профілю практычна па ўсіх раздзелах сучаснай аховы здароўя. Дзейнічаюць курсы па рэфлексатэрапіі, гамеапатыі, мануальнай тэрапіі, касметалогіі, лазерных тэхналогіях у медыцыне, пластычнай хірургіі і г.д. У 2008 годзе была адкрыта кафедра кардыяхірургіі, якую ўзначаліў прафесар Юрый Астроўскі. Пачынаючы з 2009 года, пры кафедры функцыянуе курс транспланталогіі. Сёння рэктар акадэміі — член-карэспандэнт НАН Беларусі, прафесар Юрый Дзямідчык, які ўзначальвае ў краіне школу ўрачоў-анколагаў са спецыялізацыяй па шчытападобнай залозе.

Дарэчы, на базе Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння функцыянуе прафесарскі лячэбна-кансультацыйны цэнтр БелМАПА, дзе можна атрымаць кансультацыю больш як 100 прафесараў і дацэнтаў акадэміі, галоўных і вядучых спецыялістаў Беларусі па 30 спецыяльнасцях. Паслугі аказваюцца па дзяржаўных тарыфах. Звярнуцца ў цэнтр можа любы ахвотны, без накіравання, згодна з папярэднім запісам.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У МІНСКАЙ АБЛАСНОЙ дзіцячай клінічнай бальніцы цяпер праводзяць аперацыі па эндапратэзаванні сярэдняга вуха пры хранічным атыце.

Дагэтуль аперацыі па паляпшэнні слыху праводзіліся толькі ў РНПЦ атарыналарынгалогіі. Паводле слоў загадчыцы атарыналарынгалагічнага аддзялення для дарослых бальніцы Алены КАРЖАНЕВІЧ, хірургічнае ўмяшанне выканана шасці пацыентам. Правядзенне самых складаных аперацый па карэкцыі хірургічнай, лор- і афтальмалагічнай паталогій у Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы ажыццяўляецца зараз і ў новым хірургічным корпусе з аснашчанымі сучаснай апаратурай аперацыйнымі.

Карысна ведаць

З МЫШАМІ — АСЦЯРОЖНЕЙ!

Гемарагічная ліхаманка з нырачным сіндромам (ГЛНС), або «мышыная» ліхаманка — вострае вірусное прыродна-ачаговае захворванне. Узбуджальнікам з'яўляецца вірус, які перадаецца ляснымі мышападобнымі грызунамі: рудой і чырвона-шэрай палёўкай, палявой мышшу, радзей — дамавым пацуком.

Заражэнне людзей можа адбывацца круглы год, але часцей у летне-асенні перыяд пры наведванні лесу, зборы грыбоў, ягад, паляванні, рыбнай лоўлі, падчас працы на садова-агародных участках, збору ўраджаю. З наступленнем халадоў грызуны перасяляюцца ў жылыя памяшканні, месцы захоўвання прадуктаў, фуражу, таму заражэнне становіцца магчымым у бытавых умовах.

Заражэнне чалавека адбываецца пры кантакце з выдзяленнямі (калам, мачой, слінай) грызуноў, пры ўдыханні пылу, які змяшчае выдзяленні інфіцыяваных грызуноў. Дапускаецца магчымасць заражэння чалавека элементарным шляхам, напрыклад, пры ўжыванні прадуктаў (капуста, морква і інш.), забруджаных грызунамі, якія не былі тэрмічна апрацаваны.

Людзі дастаткова ўспрымальныя да захворвання, але для навакольных хворы чалавек не ўяўляе небяспекі. Перанесеная інфекцыя пакідае пасля сябе ўстойлівы імунітэт.

Ад моманту заражэння да з'яўлення першых прыкмет захворвання праходзіць ад 7 да 36 дзён (часцей 2—3 тыдні). Хвароба пачынаецца з павышэння тэмпературы (39—40 °С). Адзначаюцца моцныя галаўныя і мышачныя болі, часам пагаршэнне зроку, з'яўляюцца смага і сухасць у роце. Напрыканцы першага або на другі дзень хваробы ў многіх з'яўляюцца млоснасць і ваніты, якія нарастаюць на працягу бліжэйшых дзён, часта ўзнікае ікаўка. На скуры плечавога пояса і ў падпахавых ямках можа з'яўляцца гемарагічны сып у выглядзе адзінкавых або дробных множных крывазліццяў. Магчымыя крывазліцці ў кан'юнктыву склер, павелічэнне ломкасці капіляраў. Асабліва тыповы для «мышынай» ліхаманкі нырачны сіндром: моцныя болі ў жываце і паясніцы, рэзкае змяншэнне колькасці мачы, прысутнасць у ёй крыві. Пашкоджанне нырак праяўляецца таксама ў азызласці твару, ацёчнасці павек.

Найбольш сур'ёзныя ўскладненні: інфекцыйна-таксічны шок, ацёк лёгкіх, вострая нырачная недастатковасць, разрыў ныркі, крывазліцці ва ўнутраныя органы.

Як папярэдзіць захворванне гемарагічнай ліхаманкай з нырачным сіндромам?

На жаль, прафілактычных прышчэпак супраць ГЛНС не існуе. Усе меры прафілактыкі накіраваны на прадухіленне кантакту чалавека з грызунамі, з іх выдзяленнямі і на ахову прадуктаў харчавання і вады ад забруджвання.

Каб папярэдзіць заражэнне ГЛНС, неабходна прымаць наступныя меры засцярогі:

— не ўжываць у ежу прадукты, сапсаваныя грызунамі;

— не ўжываць сырую ваду, а таксама ваду з невядомых крыніц;

— выкарыстоўваць падчас працы на агародзе, догляду свойскіх жывёл ахоўнае адзенне, пальчаткі;

— захоўваць правілы асабістай гігіены: мыць рукі перад ядой, трымаць харчовыя прадукты ў тары, абароненай ад пранікнення грызуноў;

— забяспечыць непранікальнасць для грызуноў гаспадарчых пабудоў і жылых памяшканняў;

— у дачных дамках, падвалах выкарыстоўваць пасткі і хімічныя сродкі (атручаныя прынады) для барацьбы з грызунамі, пры гэтым памятаць пра бяспеку людзей;

— прыбіранне памяшканняў, дзе выяўлены выдзяленні грызуноў, праводзіць у пальчатках і шматслаёвай марлевай павязцы вільготным способам з прымяненнем дэзынфікуючых сродкаў; пасцельную бялізну, адзенне, асабістыя рэчы неабходна прасушыць на сонцы, а затым старанна выбіць пыл;

— не лавіць і не браць у рукі грызуноў або іх трупы;

— падчас знаходжання на прыродзе варта пазбягаць зарасніка травы, а запасы ежы неабходна захоўваць у недаступных для мышэй месцах;

— пры наведванні лесу пазбягаць начлегу ў стагах сена, у закінутых будынках, не выкарыстоўваць для подсцілаў леташняе сена або салому.

Лячэнне хворых на ГЛНС праводзіцца толькі ў стацыянары! Таму пры з'яўленні сімптомаў захворвання не займайцеся самалячэннем — звярніцеся да ўрача.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Доктар адкажа

Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

На гэтым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

9 лістапада — галоўны ўрач 37-й мінскай гарадской паліклінікі Леанід Анатольевіч БАГДАНАЎ.

10 лістапада — галоўны ўрач 25-й мінскай дзіцячай паліклінікі Ірына Віктараўна ПАКІДЗЬКА.

11 лістапада — галоўны ўрач 10-й мінскай гарадской паліклінікі Святлана Іванаўна ЦАБКАЛА.

Упраўленне аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 222 70 80

9 лістапада — загадчык аддзялення рэнтген-эндаваскулярнай хірургіі Мінскай абласной клінічнай бальніцы Дзмітрый Іосіфавіч КАРПОВІЧ.

10 лістапада — загадчык клініка-дыягнастычнай лабараторыі Мінскага абласнога радзільнага дома Тамара Аляксандраўна СЯРЖАН.

11 лістапада — намеснік галоўнага ўрача Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы Аксана Уладзіміраўна ЗАРОДАВА.

Халадзільнікі no frost — рассаднікі кішэчнай палачкі?

Хто б мог падумаць, што халадзільнікі могуць уяўляць сапраўдную пагрозу для здароўя і жыцця сваіх гаспадароў? Тым не менш гэта факт: даследчыкі сцвярджаюць, што ў некаторых аддзяленнях халадзільніка можа жыць вялізная колькасць хваробатворных мікраарганізмаў. Найбольшая небяспека хаваецца ў скрынях для гародніны і садавіны.

Аб'ектам даследавання навукоўцаў сталі халадзільнікі з тэхналогіяй замарожвання no frost (без інею), якія не патрабуюць размарожвання, а таму вельмі рэдка мыюцца. У выніку ў скрынях, якія дасталі з 30 хатніх халадзільнікаў, было знойдзена ў сярэднім 7,85 тысячы калонеўтваральных адзінак бактэрый на 1 квадратны сантыметр. У рэдкіх выпадках іх колькасць даходзіла да каласальных памераў — 129 тысяч на 1 квадратны сантыметр. З небяспечных узбуджальнікаў у скрынях былі знойдзены кішэчная палачка, сальманэла і лістэрыя.

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 18 ноября 2011 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни **с 08.00 до 17.00**. Последний день приема заявлений – **14.11.2011** года до 15.00.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Условия проведения аукциона – **наличие не менее двух участников**.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) квитанцию о **внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3641017440554** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 **(разовый платеж)**; б) документ, удостоверяющий личность **(паспорт и его копию)** покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – **паспорт, копию паспорта и нотариально заверенную доверенность**.

Порядок осмотра на местности земельного участка: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: строительство инженерных коммуникаций будет осуществлено в соответствии с проектно-сметной документацией за счет бюджета города. Продажа земельных участков производится без изменения целевого назначения. Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят **задатки** в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Победитель аукциона обязан: в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за земельный участок (задаток засчитывается при внесении платы); возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 9 миллионов рублей.

№ лота	Адрес земельного участка, по ПДП «Детальный план индивидуальной жилой застройки в районе деревни Городщина Могилевского района»	Площадь, га	Кадастровый номер	Стоимость землеустроительного дела (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 44	участок № 175	0,1138	740100000001005960	983 974	33 488 000	3 014 000
№ 45	участок № 176	0,1050	740100000001005961	939 972	30 898 000	2 781 000
№ 46	участок № 177	0,1050	740100000001005962	938 508	30 898 000	2 781 000
№ 47	участок № 178	0,1050	740100000001005963	938 508	30 898 000	2 781 000
№ 48	участок № 179	0,1045	740100000001005964	954 052	30 751 000	2 768 000

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

г. ВИТЕБСК 19.12.2011

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА НЕДВИЖИМОСТИ СНИЖЕНА НА 50 %

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1	Неиспользуемое здание аптеки № 69 с тремя пристройками, уборной и неиспользуемое здание склада, расположенные по адресу: Витебская область, Верхнедвинский район, Борковский с/с, д. Борковичи, ул. Железнодорожная, 15, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 251/С-61244 (здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг) одноэтажное щитовое, облицованное кирпичом, фундамент бутобетонный, перекрытия деревянные, крыша шиферная, с двумя кирпичными пристройками, дощатой пристройкой и крыльцами деревянными, общей площадью 87,3 кв.м, уборной; капитальное строение с инвентарным номером 251/С-62539 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) одноэтажный деревянный склад, фундамент бутовый, перекрытия деревянные, крыша шиферная, общей площадью 23,3 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 221081201601000003, площадь 0,0481 га для использования под Борковичскую сельскую аптеку № 69, сроком аренды 50 лет. Ограничения (обременения) – охранная зона линии связи, площадь 0,0070 га. Использование – для содержания и обслуживания зданий.	19137891	1913780
2	Неиспользуемое здание бывшей аптеки № 126, расположенное по адресу: Витебская область, Дубровенский район, Кленовский сельский совет, дер. Клены, ул. Кленовская, 5, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение, инв. № 241/С-2389 (здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг) - одноэтажное бревенчатое,1962 года постройки, фундамент – бетонный, перекрытия – деревянные, крыша – шиферная, общая площадь 72,3 кв.м, с верандой. Земельный участок: с кадастровым номером 222482502101000002, площадью 0,0310 га, для содержания и обслуживания здания бывшей аптеки № 126, сроком аренды 50 лет. Ограничения в использовании в связи с расположением земельного участка в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 В и в водоохранной зоне р. Луки площадью 0,0310 га.	8021421	802140
3	Неиспользуемое здание отделения связи, расположенное по адресу: Витебская область, Верхнедвинский район, Бельковщинский с/с, дер. Жовнино, ул. Школьная, 1, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 251/С-11004 (одноэтажное деревянное здание отделения связи) одноэтажное деревянное с деревянной холодной пристройкой, фундамент бутовый, крыша шиферная, перекрытия деревянные, общая площадь 46,2 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 221083603101000001, площадь 0,0420 га для использования под отделение связи в деревне Жовнино, ул. Школьная, 1, сроком аренды 50 лет. Ограничение в использовании в связи с расположением земельного участка в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 В на площади 0,0015 га. Разрешить победителю аукциона в установленном порядке использовать земельный участок для содержания и обслуживания здания.	8770811	877080

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

Аукцион состоится 19 декабря 2011 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 16.12.2011 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 19.12.2011 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

1. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903027026 в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

2. Участник, ставший **победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка, внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

3. Подробная информация о продавцах, условиях аукциона, условиях участия в аукционе опубликована в газете «Звязда»: за 11.06.2011 № 108 (26981), за 09.07.2011 № 128 (26992) и за 23.07.2011 № 138 (27002).

г. ВИТЕБСК 16.12.2011

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи лота, рублей	Сумма задатка, рублей
1.	Не завершенный строительством объект – завод глиняного кирпича, расположенный по адресу: Витебская область, Чашникский район, Лукомльский с/с, северо-западнее д. Стражевичи	Характеристика объекта недвижимости: не завершенный строительством объект – завод глиняного кирпича. Земельный участок: с кадастровым номером 225183012101000094, площадь 26,3065 га для использования под производственную базу. Назначение – для использования под производственную базу.	**Одна базовая величина**	**Одна базовая величина**
2.	Не завершенный строительством объект «Музей-усадьба И. Буйницкого», расположенный по адресу: Витебская область, Глубокский район, Прозороки с/с, д. Прозороки, ул. Вокзальная, 22	Характеристика объектов недвижимости: незавершенный строительством объект, общая площадь 505,7 кв.м, фундамент – ж/б блоки, перекрытия – ж/б плиты, стены блочные – облицованные кирпичом, кровля – нет, полы – нет, проемы – нет, внутренняя отделка – нет. Процент готовности – 10 %. Земельный участок: с кадастровым номером 221585411601000187 площадью 0,2567 га для обслуживания объекта «Музей-усадьба И. Буйницкого».	**Одна базовая величина**	**Одна базовая величина**

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон/факс в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: fondvitebsk@tut.by.

ПРОДАВЕЦ: лота № 1 – Дирекция строящегося государственного предприятия «Завод глиняного кирпича», контактный телефон (02133) 31333, 37637;

лота № 2 – Учреждение «Государственный музей истории театральной и музыкальной культуры Республики Беларусь», контактный телефон (017) 2270544.

Условия продажи недвижимости: по лоту № 1 – осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте, создание им дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи; по лоту № 2 – создание на территории приобретаемого объекта постоянно действующей экспозиции, посвященной деятельности И. Буйницкого; осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте; создание им дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

Аукцион состоится «16» декабря 2011 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

1. Для участия в аукционе приглашаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Представителем заявителя (кроме случая, когда юридическое лицо представляет его руководитель) предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости (для представителя иностранного юридического лица) легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 15.12.2011 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 16.12.2011 с 14.00 до 15.00. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на **расчетный счет № 3642903027026 в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495**.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11.03.2010 № 342. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведение аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

7. Извещения о проведении аукционов были опубликованы ранее в газете «Звязда» от 27.09.2011 № 184 (27047), от 21.09.2011 № 180 (27044).

ГРАНДЫЁЗНЫМ СКАНДАЛАМ ЗАВЯРШЫЎСЯ МАТЧ «ДЫНАМА» З «ВІЦЯЗЕМ»

КХЛ мінімальна пакарала чэхаўскі клуб за пабоішча

6 лістапада хакейны матч паміж мінскім «Дынама» і чэхаўскім «Віцязем» скончыўся грандыёзным скандалам, якога ў КХЛ яшчэ не было. Усё пачалося з бойкі паміж гульцамі, умяшаліся балельшчыкі, якія выкінулі на лёд усё, што было пад рукой, а апафеозам стала выхадка галоўнага трэнера прыезджай каманды, які з клюшкай кінуўся на балельшчыкаў. Такога не бачыла не толькі «Мінск-Арэна», але і ніводная пляцоўка КХЛ.



Фота БЕЛТА.

Матч праходзіў па ўсіх правілах да самага заканчэння і меў сваю інтрыгу: «Віцязь» у пачатку сустрэчы нават вёў 2:1, затым беларусы лік зраўнавалі. А за 1 хвіліну 2 секунды да фінальнай сірэны наш супернік застаўся ў меншасці. Георгій Белавусаў паехаў адбываць штраф, і праз 18 секунд капітан «Дынама» Яраслаў Обшут вывеў дынамаўцаў наперад, рэалізаваўшы большасць, — 3:2. Да фінальнай сірэны заставалася менш за хвіліну. Першым у «Віцязя» пачаў Аляксандр Сазонаў, які накінуўся на Ціму Лайнэ. Фін бойку не падтрымаў: упаўшы на лёд, ён закрыўся рукамі, а супернік працягваў яго дубасіць. 15-тысячная «Мінск-Арэна», якая сабрала ў гэты вечар пяты ў сезоне аншлаг, адказала не толькі незадаволеным свістам і выкрыкамі — на лёд паляцелі пластыкавыя бутэлькі. І вось арбітрам, здавалася б, удалося ўзяць сітуацыю пад кантроль: зачыншчык беспарадкаў пайшоў у раздзявальню, пакараны штрафам да канца гульні, супрацоўнікі арэны разам з хакеістамі ачышчаюць лёд ад бутэлек, адносячы іх вёдрамі... Матч часова спынены, і дагуляць засталося 15 секунд.

Галоўны трэнер «Віцязя» выпускае на лёд Ніка Тарнаскі і Крыстафера Брэнана — гульцоў, якія радуюць заўзятараў зусім не закінутымі шайбамі, а бязлітаснымі бойкамі з супернікам. Спяшаючыся паспець да сірэны, Тарнаскі і Брэнан кідаюцца на абаронцаў «Дынама» Каралахці і Дзянісава. Абодва дынамаўцы ляжаць на лёдзе, Дзянісаў накрывае галаву рукамі і атрымлівае кулакамі па спіне. Дыктар арэны просіць аматараў хакея нічога на пляцоўку не выкідваць, але дарэмна: усё, што засталося пад рукамі пасля першага разу, ляціць у хакеістаў «Віцязя», на іх лаўку запасных і першыя рады балельшчыкаў. Здаюць нервы ў галоўнага трэнера «віцькоў» (так каманду называюць заўзятары) Аляксандра Назарава: з клюшкай ён становіцца на лаўку і замахваецца на мінскіх балельшчыкаў, але пластыкавая агараджа занадта высокая. Назараў лупіць па пластыку, заклікаючы да сябе балельшчыкаў. Трэнеру ўдаецца стаць яшчэ вышэй, і зноў ён махае клюшкай, да настаўніка далучаюцца і хакеісты Панарын і Анісін са сваімі клюшкамі. Заўзятараў спешна адцясняе ад агароджы АМАП, а Назараў пакідае лаўку запасных, паказваючы трыбунам непрыстойныя жэсты. Усе сыходзяцца ў думцы, што трэнер «Віцязя» за такія паводзіны павінен быць сур'ёзна пакараны.

Пасля матчу Назараў не з'явіўся на прэс-канферэнцыі, яго памочнік Ігар Калянін растлумачыў адсутнасць настаўніка траўмай (у галаву Назараву трапіў адзін з прадметаў, выкінуты балельшчыкамі) і ад яго імя прынёс прабачэнні. Аляксандр Назараў у дзень гульні даў кароткі каментарый «Советскому спорту» :

— Гарачы прыём нам у Мінску аказалі. Спачатку крычалі «Руския — дадому!». Потым пачалі плявацца. А ў канцы і ўвогуле пачалі тыкаць у нас сцягамі, кідаць бутэлькі. Я прывык лічыць Беларусь брацкай краінай, дзе ў мяне жыве шмат сяброў. А сёння мне тут нанеслі траўму.

— Сур'ёзную?

— Загоіцца. Ударылі ў галаву ці то дрэўкам сцяга, ці то бутэлькай... Я звярнуў бы ўвагу на дрэнную ахову мінскага палаца. Дакладней, на яе адсутнасць. На стадыёне 15 тысяч чалавек, і каманда гасцей ніяк ад іх не абароненая.

Са свайго боку дададзім, што ні такіх, ні больш дробных інцыдэнтаў на «Мінск-Арэне» не здаралася з удзелам іншых прыезджых камандаў. Гісторыя ж «Віцязя» за ўвесь час існавання ў КХЛ складаецца з адных толькі скандалаў. Як вядома, гаспадаром чэхаўскага хакейнага клуба з'яўляецца Мікалай Паўлінаў, вялікі прыхільнік бокса і баёў без правілаў. Клуб мэтанакіравана скупляе тафгаяў і месца аднаго дыскваліфікаванага байца займае другі. Дарэчы, адзін са славутых чэхаўскіх тафгаяў Яблонскі адбывае дыскваліфікацыю і за падзеямі на «Мінск-Арэне» назіраў з праходу побач з лаўкай запасных. З яго прысутнасцю бойка была б больш масавай, дакладна. Трэнер Андрэй Назараў — сам у мінулым вядомы тафгай, які за сезон у НХЛ праводзіў да 30 баёў і меў прозвішча «брудны Наз». Але вернемся да гісторыі «Віцязя». З года ў год каманда займае апошнія месцы ў табліцы КХЛ: сезон 2008-09 — 23 месца сярод 24 камандаў, сезон 2009-10 такі ж вынік, сезон 2010-11 — 21-е месца сярод 23 камандаў. Але бярэ іншым: масавымі лядовымі пабоішчамі. «Віцязь» увайшоў у гісторыю як удзельнік самага кароткага матчу КХЛ. 9 студзеня 2010 года ў сустрэчы з омскім «Авангардам» бойка пачалася на 4-й хвіліне. Матч быў спынены, і працягнуць яго стала немагчыма: пасля пакарання ўдзельніка бойкі штрафамі высветлілася, што не хапае гульцоў, каб працягнуць гульню. Працяг не прымусіў сябе чакаць: у наступнай гульні з «Авангардам» у Омску бойка пачалася ўжо на 6-й секундзе! КХЛ нейкі час пагражаў выключыць «віцькоў» з Лігі, аднак увесь час абмяжоўваецца «апошнім папярэджаннем».

Але ці патрэбны нам такі хакей? Гэта для НХЛ бойкі — прывабны элемент шоу, якім там з'яўляецца хакей. У нас жа народ не на бойкі ходзіць, да таго ж мы вельмі сентыментальныя: калі незаслужана крыўдзяць нашу каманду, будзем абараняць усімі магчымымі спосабамі, што і прадэманстравалі на «Мінск-Арэне». Ды і КХЛаўскія балельшчыкі неадназначна ацэньваюць падзеі на «Мінск-Арэне». Вось некаторыя выказванні з форумаў:

Mrunohoo

Калі яны пачнуць мядзведзяў апранаць у хакейную форму і выпускаць іх на матчы? КХЛ ператвараецца ў адно вялікае глупства. Як Андрэй Назараў мог увогуле атрымаць працу трэнера? І чаму дагэтуль не звольнены за тое, што атакаваў балельшчыкаў?

Uh-Huh

Ён (Назараў) павінен быць шчаслівым, што гэта адбылося не ў ЗША, інакш ён даўно быў бы ў судзе.

timanGi

Ну што ж, затое нельга абвінаваціць «Віцязь» у тым, што ён — сумны хакейны клуб.

Дысцыплінарны камітэт КХЛ, тэрмінова сабраны 7 лістапада па слядах нашумелага здарэння ў Мінску, вынес сваё рашэнне: такому хакею быць. Трэнера Назарава пакаралі двухматчавай дыскваліфікацыяй (для параўнання: калі ў футбольным чэмпіянаце Беларусі галоўны трэнер дазваляе сабе крытыку арбітраў на прэс-канферэнцыі, атрымлівае пяціматчавую дыскваліфікацыю). Зачыншчык бойкі Кіп Брэнан атрымаў чатырохматчавую дыскваліфікацыю, Нік Тарнаскі — двухматчавую, Арцёмій Панарын, які махаў клюшкай разам з трэнерам у бок балельшчыкаў, — аднаматчавую, а Анісін, які быў там жа, увогуле прызнаны невінаватым. І самае галоўнае — мінскае «Дынама» аштрафавана на 500 тысяч расійскіх рублёў (каля 16 тысяч долараў).

Цікава, што КХЛ ніяк не стала ацэньваць паводзіны «Віцязя», а вось па мінскіх балельшчыках прайшлося:

— Кантынентальная хакейная ліга вымушаная адзначыць недысцыплінаваныя паводзіны груп балельшчыкаў «Дынама», якія сталі асабліва непрыемным сюрпрызам, бо раней аматары хакея Мінска вызначаліся прыстойнымі і сяброўскімі паводзінамі, выдатным разуменнем хакея і павагай да гульцоў і трэнераў усіх камандаў. Ніякім чынам не апраўдваючы паводзіны прадстаўнікоў каманды «Віцязь», КХЛ заяўляе пра недапушчальнасць дзеянняў, падобных тым, якія былі ажыццёўлены асобнымі групамі гледачоў. Спартыўна-дысцыплінарны камітэт разглядаў прапанову некаторых сваіх удзельнікаў аб правядзенні мінскім «Дынама» некалькіх наступных матчаў без гледачоў. У выніку было вырашана, што пазбаўляць хакейнага відовішча тысячы балельшчыкаў з-за некалькіх соцень тых, хто парушыў парадак на арэне, было б несправядліва. У адпаведнасці з рэгламентам КХЛ на хакейны клуб «Дынама» (Мінск) накладзены вызначаныя штрафныя санкцыі. Кантынентальная хакейная ліга выражае прэтэнзіі да працы Службы бяспекі мінскага «Дынама», у дачыненні да якой будзе вынесена асобнае прадстаўленне.

Аляксандр Назараў, як і пасля матча, пра здзейсненае шкадуе:

— Падчас паўзы ў чэмпіянаце мы з Ігарам Нікіціным павязём другую зборную Расіі ў Гомель на этап Еўравыкліку. У адзін з дзён буду гатовы сустрэцца з беларускімі балельшчыкамі за «чаркай гарбаты» і растлумачыць ім, дзе я не меў рацыі і дзе ўжо наадварот, эмоцыі перапаўнялі гледачоў. Спорт павінен нас аб'ядноўваць. Упэўнены, такая сустрэча пойдзе нам на карысць, — заявіў учора Назараў «Спорт-Экспрэсу».

Застаецца дадаць, што ўжо 11 лістапада Аляксандр Назараў прыязджае ў Гомель. А з «Віцязем» дынамаўцы на «Мінск-арэне» сустрэнуцца 20 снежня. Будзе аншлаг, можна не сумнявацца.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Спорт-тайм

АНАТОЛЬ БУЯЛЬСКІ АДМОВІЎСЯ ЎЗНАЧАЛЬВАЦЬ ЗБОРНУЮ

Настаўнік жаночай зборнай па баскетболе Анатоль Буяльскі больш не будзе ўзначальваць галоўную каманду краіны. Трэнер растлумачыў, чым выклікана такое рашэнне:

— Я занадта доўга знаходжуся на гэтай пасадзе, мне неабходны перапынак. І нішто не прымусіць мяне змяніць гэта рашэнне. Магчыма, мой выхад прымусіць некага задумацца. Каманда не заслугоўвае такіх адносін, на мой погляд. Маё развітанне са зборнай пастаянна адцягваюць. Хоць я аб'явіў на трэнерскай радзе, і на выканкаме аб тым, што не планую працягваць працу з галоўнай камандай краіны. Але мне далі некаторы час на роздум. Я ж лічу, што для руху наперад неабходна штосьці мяняць. Кантракт у мяне разлічаны да канца года, гэта значыць, да 31 снежня. На новую атэстацыю ісці не планую.

Нагадаем, што пад кіраўніцтвам Анатоля Буяльскага жаночая нацыянальная каманда ў 2007 годзе стала бронзавым прызёрам чэмпіянату Еўропы, у 2008-м заняла 6-е месца на Алімпіядзе ў Пекіне, у 2009-м увайшла ў чацвёрку лепшых камандаў па выніках Еўрабаскета, а праз год спынілася ў кроку ад медалёў чэмпіянату свету. У сёлетнім сезоне дружына Анатоля Буяльскага фінішавала на еўрапейскім першынстве дзявятай.

СТАЛІЧНАЕ «ДЫНАМА» САСТУПІЛА ТРЭЦЯЕ МЕСЦА «ГОМЕЛЮ»

У выхадныя ў чэмпіянаце Беларусі прайшлі матчы 31-га тура чэмпіянату Беларусі па футболе. Сталічнае «Дынама» нечакана разгромна саступіла бабруйскай «Белшыне» — 0:3 — і прапусціла наперад у прызавую тройку «Гомель», які цяпер прэтэндуе на бронзавыя медалі. Галоўны трэнер бела-блакітных Сяргей Аўчыннікаў паражэнне пракаментаваў так:

— Гульня не ўдалася. Гол на першай хвіліне вырашыў зыход. Віну бяру на сябе, гэта я рыхтаваў каманду да матча. Таксама хачу папрасіць прабачэння ў балельшчыкаў. З іншага боку, я не буду тапіцца або вешацца.

«Гомель» выйграў на выездзе ў брэсцкага «Дынама» — 2:0. Прэтэндэнт на серабро, салігорскі «Шахцёр», таксама ачкі не страціў, выйграўшы ў «Нафтана» — 1:0. БАТЭ, які два туры таму датэрмінова выйграў чэмпіянат, перамог «Нёман» — 1:0. Вось вынікі астатніх матчаў: «Віцебск» — «Тарпеда-БелАЗ» — 0:2, «Днепр» — «Мінск» — 1:0.

Турнірнае становішча камандаў: БАТЭ — 65 ачкоў, «Шахцёр» — 55, «Гомель» — 51, «Дынама» (Мн) — 49, «Белшына» — 45, «Нафтан» — 37, «Тарпеда-БелАЗ» — 37, «Дынама» (Бр) — 33, «Нёман» — 33, «Віцебск» — 32, «Мінск» — 31, «Днепр» — 26.

Дарагая мамачка, сястра, свякроў, бабуля, сваццяя, цётачка, шчырая і добразычлівая жанчына, шаноўная суседка са Слуцка **Галіна Рыгораўна УСОВІЧ**! Прыміце ў **юбілейны дзень нараджэння** нашы найлепшыя віншаванні. Зычым здароўя, жыццёвага аптымізму. Заставайцеся такой ласкавай і ўважлівай да нас. Вялікі дзякуй за дабрыню сэрца.

Вашы родныя і Новікі.

Сцяпана Васільевіча МІЦЮКА з в. Лукава віншую **з 80-гадовым юбілеем**. Зычу моцнага здароўя, даўгалецця.

Анішчук Васіль Маркавіч.

ТАЛЕРКА Б'ЕЦЦА... МОЖА, ДА ШЧАСЛІВАГА ФІНАЛУ?

Старшыня фестывалю Генадзь ДАВЫДЗЬКА па традыцыі разбівае аб штатыў кінакамеры талерку з аўтографамі гасцей мінулага фестывалю.

НАВАТ калі фільм не абавязкова пра людзей, пазбаўленых праблем, перажыванняў, пошукаў адказаў на пытанні, якія ўсё часцей гучаць у фестывальным кіно, то для некаторай часткі беларускай публікі шчасце — ужо ў самой магчымасці глядзець такія карціны.

Ну і не толькі. Таму што фестываль яшчэ — гэта стасункі з калегамі, гледачамі, кантакты, знаёмствы. І гэтая частка фестывальнага жыцця не менш важная, калі меркаваць па словах і заўвагах гасцей, якія прыехалі сёлета ў Мінск. Няхай і ненадоўга. Напрыклад, як Андрэй Звягінцаў, аўтар фільма адкрыцця, чалавек, які апошнім часам чаканы госць на шмат якіх прэстыжных фестывалях — усё-такі яго працы адзначаны ў Канах! Вось і беларускі «Лістапад» ну вельмі, вельмі хоча наблізіцца да высокага фестывальнага ўзроўню, таму імкнецца набыць новы імідж на мяжы сталення: яму сёлета васямнаццаць. Якімі метадамі і наколькі паспяхова? — пра гэта будзем разважаць у фінале.

Але апрабацыя гэтага новага іміджу прайшла летась, калі беларускія гледачы нарэшце маглі сказаць: дык у нас, як на лепшых фестывалях, ёсць свая ганаровая дарожка, дзе можна пабачыць усіх гасцей!

Сёлета — гэта не тое, што летась, напэўна, вырашылі арганізатары і замянялі чырвоную дарожку пластыкавым пакрыццём чырвонага колеру, па якім шпацыравалі госці кінафестывалю — нашы і запрошаныя. Вось толькі ў адрозненне ад тых жа Канаў, дзе цёпла і зоркі могуць паказаць сябе ва ўсім бляску, у нас ім прыходзіцца «браць гледача» на паветры ўнутраным напаўненнем, усмешкамі ды палымянымі поглядамі. І што тут хаваць: усе гады існавання фестывалю «Лістапад» больш прыцягваў цеплынёй адносін. Цяпер, як у лепшых дамах, павінна быць усё. Вось толькі надвор'е не закажаш адмыслова для святочных сукенак, якія вядомыя жанчыны вымушаны закрываць на дарожцы паліто ды футрам — як Інга Аболдзіна-Стралкова, Вера Палякова, Алена Турава... Магчыма, і высакародны дыванок замянілі высокатэхналагічным матэрыялам з практычных меркаванняў? У лістападзе ў Мінску можа быць даволі вільготна... Восень усё ж.

Восень у Беларусі, з аднаго боку, — час ураджаю. Вось і «лістападаўскія» ўзнагароды пачаліся ўжо ад самага пачатку. Традыцыйна на адкрыцці ўручаецца спецыяльны прыз Прэзідэнта Беларусі «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве». Сёлета ён прысуджаны народнаму артысту Украіны і СССР Багдану Ступку. Дзівіцца няма чаго — беларуская лістападаўская публіка добра ведае гэтага артыста і па фільмах з яго ўдзелам, якія не аднаразова дэманстраваліся на папярэдніх фестывалях і нават атрымлівалі ўзнагароды. Бачыць і слухаць яго даводзілася падчас сустрэч, выступленняў са сцэны: Багдан Ступка быў госцем «Лістапада» неаднойчы. І вось прагучала яго імя. Але сам акцёр не змог прыехаць. Узнагароду яму перададуць па дыпламатычных каналах. Пасол Украіны ў Беларусі Віктар Ціханаў, якому перададзены прыз, мог парадавацца культурнаму прарыву ў стасунках паміж дзвюма краінамі. Міністру культуры Беларусі Паўлу Латушку тут было чым пахваліцца: актыўныя стасункі вельмі часта выліваюцца ў канкрэтныя праекты — як усталяванне ў Кіеве помніка Уладзіміру Караткевічу. І гэта яшчэ не мяжа...

Кіно — тая частка культуры, развіццё якой наогул не стрымаць межамі. На «Лістападзе» ёсць магчымасць глядзець кіно самых розных краін — маладое кіно ўсяго свету ў асобным конкурсе і кіназ'явы апошніх гадоў ў пазаконкурснай праграме. Праўда, сярод розных краін ёсць тыя, якія, падобна да Беларусі, ідуць да свайго незалежнага кіно апошнія дваццаць гадоў. Вось менавіта для іх у рамках фестывалю ёсць «асноўны конкурс», які цікавы найперш тым, што дае магчымасць адчуваць, як нацыянальныя адметнасці ўзбагачаюць мастацтва, і зразумець, дзе знаходзімся мы і ў якім кірунку можам рухацца ў кінематографе. Шкада, што сёлета ў гэтай праграме няма ніводнай беларускай карціны...

Кінарэжысёр Алена ТУРАВА і акцёр Генадзь ГАРБУК.

Затое на нашай вуліцы свята — так прывыклі ставіцца да фестывалю «Лістапад» гледачы, маючы на ўвазе яшчэ і сустрэчы з зоркамі кіно, як гэта было раней. Але зоркі цяпер без мэты на наш фестываль не ездзяць. Іх прысутнасць абумоўлена альбо прадстаўленнем фільма (як Звягінцаў), альбо прадстаўленнем асобнай праграмы ў рамках фестывалю (Веніямін і Аліка Смехавы), альбо вядзеннем адказнага канцэрта. Напрыклад, адкрыцця. Як вам спадабалася Вольга Кабо ў якасці вядучай?.. А то раней бывала, што на расійскія кінафестывалі запрашалі вядучых з Беларусі. Вось і мы дачакаліся.

Дачакаліся і традыцыйнага біцця кінематаграфічнай талеркі — яе без лішніх ваганняў ляснуў аб кінакамеру старога ўзору старшыня фестывалю Генадзь Давыдзька. На талерцы былі аўтографы леташніх гасцей «Лістапада», сярод якіх, між іншым, быў і аўтограф Людмілы Гурчанкі... Шкада: можна было б і пакінуць яе на памяць як «лістападаўскую» рэліквію — у якасці выключэння. Тым больш што разбіраць кавалкі на сцэне не было каму, цікава, што з імі было далей? (На жаль, мы гэтага пабачыць не змаглі.) Хочацца верыць, што на мінскім фестывалі ўсё ж не будзе кінематаграфічнага смецця.

Напарадзе яшчэ шмат фестывальных дзён. Сёлета ў «Лістападзе» бярэ ўдзел больш за 38 краін свету. Усяго каля 50 мастацкіх фільмаў. Каля 40 дакументальных — вось менавіта ў гэтай праграме Беларусь зможа сябе паказаць кінематаграфічнай краінай.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ,
Ларыса ЦІМОШЫК.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Веніямін і Аліка СМЕХАВЫ.

СМАЧНА ЕСЦІ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Напрыклад, ААТ «Аршанскі мясакансервавы камбінат» каля месяца таму пачаў вырабляць сыравэнджаную каўбасу «Мінская» з... каньяком. Гэтую навінку пакуль паспелі паспытаць пераважна спажыўцы Віцебскай вобласці, але дзякуючы форуму такая магчымасць павінна з'явіцца і ў пакупнікоў з іншых месцаў краіны.

— Адпускны кошт гэтай каўбасы — 50 тысяч рублёў за кілаграм, з улікам ПДВ і гандлёвай надбаўкі ў рознічным гандлі сёння яна будзе каштаваць 60-65 тысяч рублёў за кілаграм, — расказала нам маркетолаг прадпрыемства Зоя Чудовіч.

А вось іншую навінку, якая таксама вырабляецца на прадпрыемстве каля месяца, на паліцах крам спажыўцы яшчэ нідзе не бачылі (таму і прыкладны яе кошт нам пакуль не змаглі назваць). Хіба толькі каму пашчасціла паспытаць яе на дэгустацыі. Кажуць, вельмі спадабалася. Гаворка ідзе пра дзіцячае харчаванне — кансервы з пюрэ мяса страуса з ялавічынай і са свінінай. Зрэшты, чаму толькі для дзіцячага харчавання? Гэты першы дыетычны інгрэдыент, у якім няма солі, падыдзе і для дарослага чалавека.

— Нашы навінкі — гэта мясныя прадукты, вырабленыя пад прэсам без абалонкі або ў цэлафанавай упакоўцы, — дэманструе нам узоры прадукцыі, уведзенай на рынак каля паўтара года таму, начальнік аддзела маркетынгу ААТ «Калінкавіцкі мясакамбінат» Вольга Юдзіна. — Напрыклад, гэта рулеты «Банкет», выраблены з языка і вушэй, «Мядзведжына вушка», у састаў якога, акрамя вушэй, уваходзіць мяса свініны з рулькі і галёнкі. Або рулеты «Духмяны» з пячонкай ці «Сялянскі» з субпрадуктаў.

Безумоўна, рулет «Банкетны» — гэта хуткачэй далікатэс, не кожнаму пакупніку ён па кішэні. Але прадпрыемства вырабляе дастаткова шырокі асартымент згаданых прэсаваных прадуктаў, тэму якіх мы закранулі, каб дагадзіць літаральна кожнаму спажыўцу — і па смаку, і па грашах. Той жа мясны прадукт «Сялянскі» з пячонкай прадаецца па цане сальцісона, зельца. А ўвогуле ў якасці пацверджання таго, што крызіс крызісам, а есці трэба штодня, суразмоўца назвала павялічэнне аб'ёмаў вытворчасці на прадпрыемстве, скажам, каўбас, у параўнанні з леташнім годам.

Вэнджаныя, марынаваныя курыныя яйкі, яечныя каўбаскі ад ААТ «Салігорская птушкафабрыка» можна назваць для прадпрыемства адноснай навінкай. Хоць для многіх пакупнікоў, сцвярджае начальнік гандлёвага аддзела Марына Высоцкая, гэтая прадукцыя такой застаецца і дагэтуль. І, дарэчы, няблага б было прывіць ім культуру спажывання яек, узбагачаных селенам. Дарэчы, ААТ «Салігорская птушкафабрыка» і зараз застаецца ў краіне першым і адзіным прадпрыемствам, якое пачало ўзбагачаць селенам і вітамінам «Е» перапяліныя яйкі. Як распавяла далей суразмоўца, у зімовы час цана на яйкі будзе трымацца: час зніжак сумесна з розніцай традыцыйна арганізуецца ў вясенне-летні час — праз рознага кшталту акцыі...

ТДА «Салодкі бераг» з Мінска прадстаўляе на аптовай харчовай выставе-кірмашы навінку ў выглядзе... журавін сухой сушкі з цукрам. Мы з фатографам паспыталі: сапраўды, вельмі смачна. І смак ягад добра адчуваецца, і яны, дзякуючы цукру, не такія кіслыя. Тое, што можна набыць у крамах прэзентуе на харчовым форуме дзве галоўныя свае навінкі. Па-першае, гаворка ідзе пра хлебную серыю — сумесі для бытавых хлебапечак.

— Яны цалкам збалансаваныя, гатовыя для прыгатавання з іх хлебабулачных вырабаў, — не трэба ні дражджэй, ні солі. Гаспадыні трэба толькі згодна з інструкцыяй дадаць вадкія інгрэдыенты — ваду, алей — і ўстанавіць адпаведную праграму, — распавёў нам намеснік дырэктара па маркетынгу прадпрыемства Аляксандр Кушнір. — У — журавіны, абсыпаныя цукровай пудрай — крыху іншы прадукт.

— Пагадзіцеся, булачка з разынкамі — гэта ў нас ужо нешта дастаткова вядомае. А вось з журавінамі — іншая справа, — гаворыць намеснік дырэктара кампаніі-імпарцёра Вера Голуб. — Каля 80 працэнтаў нашых спажыўцоў — гэта кандытарскія цэхі, хлебазаводы. Прычым рэгіёны нашу прадукцыю бяруць лепш, чым спешчаны Мінск. Дарэчы, што яшчэ цікава: журавіны сухой сушкі з цукрам карыстаюцца попытам у Лунінецкім раёне — гэтым прызнаным краі клубніц! Калі гаварыць пра рознічны гандаль, ён не вельмі ахвотна бярэ навінку, актыўнасць, як сказала, праяўляюць заводы.

На жаль, як высветлілася, навінка... зусім не беларускага паходжання. Здавалася б, і сумніву ў тым не павінна было быць, што ягада — з нашага Палесся! Але ж не, каліфарнійская вытворчасць... Вера Голуб патлумачыла, што справа — у затратнасці гэтай самай вытворчасці. З журавін пад вакуумам выдаляецца вільгаць і дысперсійным спосабам дадаецца цукар.

ААТ «Мінскі камбінат хлебапрадуктаў» сярэднім такая гатовая сумесь каштуе 3 тысячы рублёў. З яе атрымліваецца адзін кілаграм гатовага хлеба.

Другая навінка ад ААТ «Мінскі камбінат хлебапрадуктаў» — макаронныя вырабы. Зусім нядаўна на прадпрыемстве была ўведзена новая лінія магутнасцю 10 тысяч тон у год у рамках дзяржаўнай праграмы імпартазамяшчэння. Мяркуецца, дзякуючы гэтаму доля макаронных вырабаў ад згаданага прадпрыемства складзе 15 працэнтаў.

— Чым мяркуецца зацікавіць пакупніка, прывабіць да новай прадукцыі?

— Найноўшымі тэхналогіямі вытворчасці і сыравінай. Калі ведаеце, некалі макаронныя вырабы былі з макароннай крупкі. Тыя айчынныя макаронныя вырабы, што выпускае барысаўскае прадпрыемства, з пшанічнай мукі вышэйшага гатунку. У нас жа будзе не завазная сыравіна: макаронную крупку будзем мець уласнай вытворчасці. У выніку наша прадукцыя, як мяркуецца, будзе даражэйшай за іншыя айчынныя вырабы, якія каштуюць прыкладна 7 тысяч рублёў за кілаграм, але танней за імпартныя, што прадаюцца ад 12 тысяч рублёў за кілаграм і вышэй. Нашы макаронныя вырабы будуць каштаваць недзе каля 9 тысяч рублёў за кілаграм, — сказаў Аляксандр Кушнір. — Па знешнім выглядзе яны не будуць адрознівацца ад імпартных, а пры варцы захаваюць форму.

Прасаваныя мясныя прадукты ад ААТ «Калінкавіцкі мясакамбінат» дэманструе начальнік аддзела маркетынгу Вольга ЮДЗІНА.

...На выставе — сапраўднае спаборніцтва за патэнцыяльнага пакупніка не толькі пры дапамозе якаснай і разнастайнай прадукцыі (чые смакавыя, напрыклад, уласцівасці ўжо добра вядомыя кліентам): экспаненты ці не спаборнічаюць за тое, чый стэнд афармлены з большым густам, фантазіяй. Адны ўдзельнікі выбралі стыль афармлення вясковай хаты ці шынка, іншыя — аддалі перавагу антычным матывам. З цеста, мясных вырабаў зроблены адмысловыя кампазіцыі: карта краіны, карабель пад ветразямі, нейкія дзівосныя расліны. Нават манекен дзяўчыны, апрануты ў строй з... мясных вырабаў. Паглядзець на гэтыя творы сапраўдных майстроў будзе цікава не толькі спецыялістам, але і шэраговым наведнікам аптовай харчовай выставы-кірмашу. Тым больш што падчас яе працы пройдуць шматлікія дэгустацыі прадукцыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Bella!!! Венесуэла!

Венесуэла — краіна-рэкардсмен па колькасці перамог на «Міс свету»

Самай прыгожай дзяўчынай свету на конкурсе «Міс свету-2011» прызналі Івіян Лунасол Саркас Калменарэс з Венесуэлы. Першай віцэ-міс стала прадстаўніца Філіпінаў, другой віцэ-міс — дзяўчына з Пуэрта-Рыка.

Івіян Саркас — самая малодшая ў сям'і з 12 дзяцей. Яна рана страціла бацькоў і разам з братамі і сястрычкамі гадавалася ў манастыры. Як прызнаецца сама «Міс свету-2011», у свой час яна ўсур'ёз разглядала магчымасць свайго далейшага манаскага жыцця. Аднак склалася па-іншаму. Сёння 21-гадовая прыгажуня працуе ў тэлевяшчальнай кампаніі, захапляецца валейболам і альпінізмам.

— Я спадзяюся скарыстацца тытулам па максімуме, — прызналася шчаслівая пераможца журналістам. — Я буду імкнуцца дапамагчы тым людзям, якія маюць патрэбу. Асабліва такім жа сіротам, як я. Акрамя таго, я хацела б дапамагчы пажылым людзям і «цяжкім» падлеткам. Столькім людзям, колькім змагу.

Тым часам у Кітаі завяршыўся конкурс прыгажосці «Міс Інтэрнэшнл», у якім удзельнічала беларуска Ульяна Валахоўская, «Міс Мінск-2011». На жаль, Ульяне не ўдалося ўвайсці ў ТОП самых прывабных дзяўчат на конкурсе. Перамогу аддалі Марыі Алфара з Эквадора. Першай жа віцэ-міс прызналі... венесуэлку.

Сёння Венесуэла — рэкардсмен па колькасці перамог на буйнейшых конкурсах прыгажосці. У сваім актыве краіна мае па шэсць перамог на конкурсах «Міс свет», «Міс Сусвет» і «Міс Інтэрнэшнл».

Ілья ЛАПАТО.

СПАЧАТКУ ТРЭБА ПАЧАЦЬ ДАВЯРАЦЬ АДНО АДНАМУ, А ТОЛЬКІ ПОТЫМ РЭАЛІЗОЎВАЦЬ СУПОЛЬНЫЯ ПРАЕКТЫ?

Тэрмін «дзяржаўна-прыватнае партнёрства» ўсё часцей і часцей можна пачуць як з вуснаў беларускіх чыноўнікаў, так і з вуснаў прадстаўнікоў бізнэсу (зараз нават распрацоўваецца праект Закона «Аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве»). Але ці ўсе разумеюць сутнасць гэтага тэрміна? Бо за мяжой партнёрскія адносіны дзяржавы і бізнэсу развіваюцца даўно, а ў нас гэтая тэма толькі пачынае набываць актуальнасць. Для таго, каб можна было павучыцца на чужых памылках (на сваіх яшчэ паспеем), Савет па развіцці прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь разам з Усходнім камітэтам германскай эканомікі правялі ў Мінску «круглы стол», дзе прадстаўнікі айчыннай бізнэс-супольнасці паслухалі пра станоўчы і адмоўны досвед дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў Германіі.

Штэфан РЭХТЭН, прадстаўнік нямецкай юрыдычнай фірмы «Байтэн Буркхард», адразу папярэдзіў, што тэма дзяржаўна-прыватнага партнёрства і для Германіі з'яўляецца дастаткова новай: актыўная дыскусія і практычная рэалізацыя праектаў у рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў Германіі пачаліся толькі недзе з 2000 года. А да гэтага немцы ўважліва вывучалі вопыт іншых краін (напрыклад, Вялікабрытаніі і Францыі), дзе сумесныя праекты дзяржавы з бізнэсам пачалі стварацца раней — з 80-х гадоў XX стагоддзя.

— Германія 10 гадоў таму меркавала, што дзяржаўна-прыватнае партнёрства — гэта цудоўны сродак ці рэцэпт, які можа вырашыць усе праблемы. Але сёння мы заўважаем, што гэта не так, — расказвае Штэфан Рэхтэр. — Дзяржаўна-прыватнае партнёрства ў лепшым выпадку з'яўляецца добрай дадатковай альтэрнатывай для выканння тых ці іншых задач, але гэта не той інструмент, які можа вырашыць усе праблемы і забяспечыць іх найлепшую рэалізацыю. Зараз мы разумеем, што кожны праект трэба разглядаць індывідуальна і даследаваць яго на прадмет таго, ці падыходзіць ён для рэалізацыі ў рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

У чым выгода ад рэалізацыі праектаў у рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства? Грамадзянін хоча атрымліваць паслугі высокай якасці і па прымальных цэнах, а дзяржава мае абавязак гэтыя паслугі аказваць. Але часта атрымліваецца так, што дзяржава не спраўляецца з аказаннем гэтых паслуг: ці то грошай не хапае, ці то з-за манапольнага становішча гэтыя паслугі аказваюцца няякасна. Як вырашыць гэтую праблему? Бо патрэбы ў паслугах растуць, а падымаць узровень падаткаў для таго, каб напоўніць бюджэт, нельга. Таму ўзнікае развязанне — прыцягнуць бізнэс да вырашэння гэтай задачы.

— Але прадпрымальніка нельга абавязаць рабіць нейкую працу, калі ён гэтага не хоча. Таму трэба стварыць прывабныя ўмовы для таго, каб прыватныя прадпрыемствы пажадалі ўдзельнічаць у гэтым працэсе, — кажа Штэфан Рэхтэр. — Трэба даць прадпрымальнікам зарабіць, бо інакш у іх не будзе цікавасці для праекта. Але трэба ўстанаўліваць і пэўныя абмежаванні, каб гэта не было бізнэсам у чыстым выглядзе: бо капіталізм зацікаўлены ў максімізацыі прыбытку і можа прапаноўваць паслугі па цэнах, якія грамадзянін не ў стане заплаціць. Таму сярэдні шлях — стварыць стратэгічны альянс паміж прыватным бізнэсам і дзяржавай, каб разам аказваць паслугі.

Пры гэтым Штэфан Рэхтэр заўважыў, што праектамі дзяржаўна-прыватнага партнёрства лічацца тыя праекты, рэалізацыя якіх разлічана на працяглы тэрмін: гэта не 3-4 месяцы, а не менш за 5 гадоў. У асобных выпадках — і да 50-60 гадоў. У Германіі, дарэчы, большасць праектаў у рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства разлічана на тэрмін у 20-25 гадоў.

Ты мне мост, а я табе — права збіраць плату за яго выкарыстанне

Цікава, што праекты ў рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства могуць выконвацца ў розных формах. Напрыклад, у Германіі, па словах Штэфана Рэхтэра, найбольш распаўсюджаны распараджальная і канцэсійныя мадэлі. Першая заключаецца ў тым, што прыватнік будуе нейкі будынак, эксплуатуе яго, напрыклад, 20 гадоў, а ўвесь гэты час дзяржава выплачвае яму нейкую фіксаваную суму грошай. Для дзяржавы больш выгадна расцягнуць плацяжы на 20 гадоў, чым адразу знайсці ўсе сродкі на будаўніцтва гэтага аб'екта. А прадпрымальнік, у сваю чаргу, атрымлівае на 20 гадоў гарантаванае паступленне грошай. Канцэсійная мадэль трошкі адрозніваецца: суднасць яе заключаецца ў тым, што дзяржава дае права на аказанне нейкай паслугі. Класічны прыклад — гэта будаўніцтва тунэля ці моста: прыватнік будуе мост за свае грошы, але за гэта яму дзяржава дае права браць плату за карыстанне аб'ектам на працягу, скажам, 20-30 гадоў (вядома, памер гэтай платы папярэдне абгаворваецца, каб яна была даступная для грамадзян і адначасова дазваляла прадпрымальніку акупіць аб'ект). Для дзяржавы канцэсійная мадэль вельмі выгадная, бо, не ўкладаўшы ў будаўніцтва ні капейкі, яна атрымлівае новую інфраструктуру, якая, дарэчы, праз гэтыя самыя 20-30 гадоў пераходзіць ва ўласнасць дзяржавы. Але вось што тычыцца бізнэсу, то ў яго, акрамя зацікаўленасці, існуюць і вялікія рызыкі:

— Ёсць сур'ёзная рызыка для прыватніка, бо ён не ведае, колькі людзей будзе карыстацца пабудаваным тунэлем ці мостам. Напрыклад, ён разлічыў, што кожны дзень тысяча аўтаўладальнікаў будзе карыстацца аб'ектам. Але калі ніхто не захоча ездзіць і трафік будзе толькі 200 машын за дзень? У гэтым выпадку ў бізнэсмена будуць вялікія праблемы з акупляльнасцю. А з іншага боку, праз мост ці тунэль можа праязджаць і 2 тысячы машын за дзень — тады гэта будзе вельмі добры бізнэс для прыватніка. Але рызыка ёсць, і ацаніць яе вельмі складана, — лічыць прадстаўнік юрыдычнай фірмы «Байтэн Буркхард»

Менавіта з-за гэтых рызык у Германіі вельмі мала праектаў рэалізоўваюцца па канцэсійнай мадэлі: прынамсі, Штэфан Рэхтэр прывёў адзін з няўдалых прыкладаў — людзі не захацелі скарачаць сабе шлях і плаціць 1,5 еўра за выкарыстанне тунэля, а па-ранейшаму едуць у аб'езд. Таму распараджальная мадэль, калі прадпрымальнік атрымлівае пэўную суму ад дзяржавы штогод ці штомесяц, з'яўляецца найбольш распаўсюджанай — яе пралічыць больш проста.

«Калыханне маятніка»: спачатку хвалім, потым лаем

Цікава, што ў Германіі з цягам часу стаўленне да прыватна-дзяржаўнага партнёрства пачало мяняцца — Штэфан Рэхтэр называе гэты працэс «калыханнем маятніка»:

— Да 2006 года ў нас была эйфарычная фаза, калі паўсюль казалі пра дзяржаўна-прыватнае партнёрства і ўсе праекты намагаліся рабіць у гэтых рамках. А потым былі рэалізаваны першыя праекты, і высветлілася, што ёсць добрыя праекты, а ёсць і не вельмі добрыя. У гэты час адбыліся пэўныя палітычныя змены ў Германіі, ва ўрад увайшла іншая партыя, прадстаўнікі якой схіліліся да таго, што ёсць пэўныя тэмы, якія дзяржава не павінна аддаваць, — энергетычнае забеспячэнне, вада, транспарт і г. д. Такім чынам, маятнік калыхнуўся ў іншы бок, і ўсе пачалі казаць, што праекты ў рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства дрэнна працуюць і з гэтага нічога не атрымаецца.

Але недзе з 2009 года стаўленне да дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў Германіі зноў памянялася — гэты этап Штэфан Рэхтэр называе «фазай рэалізму»:

— Зараз да дзяржаўна-прыватнага партнёрства стаўленне вельмі дзелавое: спецыялісты лічаць, што гэта хутчэй за ўсё добра і не заўсёды дрэнна — усё залежыць ад праекта. Таму кожны праект правяраецца, ці ёсць сэнс яго рэалізоўваць у рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства, і непрыдатныя для гэтага праекты адсейваюцца яшчэ на этапе ацэнкі.

Штэфан Рэхтэр расказаў, што ў Германіі ў асноўным у рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства рэалізуюцца будаўнічыя праекты ў транспартнай сферы — аэрапорты, тунэлі, дарогі, масты і г. д. Але таксама ёсць практыка і па стварэнні адміністратыўных будынкаў, школ, дзіцячых садкоў, бальніц. Цікава, што дзяржаўна-прыватнае партнёрства можна рэалізаваць нават у... турме. Вядома, аховай зняволеных па-ранейшаму павінна займацца дзяржава, але чаму не аддаць прыватніку турэмны харчблок або забеспячэнне пасцельнай бялізнай?

Цікава таксама, што ў Германіі яшчэ няма ніводнага праекта ў рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства, які б быў рэалізаваны да канца. Бо з 2000 года, калі пачалі рэалізоўвацца першыя праекты, прайшло толькі 11 гадоў, а яны разлічаны на 20-25 гадоў. Такім чынам, як кажа Штэфан Рэхтэр, канчатковыя высновы можна будзе рабіць толькі яшчэ праз 10-15 гадоў, калі будзе хоць адзін завершаны праект.

Міфы пра дзяржаўна-прыватнае партнёрства

Таксама нямецкі эксперт падзяліўся с беларускімі калегамі найбольш распаўсюджанымі міфамі вакол дзяржаўна-прыватнага партнёрства і расказаў, якія з іх спраўдзіліся, а якія — не. Напрыклад, першапачаткова існавалі такія апасенні, што рэалізаваць праекты ў рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства будзе толькі буйны бізнэс, а малы і сярэдні — застануцца «з носам». Але час паказаў, што для малога і сярэдняга бізнэсу такая практыка прынесла нават карысць: бо пры рэалізацыі праектаў узнікаюць заказы, якія могуць выконвацца толькі вузкімі спецыялістамі, і таму дробныя фірмы прыцягваюцца ў якасці субпадрадчыкаў.

Час таксама паказаў, што рэалізацыя дзяржаўна-прыватнага партнёрства не вядзе да такой эканоміі сродкаў, як чакалася:

— Сапраўды, нейкія сродкі эканомяцца, але не настолькі вялікія: бо чакалася эканомія ў 20-30%, але вопыт паказвае, што рэальна яна складае толькі каля 10%. Вядома, і гэтая лічба вельмі прыемная, асабліва калі ўлічваць, што якасць рэалізацыі праектаў атрымліваецца вельмі добрая. Але ўсё ж гэта не настолькі эйфарычна, як мы ўяўлялі раней, — расказвае Штэфан Рэхтэр.

Былі ў Германіі і некаторыя спрэчкі наконт таго, ці трэба прымаць асобны закон, які б рэгуляваў сферу дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Але вопыт паказаў, што гэты напрамак можа развівацца і без прыняцця асобнага дакумента — у Германіі і зараз няма асобнага закона пра дзяржаўна-прыватнае партнёрства. Праўда, Штэфан Рэхтэр лічыць, што яго прыняцце магло спрасціць жыццё бізнэсу:

— З аднаго боку, кожны закон, якога няма, — гэта добры закон. Але з іншага боку, гэта недахоп, калі існуе шмат законаў, якія мяняюцца. Тады ўсё нельга ахапіць позіркам і вельмі складана зразумець, якія заканадаўчыя ўмовы дзейнічаюць для праекта. Асабіста я лічу, што для карыстальнікаў было б прасцей, каб усё было сабрана ў адным законе. Я ведаю па вопыце Польшчы і Чэхіі: там былі прыняты асобныя законы і працаваць было нашмат прасцей.

Беларусь першы этап партнёрства прайшла?

Калі ж вяртацца да Беларусі, то, як лічаць спецыялісты, у нас дзяржаўна-прыватнае партнёрства мае вельмі добрыя перспектывы для рэалізацыі:

— Ва ўмовах трансфармацыі ролі дзяржавы ў эканоміцы з'яўляецца неабходнасць альтэрнатывы прамому рэгуляванню эканамічных працэсаў. Адна з іх — інстытут дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Ён дазваляе прыцягнуць у эканоміку дадатковыя рэсурсы, перарасперкаваць рызыкі паміж дзяржавай і прадпрымальніцкім сектарам, накіраваць намаганні прадпрымальнікаў на вырашэнне значных для грамадства сацыяльна-эканамічных задач, — лічыць **Уладзімір ЗІНОЎСКІ, старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта, старшыня Савета па развіцці прадпрымальніцтва.** — Эвалюцыя ўзаемаадносін інстытутаў дзяржавы і прадпрымальніцтва ў розных краінах даказала, што іх канструктыўнае ўзаемадзеянне з'яўляецца адным з найважнейшых фактараў паспяховага сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Таццяна БЫКАВА, дарадчык па эканамічных пытаннях Рэспубліканскага фонду садзейнічання развіццю прадпрымальніцтва, лічыць, што ўзаемадзеянне бізнэсу і ўлады можна падзяліць на два этапы:

— У адносінах да дзяржаўна-прыватнага партнёрства існуюць два падыходы. Першы — шырокі, калі пад партнёрствам паміж дзяржавай і бізнэсам мы падразумяваем сумесную працу па фарміраванні асноўных напрамкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, умоў ажыццяўлення бізнэсу, умоў інвестыцыйнай дзейнасці і г. д. Другі — больш вузкі: калі мець на ўвазе замежны вопыт, то амаль паўсюль у свеце дзяржаўна-прыватнае партнёрства разглядаецца як сумесная дзейнасць па рэалізацыі нейкіх супольных праектаў. І падзяляць гэты два падыходы няправільна — гэта як эвалюцыя дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Бо, напэўна, узаемадзеянне на ўзроўні фарміравання нейкіх макраэканамічных умоў — гэта першы этап: калі дзяржава і бізнэс не будуць разумець адно аднаго ў пытаннях перспектыў і стратэгій развіцця, калі яны не будуць давяраць адно аднаму, то пра рэалізацыю нейкіх інвестыцыйных супольных праектаў не можа быць і размовы.

Сёння, паводле слоў Таццяны Быкавай, у Беларусі ўжо існуюць пэўныя элементы партнёрства наконт дыялогу дзяржавы і бізнэсу: напрыклад, ужо ніводны прадпрымальніцкі саюз не можа казаць пра тое, што дзяржава прымае эканамічныя рашэнні без уліку інтарэсаў бізнэс-супольнасці.

— Таму мы, як я разумею, плаўна падыходзім да іншага этапу — калі дзяржава і бізнэс знаходзяцца на такой стадыі дыялогу, што яны могуць браць на сябе сумесныя рызыкі, выпрацоўваць нейкія стратэгічныя падыходы да рэалізацыі тых ці іншых праектаў і сумесна ажыццяўляць іх так, каб гэта было выгадна для ўсіх бакоў.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Наўздагон

КАЛІ ЗАЧАПІЛА ЗА ЖЫВОЕ

Не магу сказаць, што не прадбачыла інтэрнэтных крытыкаў свайго матэрыялу пад рубрыкай «Нефармат» у газеце за 5 лістапада, аб чым і папярэджвала, але не думала, што настолькі ён зачэпіць за жывое многіх. Цікава, што «каментатары» розных сайтаў павыхоплівалі асобныя сказы, папераварочвалі словы і думкі і ўжо, кажучы іх мовай, адцягваліся, хто на што здольны. Ну, іх можна зразумець, яны матэрыял не чыталі, ім гэта і не трэба, куды важней самавыявіцца. Хто чытаў, той зразумеў, пра якія талоны ідзе гаворка — талоны на танную малочную прадукцыю як магчымую частковую меру забеспячэння небагатых сем'яў да выраўноўвання цэн.

Але не гэта зачапіла іх за самае жывое, як аказалася, а прапанова падтрымаць падаткаплацельшчыка, працаўніка, які сваімі працоўнымі адлічэннямі ўтрымлівае адукацыю, ахову здароўя, культуру, армію і г.д. Многія ўжо нядрэнна ўладкаваліся ў гэтым жыцці і лічаць, што «дурні» павінны плаціць падаткі ў казну, рабіць адлічэнні ў пенсійны фонд, а яны, «разумныя», і так абыдуцца. У нашым кааператыве вырашылі рамантаваць дах. Усе летнія месяцы збіралі грошы, прыкладна па мільёну з кватэры... а восенню тыя грошы сталі вяртаць. Аказалася, прыкладна палова жыльцоў пад'езда не палічыла патрэбным здаваць на рамонт. Яны разважылі так: няхай дурні здаюць, няхай за іх кошт рамантуюць, на нас у любым выпадку не пацячэ са столі... Няхай адны прыбіраюць альбо аплачваюць прыборку вуліц, а мы будзем смеціць... Няхай адны робяць за другіх... Небяспечна, што вось такія настроі становяцца часткай светапогляду пэўнай праслойкі насельніцтва.

І яшчэ. У Мікашэвічах нядаўна затрымалі 23-гадовага чалавека за гандаль наркотыкамі. За руку злавілі. А раней законнай падставы папытаць, адкуль два аўтамабілі, дарагія рэчы ў беспрацоўнага, не было. Паводле логікі «разумных», хлопец — герой нашага часу, здолеў забяспечыць сабе прыгожае жыццё, а колькім такім жа маладым ён зламаў жыцці, нікога не павінна датычыцца. У кантэксце гэтага трэба думаць пра нейкія цывілізаваныя меры абароны падаткаплацельшчыкаў. Можа, ёсць сэнс абавязаць тых, хто не працуе, запаўняць дэкларацыі з тлумачэннем крыніц сваіх даходаў у выпадку набыцця нерухомасці альбо іншых дарагіх рэчаў. У турму ж я нікога пакуль садзіць не прапаноўвала, як пішуць, але ж, відаць, кожны сам ведае, на колькі гадоў яго справы цягнуць. Ва ўсім свеце падатковае заканадаўства даволі суровае, а парушэнні не маюць тэрміну даўніны.

Сёння вельмі цяжка зводзіць канцы з канцамі многім катэгорыям людзей, якія жывуць на зарплату, асабліва ў невялікіх гарадах, у вёсках. А крыніцай дзяржаўных магчымасцяў найперш з'яўляюцца падаткі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

МАСАВЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Рэдакцыя газеты «Звязда» аб'яўляе масавы конкурс рашэнняў шахматных задач і эцюдаў, а таксама задач на кааператыўны і адваротны мат.

Аматарам шахмат будзе прапанавана для рашэння 18 кампазіцый.

За правільнае і поўнае рашэнне кожнай конкурснай двухходаўкі ўдзельнік конкурсу атрымае 2 очкі, трохходаўкі — 3, шматходаўкі — 4 очкі, эцюда — 5 очкоў. За выяўленне пабочных рашэнняў дуаляў у ідэйных варыянтах, нерашальнасць задання налічваюцца дадатковыя очкі (1—3).

Пры афармленні рашэнняў лепш за ўсё іх прыводзіць на паштоўках. Умову задання паўтараць не трэба (указваецца толькі яго нумар). Для двухходаўкі дастаткова прывесці толькі першы ход, для трохходаўкі, апрача ўступнага ходу, трэба прывесці варыянт-пагрозу, хады чорных, якія абараняюцца ад гэтай пагрозы (калі задача на цугцванг, то ўсе хады чорных), і другія хады белых; для шматходавак варыянты можна абрываць за ход да мата; для .эцюдаў неабходна прывесці ўсе хады, якія вядуць да выйгрышу або нічыёй.

У задачах на кааператыўны мат — усе хады, у задачах на адваротны мат — усе хады, акрамя матуючага ва ўсіх варыянтах на поўную глыбіню, уключаючы пагрозу, калі яна таксама праходзіць на поўную глыбіню.

Кантрольны тэрмін прысылкі адказаў на заданні — два тыдні з дня апублікавання (па паштовым штэмпелі).

У пісьмах абавязкова ўказвайце сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, паштовы індэкс, поўны адрас. Калі вы не супраць, укажыце вашу кваліфікацыю ў шахматах, бо гэты конкурс мае кваліфікацыйны характар.

Паспяховае выступленне ў ім дае магчымасць атрымаць другі разрад па шахматах.

Тры пераможцы атрымаюць прызы (кнігі) і дыпломы, а ўдзельнікі, якія набяруць 75% ачкоў, атрымаюць дыпломы.

Адказы на конкурсныя заданні дасылайце на адрас рэдакцыі газеты «Звязда» з паметкай «Шахматы»: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-А.

Даведка. У задачах на кааператыўны мат заўсёды пачынаюць чорныя (калі няма спецыяльнай агаворкі). Сумесныя намаганнямі абодва бакі стварааюць матавую сетку вакол пазіцыі чорнага каралля.

Прыклад. **Белыя**: Крf3, Лf1, Лf2 (3). **Чорныя**: Кра7, Лb7, Са8, пп. а6, b6 (5).

Кааператыўны мат за 3 хады.

Рашэнне: 1. Лf7+ Крe3 2. Ch1 Лf6 3. Лg2 Л1f7х.

У задачах на адваротны мат пачынаюць белыя. Яны вымушаюць чорных аб'явіць мат беламу каралю.

Прыклад. **Белыя**: Кра8, пп. а7, b7, d3, f7, g7, h7 (7). **Чорныя**: Kph3, Ch1, пп. g2, g3, g4, h2 (6). Адваротны мат за 4 хады. Рашэнне: 1. b8C! Kph4 2. h8 Ф+ Kpg5 3. g8Л+ Kpf5 4. f8 К Цугцванг. 4. g1 Фх. 1... g1Ф? — мат не вымушаны).

ЗАДАННЕ № 1

Белыя: Крe1, Фf5, Cf7 (3).
Чорныя: Kph4, Cf1, пп. g5, h7 (4).
Мат за 2 хады.

ЗАДАННЕ № 2



Белыя: Крe3, Фе4, Лe7 (3).
Чорныя: Крe1, Лb8, Са8, п. с3 (4).
Мат за 2 хады.

Чакаем вашых адказаў.

ИНФОРМАЦИЯ
о проведении повторного аукциона без условий по продаже имущества, обращенного в доход государства»

Адрес объектов и их наименование	Воложинский р-н, г.п. Ивенец, ул.Дзержинского, 53 • здание административного корпуса общей площадью 60,1 кв.м, здание цеха переработки молока общей площадью 569,9 кв.м, гараж общей площадью 92,3 кв.м, проходная общей площадью 21 кв.м. **Начальная цена: 191 241 000 белорусских рублей.** Шаг аукциона – 5% от предыдущей цены.
Продавец	Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Вилейском районном исполнительном комитете
Организатор аукциона	СИКУП «УКС-СЕРВИС», г. Молодечно, ул. Мира, 15
Сумма задатка	**10 %** от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС»
Порядок оплаты	Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-СЕРВИС»
Документы, представляемые для участия в аукционе	Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, заверенные нотариально, доверенность, выданная представителю юридического лица; физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Конечный срок и адрес приема заявок	**21.11.2011 г. до 16.00,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел.: (8 0176) 73 00 13, 75 16 09, (факс) 75 19 20; моб. 8 (044) 710 74 60
Дата, время и место аукциона	**22.11.2011 г. в 15.00,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1.

Погляд

ДВА СВЯТЫ

Беларусь у чарговы раз адсвяткавала гадавіну Вялікага Кастрычніка, хоць у Расіі ўжо адзначаюць іншае свята...

1

Якая краіна, акрамя Беларусі, яшчэ святкуе Вялікую Кастрычніцкую рэвалюцыю? Магчыма, мы адны на цэлым свеце, але пасля 1917 года гэты свет стаў іншым. Капітал пад націскам народных мас, якія бударажыў «прывід камунізму», пачаў здаваць свае пазіцыі — дзявіцца прыбыткам. І сёння мы жывём у свеце, які сфарміраваўся ў барацьбе двух ідэй.

Беларусь, у палітычным плане, адрадзілася толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Мы не можам ігнараваць факт абвяшчэння ў 1918 годзе БНР, але дэ-факта на палітычнай і геаграфічнай карце свету Беларусь з'явілася пры У. Леніну, а пасля вайны заняла сваё месца ў ААН. Без гэтага важнейшага фактара не было б сённяшняй незалежнай Беларусі ці шлях да свайго суверэнітэту ў нас быў бы зусім іншым. Безумоўна, Савецкая Беларусь з'яўлялася дэкаратыўнай дзяржавай, але была аформлена юрыдычна.

Але як тады быць з рэпрэсіямі, калектывізацыяй, раскулачваннем? Сумна, але ўсё гэта было ў сталінскі перыяд і Кастрычніцкая рэвалюцыя, безумоўна, заклала падмурак пад той перыяд. Толькі вось наш народ не меў выбару.

У царскай Расіі было забаронена нават слова Беларусь, якое замянілі «Северо-Западным краем», а народ спазнаў галечу, прыгнёт і нацыянальнае бяспраўе. Невыпадкова Расійскую імперыю называлі «турмой народаў».

Сёння прыхільнікі самадзяржаўя навязваюць думку, што Ленін быў нямецкім шпіёнам і рэвалюцыя адбылася на грошы германскага генштаба. Ніякія фінансавыя ўліванні не дапамаглі б, калі б народ любіў «цара-бацюшку». Царызм быў ненавісным — манархія зжыла сябе. Падчас руска-японскай вайны на сходзе ў Віцебску студэнты крычалі: «Няхай жыве Мікада!» Вітаючы японскага імператара, студэнты пратэставалі супраць царызму.

Успомнім, як перад распадам Саюза на мітынгу перад Домам урада спрабавалі пакласці да помніка Леніну вянкі з калючага дроту. Хоць пры У. Леніну Беларусь развіталася з мінулым, атрымала статус рэспублікі і ў яе з'явілася перспектыва. І ніхто не ведаў, што чакае беларусаў напарадзе. Ды што Ленін, нават постаць «жалезнага Фелікса» для Беларусі не такая ўжо і «злавесная». Калі Ф. Дзяржынскі нанёс удар па манархіі і вынішчыў расійскую арыстакратыю, дварянства, духавенства — усю тагачасную эліту Расіі, ён такім чынам адпомсціў за тры падзелы Польшчы. Цікава, бальшавік і чэкіст Ф. Дзяржынскі адчуваў сябе палякам ці ўся яго дзейнасць падпарадкоўвалася рэвалюцыйнай ідэі?

Разважаючы пра гэта, я хачу падкрэсліць, што ў нас свая гісторыя і што нават Кастрычніцкую рэвалюцыю мы павінны разглядаць праз прызму беларускасці.

Свята 7 лістапада ў нас афіцыйнае, але адзначаем яго мы больш па інерцыі, чым усвядомлена. Свята ёсць, а крамы працуюць, мінімум мерапрыемстваў, прысвечаных рэвалюцыі, — звычайны выхадны дзень.

А чаму не пераасэнсаваць падзеі 1917 года і не аддзяліць зерне ад шалупіння? У нас свая дзяржава, і мы абавязаны напаўняць беларускі суверэнітэт праўдзівай гісторыяй, а не прытрымлівацца чужых фальсіфікацый. Хтосьці царызм аплаквае, але чаго нам над ім галасіць? Цар у свядомасці беларусаў заўсёды быў чужародным целам — прынесеным звонку.

2

У Расіі афіцыйна «адхрысціліся» ад Вялікага Кастрычніка і ўстанавілі новае свята — Дзень яднання, якое прыпадае на 4 лістапада.

Зрабіць свята можна, але гэтага мала, бо неабходна, каб яно было падтрымана народам.

Праблема еднасці для шматнацыянальнай Расіі — адна з самых актуальных, і Дзень яднання, па задуме расійскага кіраўніцтва, павінен быў дапамагчы вырашыць гэтую праблему. А што мы ўбачылі на экранах тэлевізараў? Тое, што «Адзіная Расія» і «Народны фронт» пад дзяржаўнымі сцягамі вывелі свой электарат, нікога не здзівіла. А вось колькі прыхільнікаў сабраў «Рускі марш», то для «сытай» Масквы гэта было нечаканасцю. Тыя, хто ішоў пад чорна-жоўта-белымі манархісцкімі сцягамі, бачылі аднасць не расіян у цэлым, а толькі рускіх. І пэўная частка насельніцтва Расіі спачувае манархістам, бо яны шырока выкарыстоўваюць лозунгі з арсеналу камуністаў. Абрамовіча, Берозоўскага, як і іншых расійскіх алігархаў, агулам клеймавалі на тым мітынгу.

Тут у нацыяналістаў відавочная перавага, бо ўлада, якая звязана з алігархічным капіталам, не можа дазволіць сабе падобныя лозунгі — дарэчы, блізкія і зразумелыя простаму расіяніну.

У расійскім грамадстве ўжо чуюцца заклікі ўнесці ў пашпарт графу «нацыянальнасць». Каб, разгарнуўшы пашпарт, можна было прачытаць, з кім маеш справу.

На памяць прыходзіць «барадаты» анекдот пра тое, што б'юць не па пашпарце, а па мордзе...

Пагрозы рускаму чалавеку ў Расіі няма, але яе шукаюць, і на гэтым, іншым разам, робіцца палітыка.

Раней ва ўсім вінавацілі яўрэяў. Апошнія з'ехалі, і тады вінаватымі сталі каўказцы. Дык навошта той Каўказ заваёўвалі?

Яднанне народаў — для Расійскай Федэрацыі адзіна правільны шлях, але ўказам народы не аб'яднаеш.

У Расіі даволі працяглы час вялася атака на савецкае мінулае, рэвалюцыю і асабліва Леніна — смяяліся з сваёй гісторыі. Тым не менш, частка насельніцтва засталася з камуністамі, а ўлада не здолела нічога новага прапанаваць грамадству. І тады вакуум пачалі запаўняць тыя, хто бачыць у імператарскай Расіі нейкі ідэал. Сёння яны не могуць яшчэ ўплываць на палітычнае жыццё Расійскай Федэрацыі. А заўтра?

3

Ужо мала хто верыць у сацыялізм. А мы адзначаем свята дзяржавы, якой няма. Атрымліваецца, як са станцыяй «Плошча Леніна» ў метро. Станцыя ёсць, а плошчы такой няма. Што ж, мы яшчэ жывём у пераходным перыядзе, наша станаўленне працягваецца.

Хочацца, каб у нас былі свае святы, якія аб'ядноўвалі б беларусаў.

А тыя, хто ўздымае манархічныя сцягі, цягне ў мінулае. Беларусь павінна пазіраць у будучыню — там наша Свята.

Сымон СВІСТУНОВІЧ .

7 лістапада адбыўся ўрачысты мітынг каля помніка Леніну на сталічнай плошчы Незалежнасці. Камуністы ўсклалі кветкі да помніка ў гонар 94-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі...
Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «СлуцкОблГарант» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже здания по ремонту радиоаппаратуры, об. пл.167,7 кв.м, расположенного по адресу: **Минская обл., г. Логойск, ул. Садовая, д. 5.** (в т.ч. зеленые насаждения; теплосчетчик «Мультидата СІ ДУ15»).

Начальная цена с НДС – 121 313 273 бел. руб.

Цена снижена на 45%.

Площадь земельного участка – 0,0859 га.

Задаток 10% от начальной цены перечисляется на **р/с 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015,** Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 11.10.2011.

Аукцион состоится **25.11.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Порядок оформления и участия в аукционе на сайте **www.rlt.by.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.11.2011** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- **Оценка оборудования и транспортных средств**
- **Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности**
- **Независимая строительная экспертиза**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «САНТЭП»

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	№ лота	Наименование объекта	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Пресс-автомат листоштамповочный 6128 А, инв. № 421181	28 250 833	2 825 083	12	Машина точечной сварки МТ-2827, инв. № 421215	12 092 500	1 209 250
2	Пресс-автомат кривошипный 10-композиционный А 6126, инв. № 421180	17 385 000	1 738 500	13	Машина точечной сварки МТ-192, инв. № 42553	12 092 500	1 209 250
3	Пресс-автомат листоштамповочный К 11624, инв. № 42669	14 487 500	1 448 750	14	Машина точечной сварки МТ-2202, инв. № 421669	12 092 500	1 209 250
4	Пресс-автомат листоштамповочный многошпиндельный АА 6126 В, инв. № 421500	28 975 833	2 897 583	15	Моечная машина собственного изготовления, инв. № 421903	27 547 500	2 754 750
5	Пресс-автомат листоштамповочный многопозиционный К 18026, инв. № 42519	17 385 000	1 738 500	16	Кран мостовой двухбалочный, инв. № 42521	81 655 833	8 165 583
6	Пресс-автомат листоштамповочный АА 6130 А, инв. № 421537	57 950 833	5 795 083	17	Настольно-сверлильный станок СУС-1, инв. № 421835	1 235 000	123 500
7	Аппарат стального эмалирования, инв. № 42671	9 971 667	997 168	18	Станок пневмонакатной с ручным управлением, инв. № 42427	8 387 500	838 750
8	Реактор для х

Дата

Купалаваму перакладу «Слова пра паход Ігаравы» — 90 гадоў

ЯНКА Купала стаў першым беларусам, які пераклаў «Слова пра паход Ігаравы» на беларускую мову. Прычым зрабіў гэта двойчы: у прозе і ў вершах. «Я так зжыўся з творам, што, зрабіўшы пераклад, як бы адчуў сябе суаўтарам і гляджу на гэту сваю працу як на сваю ўласную творчасць», — пісаў Купала.

Вершаваны пераклад паэмы («Песня аб паходзе Ігара») беларускі пісьменнік скончыў 5 верасня 1921 года ў Акопах — і ў тым жа годзе пераклад надрукавалі ў газеце. «...Вершаваны пераклад... атрымаўся цудоўны: усюды відаць разуменне старога тэксту і прыкметна мастацкае пачуццё, не гаворачы ўжо пра лёгкі верш, які адпавядае зместу карціны. У Вашай апрацоўцы беларуская мова аказалася на вышыні», — хваліў перакладчыка Яўхім Карскі.

Упершыню празаічны пераклад паэмы «Слова пра паход Ігаравы» быў надрукаваны 11 лістапада 1919 года ў газеце «Беларусь» пад загалоўкам «Аповесць аб паходзе Ягоравым, Ягора Святаслаўлева, унука Алегава». Вершаваны варыянт перакладу ўпершыню з'явіўся ў газеце «Вольны сцяг» у 1921 годзе (№ 5, 6).

Акопы. У гэтых мясцінах 90 гадоў таму Янка Купала пераклаў «Слова пра паход Ігаравы».

Фота Анатоля КІШЧУКА.

У Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы працуе дакументальна-мастацкая выстаўка, прымеркаваная да 90-гадовага юбілею вершаванага перакладу Купалам старажытнаславянскай паэмы. Узаемасувяззю літаратуры і мастацтва назвалі выстаўку яе складальнікі.

Выстаўка аб'яднала дзве часткі. Першая — мастацкая: графічныя ілюстрацыі 1984 года, створаныя да перакладу «Слова пра паход Ігаравы» народным мастаком Беларусі Георгіем Паплаўскім і мастачкай Аленай Лось. Графічныя ілюстрацыі змяшчаюць інтэрпрэтаваныя мастакамі сцэны з паэмы.

Другая і галоўная частка — Купалаўскія рукапісы перакладу «Слова...», кнігі з публікацыяй паэмы на рускай мове, а таксама адзінае асобнае выданне перакладу ў 1938 годзе.

— Пры жыцці Купалы толькі аднойчы яго пераклад выдаваўся асобнай кнігай — у 1938 годзе. І гэты пераклад у нас ёсць, — гаворыць **вядучы навуковы супрацоўнік літаратурнага музея Янкі Купалы Фаіна ВАДАНОСАВА**. Даследчыкі адзначаюць, што вершаваны варыянт Купалавага перакладу — вяршыня яго перакладчыцкай дзейнасці. Гэтай выстаўкай мы хочам паказаць якраз перакладчыцкае майстэрства песняра.

Ілья ЛАПАТО.

Каментарый даследчыцы **«Слова пра паход Ігаравы», кандыдата філалагічных навук Людмілы ЗАРЭМБЫ, дацэнта кафедры рускай літаратуры БДУ:**

— Цікава тое, што ў 1985 годзе, калі былі абнародаваныя архівы Гарэцкага, выявілася, што Максім Гарэцкі таксама перакладаў «Слова...», толькі ўжо пасля Купалы. Больш за тое, менавіта па хрэстаматыі Гарэцкага, у якой быў змешчаны яго пераклад, дзеці і вывучалі «Слова...» ажно да 1938 года. Між іншым, у перакладах Гарэцкага і Купалы — розныя падыходы. Купалаўскі — больш паэтычны.

Анатоль КАЗЛОЎ. *Апавяданне*

РУЖОВАЯ ВАРОНА

СНЕЖАНЬ. Кляты снежань. Прастуджаныя драціны-правады на слупах. Амаль замерзлая рэчка з вольнай стромаю, па ёй напорліва і пругка перакатваецца вада. Гнёткі мост і бясконцыя цягнікі. Парк. Правінцыяльны недагледжаны парк. Лодкі прыціснуліся да зябкага пляжнага берага.

Сёння апошні дзень жыцця. Майго жыцця. Мне не шкада бяздоннага неба, не хочацца сагрэць рукі вунь той дзяўчынцы ў чырвонай накідцы-хустачцы. Яна наважваецца адламаць некалькі пруткоў лазы. Навошта?

На сценах летняй танцавальнай пляцоўкі фарбай напісана: «Обшчы тувалет».

А я ўсё іду. Куды? Навошта? Прыкідваюся. Добра ведаю, куды і навошта. У кайстры булькае пляшка гарэлкі. Узяў са стала на памінках. Там я піць не стаў. Не тое што няёмка. Не хацеў бачыць твары, якіх не ведаю. Але якія ведалі яе. Так, я нябожчык. Мо каму і жахліва, а мне — не, не. Яе рукі скрыжаваныя на застылых грудзях. А мае папраўляюць кайстру, якая спаўзае з пляча.

У Карыны былі пяшчотныя і лёгкія рукі. Адчувальныя рукі. Былі...

«Успамінай мяне. Успамінай часта», — так яна прасіла ў тамбуры цягніка. На супынках выходзілі і заходзілі людзі. А Карына дрыготкімі пальцамі трымала цыгарэту. Я стаміўся даставаць з кішэні запалкі.

Снежань без снегу, я — без душы.

Бераг. Вышчарбленыя, няроўныя платы. Падраныя газеты на высахлых былінах бессмяротніку. Бессмяротніку. Не, усё не тое.

А вось і неперакуленая лодка. Зялёная лаўка ў ёй. Мой супынак. Навошта плакаць? Кажуць, тады лягчэй. Мо каму і лягчэй.

Я плачу па табе, Карына. Мне не сорамна. А памятаеш, яшчэ ў студэнцтве, калі прапанаваў табе замужжа, ты ўсміхнулася і сур'ёзна сказала: «Тады мы загубім каханне».

«Чаму?» — дапытваўся я. Ты ж прасіла дадумацца самому. І да сённяшняга дня я не дадумаўся.

Расшпіленая кайстра. Усё, што ў ёй, кладу насупраць, каля сваіх ног. Пяць цукерак, засохлы кавалак хлеба і празрыстую, як вада ў крыніцы, гарэлку ў пляшцы.

Чым багаты. Я клічу цябе, Карына, да майго стала. Чаму б і не прыйсці — нябожчыцы да нябожчыка. Не хвалюйся, нашай гамонкі не парушаць міліцыянты. Яны ў такія месцы не ходзяць. Хоць чаму я ўгаворваю. Ты ж ніколі не баялася чужых асуджальных позіркаў, і на калючае слова ў цябе заўсёды быў адказ...

Ты памятаеш нашу практыку на трэцім курсе? Вёска. Недаспелае жыта. Рэдкі бярэзнік з густой травой-верасам. Купленая ў мясцовай краме марожаная рыба і плаўленыя сыркі. Мы ўцяклі ад усіх і пяклі рыбу з сырам у фользе. Смешна? Так. Але ж мы рваліся з путаў, якія накідвалі на нас маралісты...

Пячэ гарэлка, і не адчуваецца смак цукерак. Ты маўчыш, Карына, як зазвычай маўчаў і я. Ведаеш, сёння некалькі разоў бачыў у натоўпе на вуліцы нямоглых старых з клункамі. І кожны раз здавалася, што сярод іх — мая маці. Толькі чаму клункі? Нейкі нафталінавы стэрэатып, калі вёска — значыць, клункі. Не, зноў не тое. Прабач. Я баюся згубіць танюткую нітку, якая звязвае нас, утрымлівае адно каля аднаго. Я без цябе жывы нябожчык. Ты зразумей гэта, як зразумеў я.

Хлеб дрэнна жуецца, хоць і размочаны гарэлкай. Мне хочацца кавы, прыгатаванае табою, Карына. Я б зараз расклаў тут цяпельца. А цыгарэты сырыя і даўкі дым. І яшчэ — прачытаў нарэшце Картасара, якога ты мне раіла. Ёсць чым захапляцца, цяпер разумею цябе. Не хмялею, а так гэтага хочацца.

— Прысесці можна? Вельмі рамантычна глядзіцца збоку.

— Пытай дазволу ў Карыны.

— Якой Карыны?

— Не бачыш — насупраць сядзіць?

Глядзі, Карына, як яна няўцямна лыпае вачыма. І адкуль толькі з'явілася? Ну як? Дазволім ёй? Усё ж госця, хоць нечаканая і няпрошаная. Відаць, няшчасная, калі не пасаромелася і прыйшла да нас, нябожчыкаў. Мо сказаць ёй, што мы набожчыкі, і няхай ідзе сваім шляхам. А?

— Не бачу? Дык можна сесці?

— Сядай. Толькі ведай, што мы з Карынай нябожчыкі.

— Добры нябожчык, калі гарэлку з рыльца п'еш.

Нічога яна не разумее. Ды і навошта ёй гэта? Вось яна ладкуецца побач з табою, Карына. Ставіць сваю поліэтыленавую торбу на наш стол. Нечаму ўсміхаецца. Яе прыпухлыя вусны пафарбаваныя такой самай памадай, якой карысталася ты. А радзімка ля носа падобна да канаплянага зернейка.

— Чаго маўчыш і не частуеш, кавалер? Ці табе аднаму весялей?

— Ужо ж папярэджваў, што я не адзін. А, урэшце, што бачыш — тым і частуйся. Праўда, Карына?

Госця маленькімі глыткамі каўтае гарэлку. У яе прыгожа атрымліваецца.

Вось яна ставіць пляшку, дастае са сваёй торбы нейкі напой без этыкеткі, здзірае корак, запівае. Не кранае цукерак.

Я выціраю памаду на рыльцы бутэлькі і таксама п'ю. Гэта недарэчна, але я імкнуся піць такімі самымі глыткамі, як і гэтая дзяўчына.

— Ты не бачыў, як ляцела тут чорная варона з ружовымі крыламі? У лапах яна несла блакітную стужку. Ляцела якраз у твой бок, мо да цябе.

Карына, гэтая дзяўчына смяецца з мяне. Думае, што я шыз ці вельмі п'яны. Што адказаць ёй?

— Не, не бачыў.

— І я не бачыла. А гаварылі, што ляцела такая. Ну што, дап'ём, каб не выпаралася на марозе. Ты не хвалюйся, у мяне ёсць яшчэ. Чаго маўчыш, нябожчык?

Мы п'ём. П'ём доўга і моўчкі.

— У цябе прыгожыя вочы, нябожчык.

Гэта яна мне, Карына. Пра мае вочы.

— Не ад цябе першай чую.

— А чаму табе не пахваліць мае валасы, постаць?

— Дрэнна іх бачу. Калі хочаш ухвалення, здымі паліто і шапку.

Яна здымае і хвіліну стаіць.

— У Карыны лепш.

— Мо яно і так, не бачыла. Але ж і ў мяне...

Яна зашпільвае гузікі.

— Ты куды зараз ідзеш, нябожчык? Цямнее...

— Дурнаватае пытанне. Куды ж ісці нябожчыкам? Ідзём з Карынай на спачын. Ці як вы, жывыя, кажаце, — на той свет.

— А мо лепш пойдзем да мяне? Тут недалёка. Пасядзім, пагамонім. Ты цікавае стварэнне.

— А як Карына?

— Карына пачакае тут. Ты забярэш яе пазней. Думаю, яна не пакрыўдзіцца. Спытай.

Падымаю вочы да нашага спусцелага стала...

Але Карыны ўжо няма. Няма. Пустое месца.

Шарэе. Узмацняецца вецер.

— Глядзі, вунь паляцела варона з ружовымі крыламі. Вунь яна, пасярэдзіне рэчкі, над незамёрзлай вадой. Бачыш?

— Бачу. То Карына.

— Хай будзе так. Пайшлі.

Летась 86 непаўналетніх мінчанак сталі маці

Сярэдні ўзрост гараджанак павялічыўся з 37,5 года ў 2000 годзе да 39,8 года ў 2010-м.

Сярэдні ўзрост жанчын, якія ўпершыню пераступілі парог загса, складаў 25,4 года, а тых, якія ўступілі ў паўторны шлюб, — 37,6 года. У 2010-м маці сталі 20956 мінчанак, з іх 247 нарадзілі двойні, 7 — тройні. За 2010 год нарадзіліся 21154 дзіцяці, што на 37,7% больш у параўнанні з 2000-м, але на 0,2% менш, чым у 2009-м. За студзень—жнівень 2011 года, у сталіцы нарадзіліся 13739 дзяцей, у тым ліку 164 двойні і 6 тройняў. Першынцаў у 2010 годзе нарадзілі 11862 мінчанкі, або 56,1% ад ліку ўсіх нарадзіх. Сярэдні ўзрост жанчыны пры нараджэнні першага дзіцяці склаў 26 гадоў, пры нараджэнні наступных дзяцей — 31 год. Не дасягнуўшы паўналецця, сталі мамамі сем 15-гадовых, 24 — 16-гадовых і 55 — 17-гадовых жанчын. У мінчанак ва ўзросце 40—44 гады нарадзіліся 287 дзяцей, ва ўзросце 45—49 — 15. 36-гадовая мінчанка стала маці ў дзясяты раз, 33-гадовая — у дзявяты, чатыры жанчыны 32—35 гадоў і адна 45-гадовая — у восьмы раз.

«Мінск—Навіны».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Казалі: марна шкадаваць,
Багацце восені да часу,
Падманнай залатой украсы
Ніхто не здолеў захаваць.
Не верылі. А ён адзін
Пайшоў пад лісцявыя шаты,
І восень золата дукатаў
Яму аддала на ўспамін.
Ён стаў адзіным на зямлі,
Хто завалодаў тым багаццем,
Ды ў гэта казачнае шчасце
Паверыць людзі не змаглі.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Нефарматная навука

Чырвонае віно амалоджвае грудзі

На працягу апошніх гадоў навукоўцы неаднаразова казалі аб карысці чырвонага віна. Біялагічна актыўныя рэчывы, якія ў ім змяшчаюцца, паляпшаюць працу сэрца і крывяносных сасудаў, прадухіляюць развіццё атэрасклерозу і нават абараняюць чалавека ад раку. І, аказваецца, гэты спіс можна працягваць вельмі доўга...

Як паведамляюць лацінаамерыканскія сродкі масавай інфармацыі, аргенцінскія касметолагі знайшлі прымяненне чырвонаму віну нават у «гонцы за прыгажосцю». Гаворка ідзе пра «вінатэрапію» — вонкавае прымяненне гэтага алкагольнага напою ў выглядзе розных крэмаў і мазяў. Як піша www.zdorovih.net, гэтыя прэпараты наносяцца на скуру пацыента і, па словах касметолагаў, амалоджваюць яе, «падцягваюць» грудзі, дапамагаючы ім захаваць прыгожую форму.

— Пасля працэдуры ачышчэння на скуру наносіцца спецыяльная вінная маска, — распавёў у інтэрв'ю карэспандэнту Ananova «вінатэрапеўт» з Буэнас-Айрэса Дыега Барберан. — Яна падцягвае і сілкуе скуру, робіць яе больш маладой і эластычнай. А падобная «маска», накладзеная на грудзі, падцягвае іх, надае больш прыгожую форму.

Жанчынам нельга хутка есці

Спецыялісты з Новай Зеландыі запэўніваюць, што жанчыны могуць набраць лішнюю вагу толькі з-за таго, што няправільна прымаюць ежу. У прыватнасці — занадта хутка ядуць.

Па інфармацыі diet.passion.ru, двухгадовы эксперымент з удзелам 1500 прадстаўніц прыгожага полу паказаў, што жанчыны, якія хутка ядуць, маюць больш шанцаў набраць лішнюю вагу, чым тыя, хто старанна пражоўвае ежу. Прычым гэтая заканамернасць справядлівая ў асноўным для жанчын 40-50 гадоў.

Сувязь паміж хуткасцю прыёму ежы і індэксам масы цела была ўстаноўлена навукоўцамі з Універсітэта Атага. Кіраўнік даследавання Кэралайн Харват растлумачыла, што атрыманыя звесткі дапамогуць распрацаваць больш эфектыўныя метады лячэння атлусцення, піша Xinhua.

Наступны этап эксперыменту — клінічныя выпрабаванні. Калі яны пройдуць паспяхова, то спецыялісты прыступяць да распрацоўкі новага метаду пахудзення.

Працяглы стрэс прыводзіць да ўсушкі мозгу...

... што нясе з сабой прыдуркаватасць. Да гэтага прыйшлі амерыканскія навукоўцы. Яны сцвярджаюць, што хімічныя злучэнні, якія ўтвараюцца ў арганізме ў момант стрэсу, — таксічныя для тканак мозгу.

Кортыкастэроіды, якія выпрацоўваюцца ў мозгу ў выніку дзеяння пастаяннага стрэсавага раздражняльніка, забіваюць нейроны. Хоць у моманты кароткачасовага нервовага напружання яны і дапамагаюць. Найбольш моцна ад працяглага ўздзеяння кортыкастэроідаў пакутуе гіпакамп, які адказвае за фарміраванне і арганізацыю ўспамінаў, а таксама за арыентацыю ў прасторы. Адсюль і развіццё дэменцыі (прыдуркаватасці).

Даследавалі мазгі кіраўнікоў буйных кампаній: іх гіпакамп у выніку пастаяннага стрэсу паменшыўся да памераў, уласцівых пажылым людзям, якія пакутуюць ад старэчай прыдуркаватасці. Аказалася, піша meddaily.ru, што такое ж уздзеянне аказвае і посттраўматычны стрэс на ўдзельнікаў баявых дзеянняў.

Гародніна, якая псуе зубы

Супрацоўнікі Еўрапейскай стаматалагічнай Асацыяцыі назвалі некалькі відаў гародніны, якія спрыяюць развіццю карыесу і раздражненню дзяснаў, піша www.mobus.com. Прычым негатыўны ўплыў іх ферментаў і кіслот (напрыклад, шчаўевай, яблычнай і бурштынавай) на зубную эмаль не залежыць ад таго, у якім выглядзе гэтую гародніну спажываць — у смажаным, печаным або адвараным. У сумны спіс трапілі: баклажаны, папрыка, балгарскі перац, шчаўе, патысоны, спаржа, кабачкі.

Навукоўцы зусім не прымяншаюць карыснасці гэтай гародніны (у ёй ёсць вітамін С, фоліевая кіслата, вітамін А, пекціны, клятчатка, магній, калій і многія іншыя вельмі патрэбныя рэчывы), але раяць, паспытаўшы, да прыкладу, сатэ з баклажанамі або леча з перцам, абавязкова добра прапаласкаць рот, а яшчэ лепш — пачысціць зубы.

Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

На гарызанталі: Бульвар. Авіяк. Лаўр. Пе-сент. Падсненжнік. Горкі. Агнях. Скверн. Сабэа. Амар. Ругада. Гак. Банк. Амлір. Саржа. Рой. Арфа. Іран. Вар. Кеб. Уфа. Кайма. Каманіца. Арка. Ласка. Сад. Пасквіль. Фет. Табло. Муар. Урга. Плошча.

На вертыкалі: Гульня. Авіяк. Лаўр. Пе-рас. Гр. Арап. Арфей. Сафа. Карабок. Міксер. Арт. Плеер. Аорт. Авал. Лег. Ремак. Касоба. Сняра. Уша. Рад. Падкоп. Асіна. Нар. Кракі. Арка. Ласка. Сад. Пасквіль. Фет. Табло. Муар. Жнец. Юта. Балдура. Пра-

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 5354. Нумар падпісаны ў 19.30 8 лістапада 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.24	17.22	8.58
Віцебск —	8.19	17.06	8.47
Магілёў —	8.14	17.12	8.58
Гомель —	8.06	17.14	9.08
Гродна —	8.39	17.38	8.59
Брэст —	8.34	17.44	9.10

Месяц

Поўня 10 лістапада.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Аляксандры, Елізаветы, Капіталіны, Андрэя, Марка, Несцера.*

К. *Аляксандра, Анатоля, Людвіка, Тодара, Урсына.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА +2..+4°С	КІЕЎ 0..+2°С	РЫГА +2..+4°С
ВІЛЬНЮС 0..+2°С	МАСКВА -1..+1°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +3..+5°С

Дзве даты

9 лістапада

Міжнародны дзень барацьбы з фашызмам і антысемітызмам.

1512 год — у Падуанскім універсітэце былі скліканыя і ўрачыста забраліся вядомыя дактары святой Калегіі майстроў мастацтваў і медыцыны, каб праэкзаменаваць доктара мастацтваў Францыска, сына Лукі Скарыны з Полацка. Пад старшынствам знакамітага доктара мастацтваў і медыцыны Тадэя Мусаці і пры ўдзеле доктара мастацтваў і медыцыны Францыска Фульманэлі з Вероны, а таксама перад усімі прысутнымі дактарамі калегіі, ён быў праэкзаменаваны ў адмысловым і строгім парадку і праявіў сябе настолькі слаўна і годна, адказваючы на пытанні і прыводзячы доказы, што атрымаў аднадушную ўхвалу ўсіх прысутных вучоных без выключэння, імі было прызнана, што ён валодае дастатковымі ведамі ў галіне медыцыны. Пасля гэтага Францыск Скарына быў абвешчаны дактарам медыцынскіх навук і атрымаў знакі медыцынскага прызнання. Дакумент аб гэтай падзеі (на лацінскай мове) захоўваецца ў архіве Падуанскага ўніверсітэта ў Італіі.

1906 год — пачалася аграрная рэформа Пятра Аркадзьевіча Сталыпіна. Яе стрыжнявой ідэяй было разбурэнне сялянскай абшчыны шляхам дазволу свабоднага выхаду з яе любога домаўладальніка. Селянін, які выходзіў з абшчыны, атрымліваў у прыватную ўласнасць усе замацаваныя за ім надзелы, прычым яны павінны быць зведзены ў адзін участак. Указ заахвочваў утварэнне «атрубнай» і хутарской сялянскай гаспадаркі, не закранаючы пры гэтым памешчыцкія землі. Сталыпін лічыў, што сумеснае жыццё сялян у вёсках палягчае працу рэвалюцыянерам. А вось сялян, расселеных па хутарах, занятых сваёй гаспадаркай, будзе вельмі цяжка ўздымаць на бунт. Сацыяльны ж сэнс аграрнай рэформы заключаўся ў тым, каб стварыць шырокі пласт дробных буржуазных землеўласнікаў, якія з'яўляюцца асноўным фактарам палітычнай стабільнасці грамадства.

Цытата дня:

«Ісціна ісціне не можа супярэчыць».

Джардана Бруна (1548—1600), італьянскі філосаф.

КОНЬ

Конь — адзін з найбольш шаноўных персанажаў беларускай міфалогіі, вусна-паэтычнай спадчыны і абрадавай практыкі нашага народа. Гісторыкі культуры і развіцця цывілізацыі сцвярджаюць, што конь быў цесна знітаваны з трыма грамадскімі супольнасцямі: воінамі, земляробамі і святарамі. Аднак кожная з гэтых супольнасцяў аддавала перавагу пэўнай масці коней. Кауры конь неразрыўна звязаны з вобразам абаронцы, воіна, земляроб аддаваў перавагу бураму каню, а сівы конь быў знакам саслоўя валхвоў, а пазней — святароў.

● Міфалагічны і казачны **конь** — гэта сімвал часу, вечнасці, непадзельнасці космасу, гэта найбольш надзейны пасрэднік паміж светам жывых і «светам» памерлых, паміж небажыхарамі і людзьмі. Менавіта таму якраз на сівым (белым) кані прыязджае на зямлю Юрый і адмыкае «зямліцу», выпускае на свет Божы «расіцу гаючую». Таму ўладальнікі коней асабліва шанавалі гэтага святога.

● Сувязь **каня** са светам памерлых стала падставай для ўзнікнення вераванняў аб тым, што конь надзелены інтуіцыяй і можа прадказваць лёс свайго ўладара. Напрыклад, калі гаспадар збіраўся ў дарогу, а ўжо запрэжаны конь пачаў фыркаць або біць зямлю капытамі, то гэта ўспрымалася як нядобры знак. У такім выпадку паездку маглі перанесці на іншы час.

● Па паводзінах **каня** маглі прадказваць стан надвор'я:
— конь часта фыркае — прадказанне хуткага дажджу;
— конь храпе або закідвае галаву ўверх — будзе непагадзь.

● Асаблівай павагай карыстаўся **конь** у абрадавай практыцы беларусаў, перш за ўсё на вяселлі і пахаванні. Вясельнага каня ўпрыгожвалі рознакаляровымі стужкамі, кветкамі, да дугі мацавалі званочкі, а на шыю надзявалі шархуны, якія павінны былі адганяць нячыстую сілу і даваць знак аднавяскоўцам аб прыбліжэнні вясельнага поезда.

● Існавала дакладнае размежаванне ў выкарыстанні **коней** у розных абрадах. Так, каня, на якім везлі нябожчыка, ніколі не будуць выкарыстоўваць у вясельным поездзе.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся

Аб'ява: «Засцерагаю ад непажаданых вяртанняў мужоў з камандзіровак — нечаканае знаёмства каля вашага пад'езда, піва, гарэлка, выцвярэзнік, 5 сутак форы».

☺

— Апішыце сябе ў трох словах.

— Гультаяваты.

☺

Дарожны інспектар пасівеў і намачыў штаны, калі Стывен Кінг пачаў тлумачыць яму, чаму перавысіў хуткасць.